Міхась Чарняўскі

Вогнепаклоннікі

Кніга для вучняў

Мінск
Народная асвета
1989

ББК 63.3(2Б)2 4-21

Рэцэнзенты:
д-р гіст. навук Г. В. Штыхаў канд. гіст. навук А. Р. Мітрафанаў

Предлагаемая книга археолога, кандидата исторических наук М. М. Чернявского является продолжением книги «Стрела Росомахи», которая вышла в 1985 г. В художественно-научных очерках о жизни людей бронзового века занимательно рассказывается о первых металлических орудиях труда, о развитии земледелия и животноводства, зарождении культуры. Адресуется ученикам среднего школьного возраста.

Чарняўскі М. М.

Вогнепаклоннікі: Кн. для вучняў.— Мн.: Нар. асвета, 1989.— 80 с.: іл.
ISBN 5-341-00147-8.

Прапануемая кніга археолага, кандыдата гістарычных навук М. М. Чарняўскага з'яўляецца працягам кнігі «Страла Расамахі», якая выйшла ў 1985 г. У мастацка-навуковых нарысах аб жыцці людзей бронзавага веку займальна расказваецца аб першых металічных прыладах працы, аб развіцці земляробства і жывёлагадоўлі, зараджэнні культуры. Адрасуецца вучням еярэдняга школьнага ўзросту.

ISBN 5-341-00147-8

ЗМЕСТ

ЯК ГЭТА ПАЧЫНАЛАСЯ

З глухой і бяздоннай цемры выплылі гукі — галасы, бразганне металу, быццам побач мылі жалезны посуд. А калі яны рабіліся больш выразнымі, я пачаў разумець, што мая аглушаная наркозам свядомасць праясняецца.

— Ну, досыць спаць, прачынайцеся,— пачуўся нечы прыемны голас. І мяккая жаночая рука лёгенька паляпала мяне па шчоках. Можа ляпалі і мацней, але я адчуваў яшчэ слаба, бо чужым і нерухомым заставалася мае цела. А чуў жа я ўжо і разумеў усе.

— Не ўключаецца,— прамовіў той жа голас.— Хлопчыкі, на каталку яго і ў палату. Трэба вызваляць аперацыйны стол.

«Хлопчыкі» падхапілі мяне і пераклалі на штосьці няўстойлівае. «На каталку»,— здагадаўся я і паплыў некуды, пагойдваючыся, як на хвалях. Вяртаўся ў забыццё...

— Колькі ж вы будзеце спаць? — зноў пачуў я знаёмы голас, але ў ім ужо гучалі нецярплівыя ноткі.— Гадзіну буджу і ніякага толку. А мяне ж іншыя аперацыі чакаюць... Ну, раскратвайцеся! — ушчувала мяне нябачная жанчына.

Я напружваўся, колькі мог, каб падначаліць волі сваё бязладнае цела, якое ляжала недзе ніжэй маёй галавы, быццам адпілаванае. Адчайна намагаўся крануць пальцамі ног. Верылася, што калі варухну хоць адным, ажывуць ступні і ўсе ногі. Бо яны, натрэніраваныя за два дзесяткі гадоў у археалагічных экспедыцыях, былі моцныя, як машыны, і ніколі яшчэ не падводзілі; былі заўсёды гатовыя да руху.

— А божачкі, ён ужо пачаў халадзець! Каб жа толькі не памёр, а то будзе такі жах — не выйшаў з наркозу.

Мне і сапраўды рабілася ўсё халадней, быццам мароз скоўваў рукі і ногі. У дадатак пачаў апаноўваць страх — а калі сапраўды не прачнуся? Пачакаюць, памацаюць і скажуць — «адышоў» і павязуць у морг на халодны мармуровы стол...

Каля дзвярэй нехта зашлэпаў па падлозе — мусіць, палатачная нянечка.

— І як наш хворы?

— А, ніяк. Ужо заледзянеў увесь.

— А мы яго зараз пагрэем, калі заледзянеў,— лагодна прамовіла нянечка і выйшла ў калідор. Праз нядоўгі час я зноў пачуў яе крокі, а потым адчуў невыказна прыемнае цяпло на падэшвах ног. Яна прынесла грэлку!

Цяпло павольнымі і яшчэ кволымі штуршкамі, разам з аслабелай пульсацыяй крыві, пачало паступова напаўняць мае ногі, як апусцелую было пасудзіну. Затым пайшло вышэй.

І тады я зноў паспрабаваў паварушыць пальцамі ног. Удалося! Напружыўся і крануў ступнямі і затым пачаў перабіраць імі, не спыняючыся, быццам пайшоў прынёманскай сцежкай... І нарэшце, адплюшчыў вочы...

Папраўляўся я хутка. Назаўтра ж змог сесці на ложку, а праз дзень, хоць і хістаючыся, выйшаў на калідор. Адзінае, што турбавала,— дрэнны сон. У вогуле я засынаў нармальна і спаў колькі трэба, але мучыла тое, што ў сне бачылася. І нават не столькі мучыла, як трывожыла сваёй нязвыкласцю. Сніў я сябе на кавыльных раўнінах, дзе з гіканнем праносіліся, уздымаючы дзіды, вершнікі на неасядланых конях. Кідаліся на мяне ў лясных гушчарах вастрарогія туры, і я то заколваў іх рагацінай, то ратаваўся ўцёкамі. Бачыліся плеценыя з галля і крытыя трыснягом хаціны на берагах азёрных заток і чоўны-даўбёнкі на гэтых затоках. Мроіліся дымныя вогнішчы і танцы ведзьмароў навокал іх. Ноччу чуў я трубны рэў аленяў, рыканне зубраў, брэх здзічэлых сабак. Прачынаўся, устрывожаны водбліскамі пажараў, баявымі крыкамі воінаў і галашэннем жанчын. Сны складаліся ў каляровую мазаіку, сярод якой узнікалі цэлыя сюжэтныя карціны, а часам гэта былі абрыўкі нейкіх відовішчаў, цьмяныя ўспаміны, быццам зменлівае далёкае рэха.

Успамінаючы прымроенае ноччу, аналізуючы ўбачанае — каменныя шліфаваныя сякеры і бронзавыя кінжалы ў руках светлавалосых людзей, жней з крамянёвымі сярпамі на засеяных ячменем выгарынах, пласкадонныя гаршкі з трохкутнікамі і крыжамі пад брыжам — я пачаў здагадвацца, што ў сне трапляю ў часы бронзавага веку. Няўжо таму, што сам археолаг і якраз даследую гэтую эпоху? Нагледзеўся ўсяго каля раскапаных старажытных жытлаў і магіл і вось зараз яно лезе ў галаву... Але ж бачылася ў снах і многае, пра што я не меў ніякага разумення. Да таго ж, быццам ва ўсіх высненых здарэннях прысутнічаў сам я!

Неўзабаве прыйшоў у адведкі мой даўні і харошы знаёмы Іван Пятровіч, які ў адным з навукова-даследчых інстытутаў займаўся малазразумелымі для мяне пытаннямі псіхалогіі. Я расказаў яму пра свой стан.

— Якая ўдача! — радасна ўзмахнуў рукамі Іван Пятровіч.— Надзвычай рэдкі выпадак!

— Чаго ты радуешся? — пакрыўдзіўся я.— Мяне гэтыя трызненні непакояць. Можа што ў галаве звіхнулася?

— Яшчэ як звіхнулася! — зручней уладкоўваючыся на крэсле каля майго ложка, яшчэ больш ажывіўся знаёмы.— Хоць гэта пытанне яшчэ мала распрацаванае — недастаткова эксперыментальнага матэрыялу, але сутнасць яго заключаецца ў тым, што пры надзвычай моцных уздзеяннях на невядомыя яшчэ нам цэнтры мозга — стрэсавая сітуацыя, вельмі глыбокі гіпнатычны стан, а ў тваім выпадку, бачна, хімічнае рэчыва, ужытае для наркозу,— у чалавека ажывае генетычная памяць. Усё, што мы чуем, перажываем, бачым, як на магнітафоннай стужцы запісваецца ў нашай памяці. А што такое запамінанне? Гэта фізіка-хімічныя працэсы на ўзроўні малекул і атамаў. І відаць, частка атрыманай інфармацыі трапляе ў малекулы спадчыннасці ці ў якія там іншыя элементы і фіксуецца. У нармальных умовах генетычная памяць знешне нічым сябе не праяўляе. Яе прызначэнне — не быць для нас кінатэатрам старых фільмаў, а захоўваць і развіваць спадчыннасць. Бо гэта толькі на першы погляд спадчыннасць нязменная, яна, хоць і вельмі павольна, мадэфікуецца, ускладняецца. Інакш мы з табою не сядзелі б зараз побач і не размаўлялі б аб высокіх матэрыях, а плавалі б у акіяне ў выглядзе прымітыўных аднаклетачных.

— А чаму сніцца толькі бронзавы век — прамежак часу паміж пачаткам другога і сярэдзінай першага тысячагоддзя да нашай эры?

— А таму, што актывізаваўся менавіта толькі гэты пласт генетычнай памяці. І павінен радавацца гэтаму! Хіба лепш было б каб ты ноччу бачыў сябе чалавекападобнай малпай ці якой яшчэ больш старажытнай жывёлінай?

— І як доўга будзе такі стан?

— Ажно пакуль закрыецца «пралом» у свядомасці, праз які і прабіваецца ўсё гэта. Можа закрыцца і сам пры агульным паляпшэнні псіха-фізіялагічнага стану арганізма, можна дапамагчы і адпаведнымі лекамі.

— Калі так, то з лекамі пачакаю,— супакоіўся я.— Хачу яшчэ паназіраць, што навытваралі там мае продкі.

— А ты запісвай,— прапанаваў Іван Пятровіч,— я з задавальненнем пачытаю, бо маю тайную схільнасць да старасветчыны. Можа і яшчэ каму спатрэбіцца такія запісы. Не кажу ўжо, як яны неабходны нашаму брату-псіхолагу.

Усунуўшы мне ў рукі пакет з апельсінамі і пажадаўшы хутчэй здаравець, Іван Пятровіч пайшоў, паабяцаўшы зазіраць часцей. Я ж, не губляючы часу, дастаў з тумбачкі сшытак і ручку... і задумаўся, як шахматыст перад першым ходам у адказнай партыі.

З чаго і як пачаць? Пасля доўгіх разважанняў рашыў запісваць важнейшае, найбольш характэрнае, каб даць чытачу ўяўленне аб асноўных праявах жыцця першабытнага чалавека ў бронзавым веку. Дробныя ж выпадкі, інтымныя падрабязнасці, блытаныя ўрыўкі відовішчаў, фантастычныя трызненні няхай застануцца толькі ў памяці. Навошта імі тлуміць галовы іншым? Рашыў не давяраць паперы і найбольш жорсткія сцэны, у якіх было асабліва шмат агню, крыві, гвалту, смерці. Лагічней было і сам аповяд весці не ад свайго «я», бо «я» быў увесь час у гэтай палаце замораны хваробай, у халаце з кароткімі рукавамі і адным уцалелым гузікам. Тое, што снілася, у сапраўднасці здаралася з маімі далёкімі родзічамі ў нейкім больш як сотым пакаленні назад. Няхай жа яны ажывуць хоць на гэтых старонках...

ЧЫРВОНЫЯ КАМЯНІ

Бацька з сынам прыйшлі на гэты камяністы схіл гары, адолеўшы за паўдня цяжкі і далёкі шлях. Праз густы букавы лес абыходзілі вузкую, але доўгую азёрную затоку — гэта яшчэ каля самага іхняга паселішча. Прабіраліся глыбокім рэчышчам горнай рэчкі, што прапілавала ў каменных нетрах вузкую прорву-шчыліну. Затым лезлі ўверх звярынаю сцежкай, чапляючыся за выступы скал. І нарэшце, трапілі сюды, дзе скалы расступаліся, дзе было цёпла і светла ад блізкага шырокага неба над галавою і сонца.

— Які незвычайны лес! — здзівіўся хлопец, паказваючы на чэзлыя і пакручастыя дрэўцы, быццам прыгнечаныя нейкай немаччу.

— Але,— узрадаваўся бацька сынавай назіральнасці.— Глядзі і запамінай: дзе ў зямлі ляжаць чырвоныя камяні, там і лес такі недарослы. Бачыш, і трава тут асаблівая, не такая як у іншых мясцінах. Пад такой травою таксама можна шукаць гэты камень. А бывае — позняй восенню ўсё навокал заінела, а дзе-небудзь засталіся плямы на скалах без шэрані. Значыць, там таксама ён. Чырвоны камень мае такую чароўную моц, што мяняе і траву, і лес, і мароз яго не бярэ.

— Вырасцеш,—працягваў бацька,— сам будзеш хадзіць у горы, шукаць чырвоны камень і рабіць з яго бранзалеты, пярсцёнкі, шылы, нажы і яшчэ шмат якія патрэбныя чалавеку рэчы. І тады станеш самым паважаным у нашым родзе чалавекам. І на сходзе мудрэйшых табе заўсёды будзе пачэснае месца каля свяшчэннага агнішча, і кавалак мяса не звядзецца ў тваім гаршку.

Канешне, было спакусліва некалі сесці на шырокую лаву з расшчапанага букавага камля побач з самымі слаўнымі людзьмі, але калі тое будзе? Трэба, каб у яго спачатку вырасла вялікая барада і каб яна пасівела. А найбольш трэба было нечым заслужыцца перад суродзічамі. Яму ж зараз не церпілася заглыбіцца ў гэты дзівосны лес, урыцца ў россып камянёў і знайсці чырвоны камень, які, калі яго пацерці пяском, гарыць, як сонца, і слепіць вочы. І рэчы з такога каменя самыя прыгажэйшыя на свеце.

Бацька ішоў паперадзе і доўгай рукаяткай каменнай сякеры варушыў леташняе лісце, раскідаў у бакі мох, расчышчаючы горную пароду.

— Вось рудавата-зялёны камень. Знайшоўшы такі, будзь асабліва ўважлівы,— супыніўся бацька.

Ён лоўка ўхапіў камень у левую руку і стукнуў па ім абушком сякеры. Скарынка вокіслаў абсыпалася, і ў кавалку руды заззялі

чырванаватыя іскрынкі медзі. Але яе было зусім мала, і бацька адкінуў знаходку ўбок.

У адным месцы сярод граніту выступаў цэлы пласт такой пароды, і тут горназдабытчыкі прыпыніліся даўжэй. Бацька сякерай, а сын звычайным каменем збівалі вокіслы з меднай руды і, нарэшце, проста пад нагамі знайшлі ладны кавалак каштоўнай самароднай медзі.

Бацька замілавана ўзважыў знаходку ў руцэ, абмацаў яе, агледзеў, а затым асцярожна, быццам магла разбіцца, паклаў у скураную торбу. Потым трапіўся яшчэ з дзесятак такіх большых і меншых камянёў, якія ляжалі ў восыпу пад руданосным пластом.

Побач з бацькам завіхаўся і сын. Ен таксама шукаў і запіхваў у торбу самародкі і ўяўляў, як заўтра ці паслязаўтра бацька сядзе пад разложыстым каштанам каля іхняй хаціны, пакладзе на калоду гранітную пліту-кавадла і каменным малатком пачне выкоўваць з медзі вострыя шылы, шыракалёзыя нажы, тонкія пласцінкі, з якіх потым зробіць бранзалеты або трубачкі для караляў. А ён будзе дапамагаць бацьку — шурпатым бруском загладжваць паверхні каваных вырабаў, вастрыць, паліраваць пяском да зіхаткога бляску.

А вечарам прыбяжыць з поля яго старэйшая сястра, пакладзе серп на паліцу і пачне прымяраць бранзалеты і каралі.

— Ну як? — запытаецца яна ў брата.

— Прыго-ожа! — у захапленні адкажа ён, любуючыся сонечнымі пералівамі на аздобах.

— Што задумаўся? — весела гукнуў бацька.— На разе хопіць, а то і не занясём. Давай збірацца вячэраць.

Бацька пайшоў да зарасніку барбарысу, разгарнуў калючае голле і за ім адкрылася ўтульная пляцоўка перад адвесным выступам скалы. Пад ім цямнела невялікая сухая пячора. Побач шарэла старым попелам агнішча. Бацька быў тут не першы раз, таму гэту мясціну ўжо добра ведаў.

Медзешукальнікі дасталі з торбы прыпасы — ладны пшанічны праснак, кавалак казінага сыру, некалькі сушаных рыбін. Хлопец высыпаў побач прыгаршчы назбіраных арэхаў.

— У канцы гэтага лесу крынічка,— сказаў бацька і працягнуў сыну гліняны кубак, які вынес з глыбіні пячоры. Хлопец, пераскокваючы з каменя на камень, пабег па ваду. І сапраўды, там, дзе за хвойнікам пачынаўся зараснік кустоўя, з расшчыліны цурчэла вада. Пакуль струменьчык напаўняў кубак, хлопец агледзеўся і прыкмеціў на лапіне вільготнага жвіру каля крынічкі свежыя адбіткі капытоў. Пакінуўшы кубак з вадою на плоскім камені, ён асцярожна праціснуўся праз зараснік.

За кустоўем на горным схіле паміж россыпу камянёў пасвіўся казліны статак — старыя казлы з цяжкімі закручастымі рагамі, казліхі з казлянятамі, маладняк.

— Там горныя козы,— узбуджана зашаптаў хлопец бацьку, калі, спяшаючыся, прынёс ваду.— За крыніцай.

— А што? — падхапіўся мужчына.— Калі пашанцуе, паспрабуем свежаніны,— і, адклаўшы ўбок галоўкі дзікай цыбулі, узяўся за лук.

Бацька з сынам падышлі да крынічкі. Прыпыніліся. Затым бацька наслініў палец і ўзняў яго ўгору, вызначаючы напрамак амаль неадчувальнага тут ветру.

— Добра,— ледзь чутна прашаптаў ён,— на нас цягне, не ўнюхаюць.

Козы былі на тым жа касагоры. Мужчына прыцэліўся і выпусціў стралу. Бліжэйшы козлік страпянуўся і пакаціўся па схіле, а ўвесь статак, збіваючы капытамі камяні, з тупатам сыпануў наўцёкі. Паляўнічыя пабеглі па здабычу, пераганяючы адзін другога. І калі ўжо схапілі козліка за рогі і бацька ўскінуў яго сабе на плечы, пачулі, што на вяршыні, куды зніклі козы, загрукатала.

— Сцеражыся! — крыкнуў бацька, схапіў сына за руку і кінуўся пад бліжэйшую скалу.

Грукат вокамгненна бліжэў, мацнеў, перарастаў у аглушальны гром. Са свістам праляцелі першыя камяні, а затым у скалу ўрэзалася лавіна каменяпаду. Скала ўздрыгнула, але ўстояла. Лавіна ж, расшчапаўшыся надвое, панеслася ўніз і там абрынулася ў прорву, у каменнае нутро, якое адазвалася стогалосым рэхам.

Затым усё сціхла. Толькі над схілам яшчэ курэла воблака пылу ды рэзка пахла бітымі камянямі, як пахне, калі выбіваеш іскры з крэменю.

Аглушаныя і перапалоханыя, з пашарэлымі тварамі, бацька з сынам асцярожна вызірнулі з-за скалы. Касагору было не пазнаць. Каменная пустка ляжала перад імі, на якой там-сям курчыліся лапікі збітай ушчэнт травы, галелі бязлістыя, патрушчаныя дубцы кустоў. Ад рэдкіх тут дрэў засталіся толькі пашчапаныя пні. Усё знёс, збіў, зруйнаваў каменяпад. Нават частку ўпаляванага козліка, якога не паспелі добра прыхаваць пад скалою, быццам нажом, зрэзала нейкім пралятаючым каменем.

— Духі гор угневаліся на нас, што мы кранулі іхнія багацці,— ледзь варушачы вуснамі, прамовіў бацька.

Затым людзі асцярожна пайшлі з гэтай небяспечнай мясціны, баючыся зачапіць які камень, разбудзіць зноў напружаную каменную цішыню. І толькі перад надзейным сховам пячоры яны крыху асмя-

лелі, пажвавелі. Расклалі вогнішча, і бацька на першыя ж языкі полымя кінуў кавалак казліны — духам-ахоўнікам. Другі паклаў зводдаль на камень. Гэты прызначаўся духам гор.

Добра гарэлі сухія дровы. Цёплы дым строма ўздымаўся ў пацямнелае вечаровае неба, на якім яшчэ няпэўна трымцела першая зорка. Глыбокія цясніны запоўнілі лілова-шэрыя цені, а яшчэ ніжэй, у тым баку, дзе было паселішча, затуманілася. Здавалася, што там выйшла з берагоў возера і затапіла падножжы веліканаў-гор. Велічны спакой запанаваў навокал. Толькі сцішана яшчэ падавала голас у лесе нейкая птушка, ды далёка ў скалах праклекатаў арол.

На абструганых палках, пакладзеных на рагулькі, смажылася мяса. Кроплі тлушчу падалі на вугалі, успыхвалі і стралялі дымнымі воблачкамі.

Хлопец, зачараваны таемнасцю вогнішча, глядзеў на кавалкі меднай руды, якімі былі ўмацаваныя рагулькі. Ад агню кавалкі распаліліся, і па іх хвалямі пераліваліся зеленаватыя, бурыя і чырвоныя колеры. Калі асабліва разгараліся дровы, камяні барвовелі, пачыналі зіхацець, астываючы,— цямнелі. Вокіслы даўно абгарэлі, і з руды іскрынкамі паблісквалі драбочкі медзі. І раптам хлопец прыкмеціў, як з аднаго найбольш распаленага кавалка, быццам сляза, выбегла і палілася на ніжэйшы камень вогненна-чырвоная кропля. Потым пацякла яшчэ і яшчэ — амаль малюсенькі ручаёк.

— Што гэта? — тузануў ён за рукаў бацьку.

Той таксама здзівіўся, убачыў шы, як сочыцца з каменя, быццам жывіца з надсечанай хвоі, нейкае рэчыва.

— Па колеру, як медзь,— паволі прамовіў бацька, не адводзячы вачэй ад відовішча. Потым палкай адгарнуў убок дровы і вугалі, каб агонь і дым не замінаалі назіранню. Але кроплі перасталі выбягаць з руды. Лужынка ж пад ёй пачала паступова цямнець і набываць колер звыклай самароднай медзі. Бацька той жа палкай падчапіў і выкінуў з вогнішча металічны блінок. Калі той астыў, асцярожна ўзяў у рукі і пачаў з цікавасцю яго аглядаць. А потым нават пастукаў абушком сякеры. Так, гэта была сапраўдная медзь.

Рашыўшы праверыць сваю здагадку, бацька дастаў з дзённых знаходак кавалачак медзі і ўкінуў у самы жар.

Чакалі доўга. Падкладалі сушэйшыя дровы, падсоўвалі вугалі, ажно пакуль распалены кавалачак не размяк і не пачаў аплываць, ператвараючыся ў звілістую лужынку. Калі разгарнулі вугалі, яна зацвярдзела плоскім стрыжаньком.

— Ды гэта ж, як воск,— уголас разважаў бацька.— Калі халадна — цвёрды, як разагрэеш — быццам вада, а потым зноў застывае,

набываючы новую форму. Але ж заўсёды дагэтуль і я сам, і мой бацька, і дзед, ды і ўсе іншыя майстры ў блізкім і далёкім наваколлі медзь кавалі. А спачатку, кажуць, нават спрабавалі аббіваць, як крэмень. А яна ж, бач, як воск... А калі так яе расплавіць і выліць у які раўчук, то застыне стрыжаньком. Значыць, значыць...— моршчыў ён загарэлы лоб,— калі ў пясчаніку зрабіць роўную баразёнку — атрымаем шыла. Калі ж яе зрабіць шырэй і плашчэй — вось табе лязо нажа або серп. Гэта ж намнога прасцей і хутчэй, чым каваць!

Назаўтра, калі ранішняе сонца прыбіла туман у даліны і падсушыла расу на камяністай сцежцы, бацька з сынам вярталіся дадому. Торба, напоўненая меддзю, важка цягнула плечы ўніз і самай дарагой ношай у ёй былі кавалачкі, што выплавіліся на іхнім вечаровым вогнішчы. Гэта была першая выплаўленая ў гэтых мясцінах медзь, першы метал, здабыты чалавекам з руды!

*

— Ведаеш, мне тут не ўсё зразумела,— сказаў Іван Пятровіч, прачытаўшы праз пару дзён мае першыя запісы.— Адкуль і пры чым горы?

— Я і сам над гэтым думаў,— няўпэўнена пачаў адказваць я.— Нейкая ў мяне перакананасць, што гэта маглі быць Альпы, і хутчэй за усе іх паўночны край, бо сонца апоўдні было над самымі высокімі вяршынямі. Цябе можа дзівіць — як мае продкі туды, ці лепш сказаць — адтуль трапілі? Давай паразважаем. Яны былі мне родзічы па жаночай або мужчынскай генеалагічнай лініі. Але не гэта важна. Важна тое, што яны там былі ў самым пачатку бронзавага веку— на мяжы трэцяга і другога тысячагоддзяў да нашай эры. І гэта зразумела, бо, каб яны адтуль выйшлі раней, напрыклад яшчэ ў папярэднім новакаменным веку — неаліце, гэтай гісторыі з імі б не здарылася і яна, адпаведна, не адклалася б у генетычнай, як ты кажаш, памяці. А вось ужо нашчадкі гэтага хлопчыка-медзешукальніка маглі апынуцца на Беларусі самымі рознымі шляхамі і ў розны час. Бо хоць па нашых пушчах ды балотах і не гойсала скіфская ці гунская конніца, але перамяшчэнні людзей, часам нават і масавыя, назіраліся. Менавіта ў пачатку бронзавага веку ад Рэйна ледзь не да сярэдняй Волгі распаўсюдзіліся плямёны, якія свае гаршкі чамусьці аздаблялі ўзорамі з адбіткаў шнура — плямёны культур шнуравой керамікі, як іх «ахрысцілі» археолагі. Зусім не выключана, што нехта з маіх продкаў мог паходзіць са «шнуравікоў» і жыць нейкі час каля альпійскіх медзяносных радовішчаў. Канешне, той прашчур не трапіў да нас за год ці два. Хутчэй гэта быў яго

нашчадак у якім дзесятым ці нават значна пазнейшым калене, і шлях вандровак яго папярэднікаў мог быць надзвычай пакручастым. Не выключаны нават зусім, здавалася б, неймаверны кірунак— праз Скандынавію.

— Гэта ты ўжо занадта,— не даў веры Іван Пятровіч.

— Чаму занадта? «Шнуравікі» ў час сваёй найвялікшай экспансіі праз марскія пралівы трапілі ажно на гэты паўвостраў. А адтуль праз два з лішкам тысячагоддзі выселілася племя готаў, якое праз басейн Віслы і наша Пабужжа перавандравала ў паўночнае Прычарнамор'е. І ў час гэтага перамяшчэння яно затрымалася на Пабужжы не на адзін год. На ўскраіне Брэста археолагі раскапалі нават цэлы гоцкі могільнік. Мог продак трапіць і нядаўна — каля тысячагоддзя назад на шляху «з варагаў у грэкі».

— Табе варта на гэтай версіі і спыніцца,— пакпіў з мяне сябра,— і сцвярджаць, што ты з роду вікінгаў.

— Не выключана, не выключана,— аджартаваўся я.— Наёмныя дружыны скандынаўскіх воінаў былі на службе ў полацкіх князёў і часам складалі гарнізоны парубежных замкаў. А менавіта такім замкам на тагачаснай беларуска-літоўскай мяжы было некалі маё роднае Мядзіла.

— На лішак сціпласці ты не хварэеш,— засмяяўся Іван Пятровіч.— Але я рады за цябе, што ўжо можаш жартаваць. З'яўленне гумару — адзнака, што хворы папраўляецца.

— А таксама верагодна,— працягваў я, робячы выгляд, што не зважаю на кепікі псіхолага,— што гэта магло адбыцца ў часы распаду Рымскай імперыі, у эпоху вялікага перасялення народаў, калі ў Еўропе забурліла, як у перагрэтым чыгуне. І куды толькі каго не занесла ў тую людскую завіруху: германцаў ажно ў Афрыку, славян — у Малую Азію і на поўнач Беларусь — таксама...

КОПАЧКІ ПАД БРЫЖАМ ГАРШКА

Зязюля трапіла ў гэту вёску яшчэ як была дзеўкай. Паміж яе родным племенем і тутэйшым пачаліся былі тады звады. Недзе сагналі статак быдла, там спалілі пасэлішча, некага ранілі. А Зязюлю захапілі ў палон. Не паслухалася маці і далекавата адышлася ў пушчу — сама пайшлі баравікі; хацела насушыць на зіму пабольш. Быў іх там гурт дзяўчат, але ўсе ўцяклі, калі прыкмецілі чужакоў, а яна звіхнула нагу. І дасталася Зязюля маўкліваму воіну, у якога нядаўна памерла жонка, пакінуўшы хлопчыка-сіротку.

Спачатку бедавала дзяўчына-паланянка, намервалася не раз уцякаць. Але дзе ўцячэш, калі твае родныя за некалькі дзён шляху праз пушчу. А ў лясным гушчары на кожным кроку мядзведзі і рысі. Аднаму нават і дужаму мужчыну вялікая рызыка, а слабой дзяўчыне...

Пагаравала Зязюля, ды і абцiхла. Чалавек, у чыю хату яна трапіла, аказаўся добрым і клапатлівым мужам. Да хлопчыка таксама прывыкла. Навучылася размаўляць па-тутэйшаму, пазнаёмілася з мясцовымі звычкамі. А як знайшліся і свае дзеці, і сябе пачала лічыць тутэйшай.

Учора Зязюля скончыла шыць абуваі са скуры зубрынай лабаціны. Цяпер яны віселі пад дрэвам, напханыя сухой травою. Высахнудь, стануцдь моцныя і цвёрдыя, як з дубу. Паслужаць мужу не адзін год. А сёння, як выпаў вальнейшы час, узялася за сваю любімую справу — пачала ляпіць гаршчок. У гэтым ёй падахвоцілася быць памагатай сяродашняя дачка, светлавалосая і блакітнавокая дзяўчынка гадоў васьмі, з рабацінкамі на твары, як і ў маці.

За хатай, пад кустом арэшніку, дзе было заценена і заўсёды вільготна, Зязюля разгарнула насланую кару. Адкрылася яма з запасам яшчэ летась накапанай гліны, перамарожанай за зіму, гатовай да ўжытку. Яна ўзяла некалькі камоў, паклала ў плыткае карыта, уліла туды вады. Потым з дачкой пачалі драўлянымі таўкачамі таўчы камы, каб атрымалася добра вымешаная вязкая маса.

Час ад часу Зязюля падсыпала ў карыта жарству, якой загадзя нацерла з перапаленага каменю. Гліна без такой дамешкі пры апале трэскаецца, і гаршкі развальваюцца.

Нарэшце гліянае цеста прыгатавана. Для спробы Зязюля раскатала тонкую кілбаску і спляскала яе. Атрымалася стужка. Памацаўшы яе, паціскаўшы ў пальцах, жанчына задаволена кіўнула галавою.

— Падыдзе,— сказала яна дачцэ.— Памыем зараз у рэчцы рукі і пачнём.

Затым Зязюля паклала каля сябе кавалак дошкі, выгладжанай і выскабленай нажом і скрабком. Дошку пасыпала дробным пяском, каб выраб не прыставаў да дрэва, і паклала на яе першы камяк гліны. Пачала яго пляскаць далонямі ў роўны круглы блінок. Краі блінка загнула ўверх, выраўняла. Атрымаўся быццам сподак — дно будучай пасудзіны.

Дачка сядзела побач і на вялікім лісце маці-мачыхі ляпіла свой гаршчочак, памерам мала большы за ўласны кулачок.

Пасля дна пачыналася самае складанае. Трэба было сфармаваць выпуклае брушка, шыйку, шырокі брыж. Потым падправіць паверхню вырабу, каб яна стала роўнай і гладкай. А затым ужо аздобіць гаршчок.

Перш чым распачаць работу далей, Зязюля задумалася, успомніўшы каторы раз, як гаршкі ляпілі ў яе роднай вёсцы. Там пласкадоннага посуду і не ведалі. Рабілі з дном вострым. А ў некаторых мясцінах — з закругленым. А таму, што ежу гатавалі на вогнішчах, уторкваючы пасудзіны паміж вугалямі і галавешкамі. Як ні падгаралі дровы, а такія гаршкі не куляліся. А тут агнішчы лепяць з гліны. І чэрані таксама гліняныя, роўныя і моцна апаленыя. На такі можна паставіць толькі гаршчок з плоскім дном. Дома яшчэ ляпілі аб'ёмістыя пасудзіны — для жалудоў, арэхаў, ягад, сушаных грыбоў. Тут такіх не робяць. Запасы трымаюць у плеценых з саломы кубельчыках.

Разуспаміналася Зязюля, разжалілася і нават слязой абвільгатнелі яе вочы — што зараз з мамаю, якая вучыла яе таямніцам глінянага рамяства? Але хутка схамянулася: край сонца ўжо кранаецца арэшнікавай вяршаліны і хутка рыхтаваць абед для мужчын, якія павінны вяртацца з возера. Жанчына пачала скочваць гліняную кілбаску і пляскаць яе ў стужку, тонкую і шырокую. Зараз маці дапамагала, і дачка падтрымоўвала стужку, а Зязюля накладвала яе на дно, змацоўваючы краі кожнага наступнага вітка.

На вачах вышэлі сценкі гаршка, выпуклялася ягонае рудое брушка. Але Зязюля асабліва не спяшалася, бо трэба было, каб ніжнія віткі паспявалі падсохнуць і памацнець. Інакш пасудзіна распаўзецца, абсядзе пад цяжарам сырой гліны.

Пасля абеду, калі гаршчок быў амаль гатовы, у апошнюю гліняную кілбаску Зязюля закатала тоўстую нітку з авечай воўны.

— Каб мацней было,— растлумачыла.

Кілбаску прыляпіла да верху і пальцамі размяла так, каб атрымаўся ахайны, са скошаным краем, брыж.

Зараз жанчына ўзяла ў рукі авальную, зазубраную з аднаго канца, касцяную пласцінку. Абмочваючы яе ў пасудзіне з вадой, пачала раўняць, заскрабаць стыкі паміж віткамі стужкі. На паверхні сценак утваралася мноства драпін-баразёнак. Але затое самі сценкі раўнелі, набывалі дасканалейшую форму.

— Ну вось, амаль і гатовы наш гаршчок,— паведаміла яна сваёй памочніцы і сама ўзрадавалася, што праца, здаецца, удалася. Засталося толькі рэдка разведзенай глінкай замазаць драпіны. І няхай ноч падсыхае, а назаўтра можна будзе аздобіць яго ўзорам.

На наступны дзень усе Зязюліны дзеці селі наўкола яе, бо вельмі любілі глядзець, як маці ўпрыгожвае гаршкі. Да таго ж спадзяваліся, што можа і ім будзе дазволена правесці хоць маленькую рысачку.

Трымаючы падсохлы гаршчок у левай руцэ, Зязюля той жа касцяной пласцінкай пачала адціскаць на яго шыйцы глыбокія гарызан-

тальныя баразёнкі. Закончыўшы гэту справу, узяла касцяное шыла і яго вастрыём ніжэй баразёнак прадрапала трохкутнікі, а ў трохкутніках — частыя паралельныя рысы. Такі ўзор азначаў узаранае і засеянае поле. Ён павінен быў паспрыяць, каб у сям'і заўсёды знайшлося што згатаваць у такім гаршку, каб яго ўласнікаў не спаткаў голад.

Задаволена агледзеўшы сваю работу, жанчына падумала і, крыху павагаўшыся, канцом палачкі пад самым брыжам гаршка зрабіла глыбокія круглыя копачкі. Так зауседы упрыгожвалі гліняны посуд у яе родным племені.

Зязюля, нарэшце, разагнула занямелую спіну. Адпачыла. Потым паклала выраб у цень пад паветку — каб падсох пару дзён, і пад страхам лупцоўкі загадала дзецям да яго не дакранацца.

А пасля вясковыя жанчыны знясуць у адно месца толькі што зляпленыя свае гаршкі. Мужчыны раскладуць вялікае вогнішча і пачнуць гэту ляпніну абпальваць, стараючыся, каб пракальвалася яна раўнамерна. У канцы дроў будуць падкладаць усё менш, каб жар слабеў паступова, бо калі астудзіць раптоўна — гліна патрэскаецца. А калі зусім патухне вогнішча і астынуць круглабокія звонкія гаршкі, мужчыны асцярожна дастануць іх з вугалёў і раздадуць гаспадыням. А тыя будуць пазнаваць свае вырабы па асаблівасцях узору і цікаўным вокам пазіраць на посуд суседак — у каго лепш і прыгажэй.

*

— Як ты ўжо, напэўна, ведаеш,— сказаў я, перадаючы Івану Пятровічу чарговыя спісаныя аркушы паперы,— першы гліняны посуд на нашых землях з'явіўся ў самым пачатку новага каменнага веку, каля шасці тысячагоддзяў назад. Праз увесь неаліт амаль адзіным тыпам начыння ў нашых продкаў быў вастрадонны, часам акругладонны, гаршчок — як у цяперашніх турыстаў. У бронзавым жа веку посуд стаў больш разнастайны і рознапамерны — пласкадонныя гаршкі, міскі, кубкі, жбаны-гладышы, вушастыя кубкі, слоікі, шматвухія амфары, былі нават друшлякі-цадзілкі. І ўсё гэта ўпрыгожвалася арнаментамі. Але калі ў папярэдні час узор, як правіла, пакрываў усе сценкі вырабу, то зараз ён наносіўся пераважна ўверсе. У канцы эпохі арнаменты на посудзе пастпова выходзяць «з моды»: яны бяднеюць, а то і зусім знікаюць. Гэта не значыць, што людзі перасталі любіць прыгожыя аздобленыя рэчы. Проста пачалі арнаментаваць нешта новае, напрыклад вопратку.

— Не зусім ты мяне пераканаў наконт заняпаду арнаментаў на гаршках, але, можа, яно было і так. А зараз скажы, як археолагі

тлумачаць, што ў бронзавым веку посуд такі розны? Можа, гэта звязана з шырокім распаўсюджаннем земляробства і жывёлагадоўлі? Да лясной і рачной здабычы дабавілася тое, што чалавек гадаваў і вырошчваў у хлеве, загоне ці на полі. Значыць, ежа стала больш разнастайнай, трэба было яе па-рознаму гатаваць, ды і спажываць — таксама. Тое ж малако лепш піць з вушастага кубачка, чым сёрбаць з вялікай пасудзіны. Да таго ж, з кубачка — больш гігіенічна.

— Слушнае разважанне! — адзначыў я.— Даўно кажу, што табе пара кінуць здзекавацца з паддоследных сабак і заняцца самай цікавай навукай — археалогіяй.

— Ну не кажы — цікавая кожная навука, калі яна падабаецца, калі па душы.

ПАД ЗНАКАМ КАМЕННАЙ СЯКЕРЫ

Двое мужчын у чоўне-даўбёнцы пераплывалі раку. Веславаў з кармы загарэлы мацак гадоў каля дваццаці пяці. Каля берага ён заграбаў стоячы, а на плыні апусціўся на калені, бо тут іх хісткая душагубка магла і перакуліцца. Гроб размашыста і моцна. Вузкае вясло легка ўваходзіла ў ваду, пакідаючы вірлівы след.

— Лягчэй грабі,— супыняў маладзейшага стары ў заношанай кашулі, які прымасціўся ў носе чоўна.— Зломіш вясло і панясе даўбёнку.

Каля другога берага мужчыны павярнулі човен насупраць плыні. Тут было плытка, таму можна было вяслом адштурхоўвацца ад пясчанага дна. Хоць і паволі, кароткімі рыўкамі, але сунуліся наперад, мінаючы рэдкаваты лазняк на поплаве.

Праз нейкі час скіраваліся ў каламутную прытоку і сталі прабівацца ёю да глінiстага абрыву, што галеў уперадзе.

Маладзейшы раптам перастаў веславаць і знерухомеў.

— Зірніце на вывараць,— прашаптаў ён старому.

Уперадзе іх ледзь не поперак рэчкі ляжала ў вадзе сукаватая хвоя, якая, мусіць, упала недзе з берага і была прынесена сюды веснавою паводкай. На дрэве прыладкаваўся згорблены мядзведзь і час ад часу заўзята біў лапаю па вадзе — лавіў рыбу.

Мядзведзь так захапіўся справай, што не заўважаў людзей. А тыя меркавалі, што рабіць далей. Трэба было неяк спудзіць звера з прытокі, але ж у іх была толькі адна дзіда і крамянёвыя нажы за поясам. Пакуль радзіліся, чацвераногі рыбак прыкмеціў няпрошаных гасцей, прыўзняўся на камлі і пагрозліва зароў.

— Гаспадар,— пакланіўся стары мядзведзю,— сыдзі ўбок і прапусці нас. Мы тваёй рыбы не зачэпім — у нас свая патрэба, якая цябе не датычыць.

Звер, пачуўшы голас, прыціх, быццам прыслухоўваючыся, але потым зароў яшчэ мацней.

Тады і людзі ў чоўне закрычалі, замахалі рукамі, пачалі кідаць камяні, якія хоць і не даляталі да касалапага, але пырскаў рабілі шмат. Нарэшце мядзведзь не вытрымаў гэтага ляманту, скокнуў на бераг і валюхавата падаўся ў пушчу.

Каля абрыву мужчыны выцягнулі даўбёнку на бераг і пачалі аглядаць камяні, якіх тут было, як насыпана. Некаторыя падымалі і неслі ў човен. Бралі адмысловыя — зеленаватага або шэра-крапчастага колеру. Такіх траплялася не шмат, але праз нейкі час набралася амаль два дзесяткі.

— Мусіць, і ўсё тут,— махнуў рукою старэйшы.— Пасля наступнай паводкі можа зноў намые.

Мужчыны спачатку вылілі з даўбёнкі ваду, якой набралася праз старую шчыліну, затым сапхнулі човен з берага і зноў выплылі на раку. Зараз веславаць было не трэба. Плынь спорна несла іх уніз, трэба было толькі пільнаваць, каб не напароцца на якую тапеліцу-вывараць.

Насупраць сваёй вёскі падарожнікі прысталі да невялікай пясчанай выспы, аддзеленай ад берага вузкай плыцізнаю. Тут быў толькі хмызняк, дзве дуплістыя і пакручаныя ветрам і часам вербы ды стары будан пад імі.

Маладзейшы мужчына выцягнуў з будана каменную пліту, тонкую і спрацаваную. Затым на пліту насыпаў мокрага пяску, які быў пад рукою — толькі грабяні глыбей,— і пачаў церці аб яе адзін са знойдзеных зеленаватых камянёў. Стары вынес з таго ж будана драўляны плашчак, елянцовую палку з насаджанай касцяной трубкаю і доўгі скураны пасак.

— Можа ўжо добра будзе?— перарваў працу ўпацелы малады мужчына.

Стары прыдзірліва агледзеў камень, які па форме ўжо нагадваў сякеру.

— Лязо тут крыху падвастры і хопіць. Потым будзем рабіць адтуліну.

Адтуліну свідравалі ўдваіх. Стары каменем націскаў на палку з трубкаю, у якой быў мокры пясок. Праваю рукой ён трымаў за канец скуранога паска, абкручанага вітком вакол палкі. За другі канец паска трымаўся маладзейшы, і яны абодва папераменна цягнулі

пасак кожны ў свой бок. Палка круцілася, і касцяная трубка вымолвала мокрымі пясчынкамі ў нарыхтоўцы паглыбленне.

Так працавалі яны некалькі часу, пакуль у трубцы не скончыўся пясок. Тады стары насыпаў у яе новага.

— Ведаеш,— загаварыў стары ў час наступнага перапынку.— Неяк я шукаў патрэбныя камяні ніжэй па цячэнню нашай ракі. Там таксама ёсць абрывы, але пясчаныя. Адпаведных камянёў так і не трапілася, затое пад пяском была крэйда, а ў ёй шмат крэменю. Хоць яго набраў — для нажоў. Дык вось пад верх абрыва там выступае пласт з вуглямі, костачкамі і крамянёвымі аскабалкамі. Пэўна там таксама жылі людзі. Але, мусіць, вельмі даўно, бо ў каго са старых не пытаўся — ніхто не памятае. І ў пласце мне трапіўся вялікі абабіты крэмень, востраканечны, з закругленым абушком. Падобны на сякеру, але яго да рукаяткі, пэўна, прымацаваць цяжка, а вось ашчаперыць пясцю зручна. Мой нябожчык бацька, а ён быў вельмі разумны і пражыў шмат, казаў, што такімі секачамі карысталіся першыя людзі.

— А тубыльцы на прытоках нашай ракі яшчэ і зараз так робяць: абаб'юць кавалак крэменю, каб востры быў, і прывязваюць да рукаяткі. Гэта ў іх за сякеру. Даўней, кажуць, нават лязо не зашліфоўвалі.

— Так, так,— заківаў барадою стары.— А саму сякеру ўстаўляюць у выдзеўбаны кавалак рога з прасвідраванай для рукаяткі адтулінай. Ад нас навучыліся, бо мы так мацуем рабочыя сякеры — кліны... І не толькі гэтаму навучыліся, але пераналі ад нас земляробства і жывёлагадоўлю. А раней толькі і жылі тым, што давалі ім лес і рака. А замест удзячнасці нам крычаць: «Захапілі нашу раку!» І захапілі, бо ўмелі ваяваць і мелі баявыя каменныя сякеры. Такія, як вось гэта, якую мы з табою зараз зробім. Таму можа і цэнім гэту зброю, пакланяемся ёй. Нават у магілы нябожчыкам кладзём.

Нарэшце адтуліна была прасвідравана, і стары вытрас з касцяной трубкі цёплы каменны стрыжанёк — высвердліну.

— Засталося толькі выразаць хвацкую рукаятку і насадзіць,— зазіраючы ў круглую адтуліну, задаволена прамовіў ён.

*

— Нешта агрэсіўна ў цябе атрымалася,— хмыкнуў Іван Пятровіч, дачытваючы мае запісы,— «захапілі», «умелі ваяваць»...

— А што зробіш? — развёў я рукамі.— Такія былі часы. Пацыфізм, мусіць, ужо прадукт цывілізацыі. Праўда, сярод першабытных паляўнічых і збіральнікаў узброеныя сутычкі былі рэдкімі. А вось ужо ў земляробча-жывёлагадоўчым грамадстве, што тут грэх утойваць,— паміж плямёнамі часам вяліся сапраўдныя войны; бывала, што і да

поўнага вынішчэння. Браліся за лукі і дзіды, каб адпомсціць за якую крыўду, захапіць жанчын і дзяцей, чужую маёмасць, выцесніць непажаданых суседзяў з урадлівых зямель. Часам трэба было адстойваць і свае абшары, калі з'яўляліся чужакі.

— Ну, а ў археалагічных знаходках гэта неяк прасочваецца?

А як жа. Часам пры раскопках пахаванняў у костках памерлых знаходзім наканечнікі стрэлаў. Ды і адмыслова аздобленыя бронзавыя кінжалы, мусіць, былі не толькі прыладамі працы або палявання, як і каменныя свідраваныя сякеры. Дарэчы, у бронзавым веку чалавек нават вынайшаў асаблівую форму наканечнікаў стрэл — з вострымі шыпамі, баявую.

ПАСТУШКІ, ВОЎК І САБАКА КУДЛАЧ

Гарачы поўдзень. Сонца прыпякае неміласэрна. На даляглядзе квола завязваюцца воблачкі, і тады прыходзіць снадзяванне, што яны вырастуць у хмару і на зямлю праліецца асвяжальны дождж. Але воблачкі знікаюць, і на выцвілым блакіце неба зноў застаецца ў адзіноце калматае, сляпучае сонца.

Каровы і козы зашыліся ў кусты ля рачной старыцы і ратуюцца ад гарачыні і аваднёў. Авечкам авадні не страшныя, але ім у ваўняных футрах асабліва горача. Яны згрудзіліся шэрым комам у цень і не рухаюцца. Але пастушкі — тры загарэлыя да чарнаты падлеткі — толькі радуюцца, што такая спёка і што статак як прыліп да старыцы. Козы не лезуць у лес, каровы не разбрыдаюцца, і таму ёсць час на забавы.

Спачатку пастушкі рамантавалі стары будан, які, мяркуючы па накапычаных слядах, разбурылі, дурэючы, маладыя зубрыныя бычкі. Хлопцы зноў нахільна прыставілі да дуба доўгую жэрдку, паклалі на яе папярочкі. А на іх пачалі чапляць адламаныя яловыя лапкі. Атрымалася шчыльная і моцная стрэшка. Засталося толькі чакаць дажджу.

Хлопцы пасядзелі ў духмяным ад свежай ігліцы будане. Але дождж так і не пачынаўся. Пастушкам стала, нарэшце, сумна і яны ўзяліся вучыць свайго памагатага — сабаку Кудлача плаваць. Бралі яго і скідвалі з берага ў ваду.

Спачатку сабаку гэта спадабалася — было прыемна ахаладзіцца, бо яго таксама даймала гарачыня. Але пасля трэцяга купания Кудлач пакрыўдзіўся і ў рукі больш не даваўся. Трымаўся воддаль.

А дзень так бясконца доўжыцца, і сонца, як завісла над галавою, так і не скранецца, быццам не хоча злазіць са сваёй вышыні... Чым бы гэта заняцца яшчэ?

Але доўга хлопцы не раздумвалі. . Набралі камянёў і пачалі паляваць на шчупакоў. Калі асцярожна пракрадацца каля вады, можна прыкмеціць між водарасцей вузкія целы рыбін, якія ці то драмалі, ці то пільнавалі спажыву. Трэба было прыцэліцца і з сілаю кінуць у рыбіну камень. Узлятаў сноп пырскаў, а часам усплываў і аглушаны шчупак. Тады заставалася хутка падхапіць яго і выкінуць на траву. Злоўленую здабычу тут жа з'ядалі.

Ды сырая рыба — гэта не тое, і ад яе толькі засмактала пад лыжачкай. І тады хлопцы адчулі, што ім даўно пара абедаць.

— Ты, Лісіца, папільнуй з Кудлачом статак, а мы хуценька збегаем і паямо. А потым — ты,— прапанавалі хлопцы свайму трэцяму тава-рышу.

Калі сябры схаваліся за паваротам ракі, Лісіца спачатку абышоў старыцу, каб пераканацца, ці не разбрыліся каровы, а потым крамянёвым нажом пачаў застругваць, вастрыць адламаную арэхавую палку. Зараз ён застаўся адзін і яму стала ніякавата. Хоць вёсачка іхняя была і недалёка, вунь у тым дубнячку, але ж побач пушча. А ў пушчы і мядзведзі, і ваўкі, і рысі. Праўда, блізка мядзведзяў пакуль не чуваць, і ваўкі летам на людзей не нападаюць, і побач верны таварыш Кудлач, але ж з вострай, хоць і драўлянай, дзідай ён, Лісіца, будзе адчуваць сябе надзейней.

Калі хлопец ужо выразаў на дрэўку адмысловы ўзор, завурчаў Кудлач і поўсць на ягоным загрыўку ўздыбілася. Падхапіўся і пастух, і ў час — з прылеснага хмызняку вымкнуўся шэры звер, ухапіў крайнюю авечку і пацягнуў яе да лесу.

— Уга! Ваўка! Кусі! — залямантаваў Лісіца і кінуўся за ваўком. Але першым драпежніка дагнаў Кудлач. Сабака не кінуўся адразу ў бойку з дужэйшым праціўнікам, а насядаў ззаду. Воўк, не выпускаючы здабычу, паварочваўся да Кудлача, і той адскокваў убок, ратуючыся ад жоўтых іклаў. Воўк быў стары, з запалымі бакамі, а авечка трапілася цяжкая, да таго ж перашкаджаў Кудлач, таму шэры разбойнік рухаўся рыўкамі. Перад самым лесам дасяг яго і пастух.

Убачыўшы побач чалавека, Кудлач асмялеў і кінуўся на ваўка, учапіўся яму ў карак. Звер кінуў здабычу і закруціўся ўюном, стараючыся скінуць сабаку, рвучы яму сцёгны. Ляцела ў бакі поўсць, гыркаталі воўк і сабака, крычаў Лісіца.

Пэўна б Кудлачу давялося блага, але хлопец, колькі было моцы ў руках, сунуў ваўку ў бок драўлянай дзідаю. Той матлянуўся да Лісіцы,

збіў яго з ног. Але тут Кудлач злаўчыўся і ашчаперыў пашчу на самай ваўчынай шыі. Звер захрыпеў, затузаўся. Лісіца падхапіўся на ногі і некалькі разоў увагнаў яму ў бок сваю вастраколіну.

І тут на гэты шум і крык падбеглі з паселішча мужчыны з дзідамі, сякерамі, лукамі. Былі ўзброеныя, як на вайну, бо не ведалі — ці звер напаў на статак, ці які чужынец.

Утрапянелага Лісіцу калаціла ліхаманка. Ён нешта сіпеў сарваным голасам і ўсё паказваў на ваўчыны труп, які тузаў за бакі раз'ятраны Кудлач, сам крывавячы разарваным сцягном.

Падышоў бацька, абняў сына за плечы і асцярожна павёў у вёску. Ззаду неслі мёртвую авечку і ваўка. Побач падскокваў на трох лапах сабака, і то залізваў рану, то зноў мецiўся ўчапіцца ў былога ворага.

Ноччу Лісіца кідаўся ў сне, трызніў. Яму ўсё здавалася, што на статак напалі ваўкі, цягнуць авечак у лес, а ён хоча закрычаць, паклікаць на дапамогу — ды не мае голасу, хоча пабегчы — але ногі як анямелі.

На раніцу паклікалі ведзьмара. Той доўга шаптаў над хворым, праганяў пярэпалахі. Потым даў выпіць настою зёлак.

Крыху пазней у хаціну зайшоў Бар, самы лепшы паляўнічы іхняга роду. Прайшоў да лежака, дзе пад скамечанай льняною дзяружкай ляжаў Лісіца. Асцярожна памацаў прыстаўленую да сцяны хлапцоўскую дзіду, агледзеў яе вастрыё. Затым прысеў да хлопца і паклаў на яго плячо дужую руку:

— Доўга не залежвайся. Пойдзеш з намі на паляванне. Калі ты такой прычындалай паклаў ваўка, то што ж ты зможаш сапраўднай дзідаю з крамянёвым наканечнікам!?

І гэтыя словы славутага паляўнічага былі лепш за вядзьмарскія загаворы. К вечару хлопец падняўся на ногі.

Бар стрымаў сваё слова. Калі Лісіца адужаў, ён з загонам мужчын і сапраўды пайшоў на паляванне. На разе толькі на качак. Але ўсё наперадзе. Лісіца падрасце і будуць у ягонай здабычы і мядзведзі, і туры, не кажучы ўжо пра ваўкоў, якіх ён, ну, адной рукой...

*

— Чаму ў паляўнічага такое дзіўнае імя — «Бар»? Сам прыдумаў?

— Не; так і было. А значыла яно — Мядзведзь. Сапраўднае найменне мядзведзя ў старажытных індаеўрапейцаў, калі яны яшчэ складалі адноснае цэлае, было «бар», ці нешта падобнае. Але гэты бар у некаторых народаў лічыўся свяшчэннай жывёлінай і таму не дазвалялася ўголас вымаўляць ягонае імя. Па гэтай прычыне пра яго

казалі іншасказальна: мядзведзь або вядзмедзь — той, хто ведае мёд, Таптыгін, касалапы і гэтак далей.

— А чаму мядзведзь — «бар»?

— Пра гэта не я, а лінгвісты даўмеліся. Мядзведзь па-нямецку — бёр, па-англійску — бэе. А куды мядзведзь на зіму залягае? У наш «беларускі» бярлог, што значыць — лаг во бара!

— Ну добра, а чаму хлопца лячыў вядзьмар? Гэта ж такі несімпатычны персанаж...

— Благую славу гэтым людзям прыпісала хрысціянская царква. А гэта ж былі вясковыя лекары, прадстаўнікі, так сказаць, народнай медыцыны, якая прымяняла і лекавыя зёлкі і замовы. Заадно былі і святарамі ў язычніцкіх культах, чараўнікамі. Сэнс самога слова паказвае, што іх у старажытнасці паважалі, бо яны тыя, хто «ведымае».

СТАРЫ КРЭМ

Зямля на беразе Росі была так перакапана, уся ў ямінах і равах, што выглядала быццам твар перахварэлага на воспу чалавека. Асабліва перавернутымі былі нізавіны паміж узгоркамі. У нізавінах амаль да самай паверхні падыходзілі паклады крэйды. Пракапаўшы з паўметра, можна было натрапіць на суцэльную белую пароду, а з яе дастаць жаўлакі крэменю.

З даўніх-прадаўніх часоў здабываюць тут крамянёвую сыравіну. Спачатку збіралі яе на паверхні. Калі ж хацелі мець матэрыял больш якасны, не высахлы, урываліся ў зямлю, капалі розныя неглыбокія канавы і ямкі. Але адзін час сюды пачалі находзіць ад Свіслачы і з-пад Буга трупы людзей, якія ўмелі здабываць крэмень адмыслова, глыбокімі шахтамі зарываючыся ў крэйду, распрацоўваючы крэменяносныя пласты ў бакі падбоямі-штрэкамі. Прышэльцы то з'яўляліся, то знікалі, калі тубыльцы збіраліся з сіламі і праганялі няпрошаных гасцей, але іхнюю звычку здабываць крэмень шахтавым спосабам пераймалі ўсе навакольныя жыхары.

Маючы доступ да высакаякаснай сыравіны, людзі сталі нават пераборлівымі. Выявіўшы пласт, спрабавалі на месцы, як крэмень расколваецца, ці лёгка з яго будзе рабіць сярпы і сякеры. Калі не падабалася, капалі глыбей, або распачыналі новую выпрацоўку. Так было доўгія стагоддзі і, нарэшце, дайшло, што знайсці новую мясціну пад шахты стала цяжкавата.

Вось і зараз жыхары адной з суседніх вёсак — з дзесятак мужчын — доўга выбіралі сярод перакопаў нечапаны лапік зямлі. Нарэшце знайшоўшы яго, пачалі дзяўбці крэйду вострымі каламі, выграбаць друз ласінымі лапаткамі, марудна паглыбляючыся ў пароду. Дні праз чатыры дабраліся, нарэшце, да крэменю, але амаль адразу ж натрапілі і на штрэк старой шахты. Давялося паглыбляцца да новага пласта, якога тут магло і не быць. Ды на шчасце ці няшчасце наступны пласт таксама знайшоўся, і крамянёвыя жаўлакі ў ім пайшлі вялікія і гладкія. Але зноў, як толькі матыкамікайламі пачалі ўсякацца ў сценкі, пасыпаўся друз, пасыпалася крэйда з суседняй выпрацоўкі. І тут здарылася бяда. Сценка трэснула і абрушылася, заваліўшы друзам шахцёраў.

У вялікім паспеху кінуліся расчышчаць завал суродзічы. Ды пакуль дабраліся да пацярпелых, адзін з іх ужо не дыхаў, ды і другі ледзь вярнуўся да свядомасці.

Пасля гэтага здарэння стары Крэм — калматабароды дзед у скураной, выбеленай крэйдай безрукаўцы — узяў двух дужэйшых маладых мужчын і пайшоў з імі шукаць у наваколлі новае крэменяноснае радовішча. Крэм выглядаў у лесе раўнейшыя ўчасткі зямлі, з бураломам. Па шматгадовым вопыце ведаў — там, дзе крэйда блізка падыходзіць да паверхні, над ёю тонкае земляное покрыва, у якім цяжка каранямі ўмацавацца дрэвам. Таму яны і падалі пад напорам навальнічных вятроў.

Зазірнуўшы пад адну вываРаць, стары заўважыў белую пароду, а ў ёй крамянёвы аскабалак.

— Разгарніце пясок у бакі і зачысціце крэйду,— паказаў ён памочнікам мясціну, дзе яны павінны былі распачаць працу.

Сам жа агледзеў суседнія вываРаці, пакорпаўся ў недалёкай свежай прамыіне, што засталася пасля нядаўняга дажджу, і ўсё нешта мармытаў сабе пад нос, быццам гаварыў замовы. А потым пайшоў да старога абамшэлага дуба з абсмаленай перунамі вяршалінай. Пад дубам на плоскім валуне ляжаў вялікі, як скрануць, фігурысты жаўлак крэменю. Калі прыгледзецца, то здавалася, што ён падобны на прысадзістага чалавека з круглай галавою і носам, як кулак. Канешне, выгляд выявы быў несамавіты — і вока адно, і скасабочаны, але, пэўна, так і павінен быў выглядаць Краменны дух — гаспадар усіх мясцовых падземных багаццяў.

Ніхто не памятае, калі і хто ўсцягнуў на гэты валун жаўлак. Дзяды сцвярджаюць, што ляжыць ён тут ад стварэння свету, як і расце гэты дуб таксама ад пачатку ўсяго жывога.

Побач стаялі і ляжалі меншыя крамянёвыя фігуркі — быццам мядзведзі, алені, птушкі. Былі тут крамяні з акамянелымі ракавінамі дзівосных малюскаў. Усё, што траплялася ў шахтах нязвыклай формы, людзі прыносілі пад стары дуб, бо былі перакананыя, што ў іх маўкліва хаваюцца чароўныя сілы зямных нетраў. Краменны ж дух меў найбольшую моц. Ен мог затлуміць галаву чалавеку, паслаць у пустую мясціну, дзе горназдабытчык, выліўшы сем патоў, выдзеўбе ў шчыльнай і ліпучай крэйдзе пошукавы калодзеж у два свае росты і нічога не знойдзе. А мог даць столькі крэменю, што не забярэш і ўдзесяцёх.

Крэм ужо не адзін дзесятак гадоў здабывае крэмень, колькі мазалёў нацёр на далонях, капаючы пароду, робячы вузкія падбоі рагавым востраком. Колькі перабрана камянёў гэтымі жылістымі, агрубелымі, шрамаватымі рукамі! Крэм ведае тут усе хады-выхады. Знаецца ён і з духамі і стараецца іх улагоджваць. Асабліва гэтага— Краменнага. Той, мусіць, таксама добра запомніў старога шахцёра, бо спрыяе яму. Таму рэдка бывала, што Крэм распачынаў шахту і яна аказвалася пустой. Калі ж надаралася няўдача, стары ішоў пад дуб, дакараў жаўлак і црасіў больш так не жартаваць.

Вось і зараз Крэм паклаў на валун сушаную плотку — духі ж таксама хочуць есці — і сказаў: «Не падвядзі мяне. Пашлі па старой памяці крэмень каля той вывараці, дзе капаюць мае памочнікі. Мне ўжо не шмат засталося жыць на гэтым свеце, таму на зыходзе дзён не хацеў бы мець перад суродзічамі ганьбу. Ну як, дапаможаш?» І Крэму падалося, быццам па-сяброўску падміргнула яму каменная выява сваім адзіным вокам.

Абнадзеены шахцёр вярнуўся да вывараці, дзе мужчыны ўжо скончылі працу і адпачывалі.

Крэм укленчыў на расчышчаным месцы і пачаў аглядаць крэмені. Калупнуў адзін, другі, вызначыў нахіл. У тым жа кірунку павшей быў ісці і сам крэменяносны пласт. Затым адступіў пару крокаў у напрамку паніжэння пласта і загадаў пачынаць шахту.

Капалі па чарзе, бо ў шахтавым калодзежы для дваіх не было месца. Адзін прадаваў, другі адпачываў. Потым мяняліся. Калі выпрацоўка паглыбела, друз пачалі выцягваць плеценым кошыкам.

Да вечара ўдалося заглыбіцца амаль да пояса.

Назаўтра мужчыны закапаліся па плечы. Капаць у глыбіні было цесна, нязручна, не так як каля паверхні, дзе можна было размахнуцца, дзе крэйда была рыхлейшая, патрэсканая. Тут жа ішла суцэльная шчыльная парода, у якую з цяжкасцю заганялася вастрыё кайла. Да таго ж і самі капальнікі былі хоць і дужыя, але маладыя і

нявопытныя, учарашнія хлопцы, якія яшчэ не набылі вынослівасці. А крэменю ўсё не было.

— Мы так да яго і не дабяромся. А можа тут і зусім пуста? — пачалі бурчэць памочнікі, мусіць намякаючы, што Крэм па старасці памыліўся.

— Будзе, хутка будзе,— супакойваў стары, а сам таксама пачаў хваляваца.

Адзін з капальнікаў раздражнёна размахнуўся і зноў увагнаў кайло ў крэйду, а потым адразу ж разагнуўся і радасна закрычаў:

— Во, зламалася! — і паказаў вышчарбленае лязо прылады.

Узрадаваліся і ягоны напарнік, і Крэм. І не таму, што сапсаваўся гарняцкі інструмент,— лязо зламалася аб нешта надзвычай цвёрдае, а гэта мог быць толькі крэмень!

Хутка жаўлак ляжаў на траве каля вусця шахты. Ен быў плоскі, як праснак. Нічога вартага з яго не зробіш, хіба які скрабок. Але гэта быў знак, што пачаўся пласт. І праўда, праз пядзю пароды трапіўся большы жаўлак. Да вечара выбралі частку крэменю, што залягаў на дне шахты. Заўтра дастануць рэшту і пачнуць капаць падбоі. Крэмень тут добры, і яго шмат.

Калі скончылі працу, Крэм абтрос з каленяў наліплую крэйду, павярнуўся ў той бок, дзе рос стары дуб, і нізка пакланіўся.

Вярталіся ў шахцёрскі лагер, ледзь цягнучы здабычу. Трэба было паказаць яе суродзічам. Заўтра сюды прыйдуць гуртам і пачнуць распрацоўваць новае радовішча.

Крэм ішоў у лагер ззаду сваіх памочнікаў. Не спяшаўся. Быў задаволены. Ведаў, што аднавяскоўцы зноў будуць дзівіцца, які ён знаўца зямных таямніц, як ён паранейшаму знаходзіць добрыя мясціны для шахтаў. Не, ніхто яшчэ не скажа, што Крэм знасіўся, што яму ўжо толькі сядзець у хаціне і няньчыць унукаў.

*

— Рось, гэта што каля Ваўкавыска цячэ?

— Так.

— А чаму ты ўпэўнены, што Рось?

— На берагах гэтай ракі у ваколіцах пасёлка Краснасельскі знойдзены адзіныя, вядомыя на Беларусі, крэменездабыўныя шахты. Так мелася некалькі тысяч выпрацовак у крэйдавай тоўшчы, а побач — мноства майстэрань па вырабу крамянёвых сякер. Па вугалях, знойдзеных у шахтах, вызначылі, што іх пачалі капаць яшчэ ў неаліце — у трэцім тысячагоддзі да нашай эры, але большасць іх адносіцца да наступнага тысячагоддзЯу гэта значыць — да бронзавага веку.

Я там даследаваў не адну шахту, наваколле аблазіў спрэс і ведаю яго дасканала. Таму адразу і здагадаўся, што ў сне мне бачыліся менавіта гэтыя мясціны.

— У цябе ўсюды — крэмень, крэмень. А дзе ж бронза? Век жа — «бронзавы»?

— Бачыш, у бронзавым веку на Беларусі, як і на суседніх тэрыторыях, большасць прылад працы, як і ў папярэднім новакаменным веку, выраблялася з крэменю. Медзь і яе сплавы з іншымі металамі (бронза) траплялі да нас з далёкіх Каўказа, Скандынавіі, Прыкарпацця. Іх было мала, каштавалі дарага. Але кожную новую эпоху мы называем па важнейшых яе адкрыццях. Навучыўшыся здабываць бронзу, людзі зрабілі крок да выплаўкі жалеза з руды! Ну а жалезу абавязана ўся наша цывілізацыя.

ВЫПРАБАВАННЕ

На пералёт стралы ад Выспы Выпрабаванняў мужчыны перасталі весляваць, і човен, яшчэ крыху праплыўшы з разгону, спыніўся, лёгка пагойдваючыся на бакавой хвалі.

— Пара, Ждан,— сказаў шыракатвары з пасівелай барадой мужчына.

З дна чоўна ўстаў юнак гадоў пятнаццаці і пачаў распранацца. Па тым, як,блытаючыся ў раменьчыках-завязках, спехам вызваляўся ад вопраткі, як моцна былі сціснуты пабялелыя вусны, можна было здагадацца, што ён хвалюецца. І. каб не прыкмецілі гэтага прысутныя і не падумалі, што баіцца, мусіць, так спяшаўся хлопец.

Нарэшце ён застаўся зусім голы — хударлявы, але ўжо мускулісты светлавалосы юнак з яшчэ па-дзіцячаму адтапыранымі вушамі. На цёмнай, загарэлай пад сонцам, закуранай каля вогнішчаў, скуры зараз асабліва выдзяляліся белаватыя шрамы ад хлапечых боек, лажання па дрэвах і хмызняках, нырцавання сярод карчоў за рыбай.

— Пара, Ждан,— зноў сказаў шыракатвары.

Ждан выпрастаўся, зірнуў на маўклівых мужчын у чоўне і сустрэўся з бадзёрачым паглядамбацькі, які прымасціўся на карме. І ад гэтага пагляду ў юнака прыбавілася рашучасці, і ён легка, каб не разгайдаць няўстойлівую даўбёнку, адштурхнуўся ад яе дна і даў нырца ў ваду. Праз колькі сажняў вынырнуў і паплыў, не азіраючыся, да выспы. І толькі, калі выбраўся на бераг, абярнуўся і памахаў рукою.

Мужчыны развярнулі човен і павеславалі прэч ад выспы.

Праз сем дзён — квадру, калі месячная поўня прыкметна сышла на ветах, той жа човен зноў адплыў ад прыбярэжнага паселішча і пакіраваўся да выспы. У ім нетаропка веславалі тыя ж мужчыны, а на карме зноў сядзеў бацька Ждана. І мусіць, толькі яму не цярпелася, бо ён усё неўпрыкмет выгінаўся, каб з-за спін весляроў зірнуць на выспу. Яго турбавала, як жа на гэтым бязлюдным кавалку зямлі пасярод возера, без ежы, вопраткі і агню, бяззбройны, даў сабе рады мінулыя дні ягоны сын, дні, якія здоўжыліся на месяцы. Хвалявала і як ацэняць старэйшыны роду вынікі выпрабавання. Ці прымуць Ждана ў свой гурт паляўнічых і воінаў?

Вузкай пратокай праз трыснёг човен праслізгнуў пад бераг, чыркануў дном па пяску і спыніўся.

Мужчыны выбраліся з даўбёнкі і выцягнулі яе на сухое, каб не знесла выпадковай хваляй, хоць сёння было ўвогуле пагодліва і ціха.

Усе мінулыя дні прайшлі без дажджу, таму мужчынам было лёгка па слядах прасачыць, што рабіў, як паводзіў сябе на выспе Ждан. І наадварот, юнаку было складана вытрымаць апошняе з выпрабаванняў — затаіцца так, каб ягоныя суродзічы як найдаўжэй маглі яго адшукаць.

Паўзіраўшыся навокал, мужчыны знайшлі месца, дзе юнак выбраўся з вады і ўпершыню ступіў на бераг Выспы Выпрабаванняў. Сляды былі ўжо добра затаптаныя птушкамі і дробным лясным жыхарствам. Буйнейшага ж — тураў, мядзведзяў, ваўкоў і рысяў, якія б маглі пагражаць чалавечаму жыццю, тут не было.

Па слядах вынікала, што Ждан спачатку адразу быў сунуўся ў лес, але потым, бачна паразважаўшы, вярнуўся да вады і пайшоў аглядаць свае часовыя ўладанні берагам. Такім жа шляхам рушылі і мужчыны.

На вузкім мысе сляды юнака былі асцярожлівыя і нават няўпэўненыя. Пальцы ног глыбока ўціскаліся ў пясок. Бачна было, што ён тут быў напружаны, кожнае імгненне гатовы кінуцца назад. А хваляваца тут было з чаго. За нейкія тры пералёты стралы з вады выступала ў чаратовым аблямаванні цёмная ад старых хвой выспачка з закінутымі могілкамі невядомага народу. Ніхто не ведае і не памятае, як і дзе знік той народ з берагоў возера. Спарахнелі буданчыкі нябожчыкаў на выспачцы. Утравелі і ўраслі ў зямлю абмытыя дажджамі косткі, але душы памерлых па-ранейшаму павінны ж недзе кажанамі кружыцца між камлямі хвой — загадкавыя, маўклівыя і пэўна помслівыя, бо ім жа даўно ніхто не прыносіць ахвяры, каб улагодзіць.

— А гэта што такое? — спыніўся раптам шыракатвары і вастрыём дзіды паказаў на пясок.— Ці не зацямніўся хлопцу розум?

Спыніліся і астатнія і ў страху ўбачылі, што на пяску цямнелі і пазнейшыя жданавы сляды. Яны выходзілі з лесу і былі перад самым краем вады глыбокія, растаптаныя — юнак доўга ўзіраўся ў Выспу Мерцвякоў, а потым сляды вялі ў ваду і там губляліся.

Паспакайнелі мужчыны толькі тады, калі крокаў праз дваццаць прыкмецілі, што з возера зноў выходзіў ланцужок знаёмых слядоў.

— Няўжо ён там быў? — разводзілі рукамі мужчыны.

— Усё можа быць! — узбадзёрыўся Жданаў бацька, радуючыся, што сын жывым і, мусіць, цэлым вярнуўся назад.— А памятаеце, як ён прынёс цэлы ваўчыны вывадак. З самага лагва выбраў. Ен у мяне не з баязліўцаў!

Прытулак Ждана знайшлі каля ціхай, зарослай белымі гарлачыкамі затокі на паўднёвым беразе.

— А памятаеце, што і мы, калі пасвячаліся на мужчын, выбіралі гэтую затоку,— заўважыў адзін з шукачоў.— Ды і нашы сыны амаль заўсёды ўладкоўваліся тут.

Усе згодна заківалі галовамі. А як жа, дзе тут знойдзеш утульнейшую мясціну?

Каля затокі спрэс былі сляды Ждана, знакі ягонай дзейнасці. На каржакаватым дубку ў развілцы сукоў было намошчана галлё са звялым лісцем. Бачна, што юнак першым часам начаваў на дрэве. Але потым, абвыкшыся і пасмялеўшы, зладзіў сабе будан на зямлі, пад дубком; свой прытулак з галля і трыснягу выслаў сухой травою.

Побач з буданом яшчэ дымілася вогнішча. Тут знайшлі і змайстраваныя прылады для здабывання агню: лук з суканай лубяной цецівою, сухую арэхавую палачку з абсмаленым канцом і шырокую, адшчапаную ад сухастоіны трэску. У трэсцы было некалькі абвугленых ямачак, куды ўстаўлялася палачка, калі «выкручваўся» агонь.

Пад сцяной будана ляжаў запас лубяных валокнаў, з якіх рабілася цеціва для лука і з якіх, магчыма, самотнік спрабаваў зладзіць сабе нейкую апратку. Тут жа, побач з плоскім каменем, было насыпана розных крамянёвых аскабалкаў.

— Шмат напсаваў крэменю,— разглядаючы друз, прамовіў адзін з аглядчыкаў.— Для нейкага нажа хапіла б і меней.

— А нічога. Такой бяды! — заступіўся за юнака шыракатвары.— У ягоныя гады і мы з табою былі невялікія майстры.

Затым уважліва агледзелі вугалі вогнішча і траву навокал і вывел!, што Ждан харчаваўся малюскавымі бяззубкамі і смаўжамі, налоўленай нейкім чынам рыбай, пёк карані белай лілеі. У лейкаватай

пасудзіне з бяросты яшчэ крыху заставалася натоўчанай з сушаных трысняговых каранёў мукі. Але больш за ўсё здзівіліся мужчыны, калі знайшлі абгрызеныя косткі зайца.

— Няўжо каменем? Ці ў якое сіло загнаў?

Па ўсяму было бачна, што Ждан вытрымаў выпрабаванне выдатна. Заставалася толькі паглядзець, як ён умее затойвацца ў гушчары і што выбраў на схованку.

Шукачы расцягнуліся паскам у лясным зарасніку і пачалі паволі прачэсваць выспу, зазіраючы пад кожную вываращь, аглядаючы кусты арэшніку і ядлоўцу. Выспа была нешырокая і асабліва патаемных куткоў тут было няшмат, да таго ж мужчыны іх усе добра ведалі. Але дзе яны ні шукалі, усюды было пуста — ніякіх адзнак, што там схаваўся юнак. Трапляліся, праўда, ягоныя сляды, але даўнія, не сённяшнія.

— І куды ён зашыўся, не пад зямлю ж? — бурчалі мужчыны, зноў беручыся перашукваць выспу.

І тут яны заўважылі дзядка, якога пакінулі сторажам каля даўбёнкі. Дзядок спяшаўся да іх з надзвычай разгубленым выглядам. За колькі крокаў ад загону ён задыхана выгукнуў:

— Чоўна няма!

— Як, няма? — страпянуліся мужчыны.

— Няма! Як пад ваду пайшоў!

— І як гэта здарылася? — пачалі яны распытваць у дзядка, калі прыбеглі на апусцелы бераг.

— Сяджу каля чоўна, чакаю. А вас усё няма і няма, ажно нудзіцца пачаў. А тут адно чую, у арэшніку нешта зашастала. Ждан, думаю, затаіўся. Вось тут яго і злаўлю. Я — туды. Палазіў па кустах — нікога. І тут мяне быццам кальнула што — каб якой бяды не здарылася. Выбег з арэшніку, зірнуў на бераг і абамлеў — даўбёнкі як і не было...

Угледзеліся мужчыны ў пясок — каля шырокай умяціны ад чоўна вільгатнелі ўжо знаёмыя да драбніц адбіткі босых Жданавых ступакоў. Гэта ён, паршывец, мабыць, каменьчыкі кідаў у кусты, каб звабіць туды старога, а сам сапхнуў даўбёнку ў ваду і знік з ёю ў трыснягу.

Вось будзе сораму на ўсё наваколле, калі хлопец надумаецца паплысці ў паселішча, пакінуўшы іх на выспе. Смеху і кпін не абярэшся.

— Ждан, не дурніся! Аддай човен! — гукалі мужчыны ў трыснёг.

Той толькі шапацеў сваім вузкім лісцем.

— Так і быць,— пачалі здавацца «экзаменатары»,— ты перамог — мы цябе не здолелі знайсці!

— І праўда, сынку, выплывай. Хопіць жартаў! — гукнуў і бацька.

І тады мацней зашапацеў трыснёг, і з яго высунуўся човен, у якім сядзеў Ждан. На ягоных сцёгнах была плеценая лубяная апаяска, за ёю тырчэў крамянёвы нож. З пляча юнака звісала заечая шкурка. І хоць гэта і не было мядзведжае футра, але Ждан усё адно зараз выглядаў сапраўдным паляўнічым.

— Хітры ты, Ждан,— дабрадушна бурчаў шыракатвары, заграбаючы вяслом, калі вярталіся з Выспы Выпрабаванняў.— Але і лупцоўкі табе не шкодзіла б. За непавагу да старэйшых.

А бацька не выцерпеў і запытаўся:

— А на той Выспе Мерцвякоў... як там?

— А я да яе не даплыў. Пад самым берагам страх узяў...

— І правільна зрабіў,— пагадзіліся мужчыны.— Хай з чужымі духамі разбіраюцца светары, а наша з табою справа — на тура ды мядзведзя хадзіць, зямлю ад чужынца бараніць, ячмень сеяць. Ды і ці мала ў нас мужчынскіх заняткаў.

*

— Калі не памыляюся, усе гэта этнографы на лацінскай мове называюць ініцыяцыяй — пасвячэннем.

— Не, не памыляешся, Іван Пятровіч. І зараз у жыцці юнака ці дзяўчыны ёсць такія рубяжы, калі яны «юрыдычна» становяцца паўнапраўнымі дарослымі — атрымоўваюць пашпарт, могуць жаніцца або выйсці замуж, адказваюць за свае ўчынкі перад законам, пачынаюць працаваць і гэтак далей. Нешта падобнае адбывалася і ў старажытнасці. І гэты пераход у дарослацсь быў важным этапам і суправаджаўся адпаведнымі дзеяннямі і абрадамі пасвячэння. Пры гэтым пасвячаемага падвяргалі розным выпрабаванням.

ДЗІВАК ВЯЧОРКА

— Усё забаўляешся драўляшкамі, а твае аднагодкі ўжо даўно на паляванне ходзяць, мяса дадому прыносяць,— упікнула аднойчы маці свайго сына.

Суседзі таксама пакеплівалі, а некаторыя і бурчалі:

— Займее сям'ю і трэба будзе стаць яе кармільцам ды і бацькам, калі састарэюць, дапамога спатрэбіцца, а ён, як кабета, баіцца парсюка закалоць ці авечку зарэзаць. І ў лесе з лукам яго не ўбачыш.

Крыўдна робіцца Вячорку за такія словы, бо ён не быў баязліўцам. Калі леташняй зімою мядзведзьбадзяга ўламаўся праз загароду ў быдла, хіба не ён, Вячорка, першым з дзідай кінуўся на яго? Але ён не

мог падысці з касцяным кінжалам да кабанчыка, якога сам выгадаваў з пацешнай малечы, або з нажом да барана, якога калісьці зімою адаграваў у хаце каля агнішча і цішком ад маці ласаваў кавалачкамі праснака.

Ды папрокі маці падзейнічалі, і Вячорка, уздыхнуўшы, сабраўся на тое паляванне. Пайшоў не з мужчынамі ў загон на лясных коней-тарпанаў, а адзін — на бераг ракі, дзе ведаў зацішны звярыны вадапой.

Выйшаў пад раніцу, калі начныя цені пасвятлелі і сталі лілова-шэрымі, а ў буйных кроплях расы ўжо адбівалася злёгку паружавелае неба. Пакручастымі сцежкамі, дзе чалавечымі, а дзе і звярынымі, трапіў на рачны бераг і затаіўся пад касагорам у хмызняку.

Лёгкі ток паветра нёс ад ракі саладкаваты пах цвітучай чаромхі, зараснікі якой, быццам успененыя, бялеліся побач. У кусце ля самай вады пералівіста зацёхкаў салавей. Услухаўшыся ў ягоную песню, хлопец налічыў ажно сем каленаў і ўзрадаваўся — такога майстра чуў упершыню. У бок возера шумна праляцела качыная пара. Высока ў асінніку заціўкалі сініцы. Разам са світанкам прачыналіся лес і ўсё наваколле.

На супрацьлеглым недалёкім беразе пачаўся нейкі рух. З хмызняку выткнулася пушыстая мордачка і натапыраныя доўгія вушы. Мордачка паразглядалася ў бакі, павадзіла вушамі, ловячы падазроныя гукі, а затым да вады кароткімі скачкамі прашалэпаў і сам заяц. Звярок напіўся, і толькі паляўнічы пачаў нацягваць цеціву, як шарак, які намачыў свае вусы, стаў слупком і пачаў заўзята выціраць іх лапамі; дакладна, як Вячоркаў дзядзька. Хлопец не ўтрымаўся і ціхенька хіхікнуў, затуляючы рот рукою, але заяц пачуў і вялізным скачком шаснуў у кусты, толькі з-пад лап сыпануў у ваду пясок. Уцякла здабыча, але Вячорка і ўзрадаваўся гэтаму — няхай бегае, няхай жыве касавокі!

Праз нядоўгі час на бераг выйшла натапыраная кабаніха, а за ёю высыпалі паласатыя, як жукі, парасяты, якія віскаталі, тоўхаліся лычыкамі, муцілі ваду і ўзрывалі пясок. І зноў у Вячоркі не паднялася рука выпусціць стралу.

А потым затрашчала галлё і непадалёку ад паляўнічага ў ваду, узбіваючы пырскі, усунуўся лось і пачаў гучна піць. Ен стаяў якраз бокам да чалавека. Заставалася толькі кінуць дзіду, і яна ўвап'еццца якраз пад лапатку звера, дзе сэрца. Але Вячорка забыўся на дзіду. Як зачараваны, ён глядзеў на гарбаносую галаву жывёліны, упрыгожаную шырачэзнымі рагамі, быццам растапыранымі пясцямі нейкага велікана, любаваўся дужай постаццю. І міжволі прыйшлі ў рух

Вячоркавы пальцы. Яны апісвалі ў паветры выразны профіль лася, абмалёўвалі яго рогі, спіну, доўгія ногі. У тэту ж хвіліну праз лясную прагаліну засвяціла сонца і адлюстравалася ў рацэ. Сляпуча-чырвонае, як начышчаная медная бляха, пляма пераломвалася і рассыпалася на хвалях.

Скончыўся вадапой, апусцеў бераг, а Вячорка ўсё яшчэ не меў здабычы. І калчан ягоны па-ранейшаму быў туга наладаваны стрэламі.

Дадому Вячорка прыйшоў туляючыся за дрэвамі, каб не трапіцца на вочы родзічам і суседзям. «Зноў з пустымі рукамі»,— пачалі б кпідь з хлопца. Добра, што не было дома і маці — мабыць, збірала шчаўе. Сестры таксама некуды сышлі. Толькі ў куце хаціны ціха пакехкваў глухі і нямоглы дзед.

Вячорка пакапаўся ў лазовым кошыку, выцягнуў з яго кавалак аленевага рога, некалькі крамянёвых разцоў і нажоў. Усё гэта запіхнуў у скураную торбу. Потым зноў выйшаў з вёскі і малапрыкметнай сцежкаю, мінаючы калючы яліннік з выварацямі, падаўся ў пушчу. Там быў даўно ім нагледжаны ўтульны куточак у западзіне паміж двума ўзгоркамі, дзе з-пад каранёў высахлай ад старасці хвоі выбівалася звілістая крынічка. Над крынічнай каля сухастоіны цямнела стрэшкай з яловых лапак павець. Перадёю чакала агню вогнішча.

Вячорка сунуў пад павець торбу, сабраў сухога ламачча, выграб з глыбіні вогнішча некалькі гарачых вуталёў і раздзьмухаў агонь. І як толькі ўгарэлася ламачча, каля суседняга арэшніку зашамацела лісце, і адтуль, дробна валюхаючыся, выбег вожык. Спыніўся воддаль і задраў востры лычык. Вячорка выцягнуў з-за пазухі прыхоплены з сабою леташні жолуд і асцярожна падкінуў яго пад вожыкаву пыску. Звярок абнюхаў жолуд, потым зашчаміў яго ў зубы і зноў патрусіў пад куст. Хлопец засмяяўся ўзрадаваны, што вожык памятае яго і зноў прыбег па ласунак, да якога прывык з самай гэтай вясны.

Вячорка паслухаў лясную litanie рознагалосіцу птушыных спеваў. Паўзіраўся ў адмысловы малюнак трэшчын на голым камлі сухастоіны. Потым сеў каля вогнішча на зялёны ад моху камень і пачаў разаграваць над жарам рог. Калі той размякчэў, Вячорка, мяняючы то нож, то разец, пачаў штосьці выразаць з яго, яшчэ незразумелае чужому воку. Калі рог астываў, тады рабіўся цвёрды, як дуб, і хлопец зноў падсоўваў яго бліжэй да агню.

Пад канец дня Вячорка адчуў голад. Схадзіў на недалёкае балота, назбіраў на качыных гнёздах яек і напёк іх у прыску. Вячэру запіў халоднаю вадой з крынічкі. Потым, калі пачало цямнець, забраўся на хвою, дзе ў расохах з галля быў зладжаны насціл, як уладкавацца

аднаму чалавеку. Прывязаўся да дрэва раменным паскам, каб не зваліцца ноччу, і ўмасціўся спаць.

Назаўтра з самай раніцы Вячорка зноў узяўся за працу. Грэў рог, рэзаў яго разцом, скабліў нажом, падсякаў, дзе трэба, сякеркай. І паступова ў нарыхтоўцы пачаў угадвацца абрыс ласінай галавы. Затым дзюбкай разца хлопец акрэсліў авал звярыных вачэй, пазначыў нарэзкамі поўсць пад сківіцай, яшчэ прайшоўся па контуры вушэй, больш выразнай зрабіў лінію рота. І вось, нарэшце, на вячоркавай далоні ляжала адпаліраваная дробным пясочкам галава звера. І быццам жывыя глядзелі на мастака выпуклястыя ласіныя вочы, цяплом дыхалі шчыліны храпаў, пудка струніліся вушы. І зноў так яскрава ўявіў хлопец таго ляснога прыгажуна, убачанага ўчора на ранішнім вадапоі. І ажно задрыжэў ад шчасця, што яму ўдалося вось на гэтым кавалку рога перадаць воблік звера. Лось, жывы лось нарадзіўся пад пальцамі Вячоркі. І лася гэтага можна трымаць у руках, лашчыць яго гладкую і цёплую галаву!

Вярнуўся Вячорка дадому стомлены, але шчаслівы. Паклаў каля сябе на лежаку ласіную галоўку і заснуў. Прыйшла з градак, дзе выполвала з іншымі жанчынамі ранняе пустазелле, маці, паглядзела на спячага сына, потым заўважыла вырабку. Узяла яе ў рукі і сама залюбавалася. І падумала, што дарма сварылася на сына. Бо лася кожны, толькі б сіла была ў руках, можа забіць, а вось зрабіць з рога такім, быццам жывы, ніхто ў іхняй вёсцы не здолее. Нават у ведзьмара, у якога мноства такіх выразаных з дрэва і рога выяў ласёў, качак, вужоў, якім той маліўся, яны былі горшыя.

Маці ціха, каб не разбудзіць сына, дастала з-пад лежака кошык і пачала перабіраць фігуркі, змайстраваныя сынам раней. Не, сённяшняя была найлепшай!

Не ўцерпела маці і пахвалілася суседкам новай вячоркавай выявай. Назаўтра пра гэта дачуўся вядзьмар і прыйшоў у іхнюю хаціну. Маці завіхалася каля госця, якога і паважалі ў вёсцы і пабойваліся. Бо хто ж не паважае чалавека, які лечыць шэптамі і травамі хваробы і знаецца з духамі. Але чаму і не баяцца таго, хто можа наслаць урок, немач, злыя і цёмныя сілы з-пад старых вываратаў ды з чорнага багнішча. Вядзьмар захоплена цмокаў шчарбатым ротам, аглядаючы ласіную галоўку, а потым папрасіў падараваць яму:

— Усялю ў яе дух Вялікай Ласіцы, нашай прародзічкі, і будзе гэта рэч аберагаць наш род ад хвароб і пошасці, дасць нам уладу над ляснымі жыхарамі.

І як тут не аддасі вырабку, калі гэта трэба для дабра суродзічаў?

А праз нейкі час, калі пайшоў погалас, што ў далёкіх заазёрных паселішчах напаў на людзей мор, вядзьмар папрасіў выразаць драўлянага духа-ахоўніка, які адвёў бы бяду ад іхняй вёскі.

Вячорка некалькі дзён шчыраваў над ліпавай калодай і зрабіў гэтага духа — з глыбокімі вачніцамі, у якія ўставіў белыя камяні, з ашчэранымі, каб напалохаць хваробу, зубамі. І калі выяву ўкапалі перад паселішчам, аказалася, што яна вышэй чалавечага росту. І прыхажалыя з суседніх вёсак жахаліся і падалі перад ёю ніцма.

Узмужнеў Вячорка, а вядзьмар яшчэ пастарэў, стаў хваравітым. І ўсё часцей стаў браць мастакаразьбяра на сваю варажбу і замовы. Казаў яму пра таемную моц розных зёлак, вучыў закляццям, адкрываў таямніцы абыходжання з багамі і духамі. А перад часам, калі трэба было навекі адысці ў Краіну Вялікага Палявання, аб'явіў усім, што духі прызналі Вячорку пасярэднікам паміж сабою і людзьмі.

— Ну дык і няхай ён будзе ў нас за ведзьмара,— згадзіліся вяскоўцы.

І стаў Вячорка ведзьмаром. Стараўся ўсё рабіць на дабро і ніколі нікому не шкодзіў. І людзі любілі свайго ведзьмара і ніколечкі яго не баяліся. Нават дзеці.

*

— Па праўдзе кажучы, такую рагавую галоўку лася мне знайсці не пашанцавала. А вось на стаянках Літвы і Латвіі, дзе, як і на поўначы Беларусі, у новым каменным і бронзавым вяках жылі блізкія па культуры плямёны, яны сустракаюцца, і надзвычай дасканала зробленыя. Мне ж трапілася на старажытным тарфянікавым паселішчы пад Бешанковічамі статуэтка самога лася, але галава ў яго была схематычная. А вось фігуркі людзей знаходзіў цудоўныя — драўляныя і касцяныя, з выразна акрэсленымі тварамі, вялікавокія, барадатыя.

Усе гэтыя скульптурныя выявы, таксама як і арнаменты на посудзе і касцяных вырабах, розныя ўпрыгожанні чалавечага цела і вопраткі, адлюстроўвалі рэлігійныя ўяўленні першабытнага чалавека. Тыя ж статуэткі хутчэй за ўсё адпавядалі вобразам духаў, міфічных герояў, продкаў. Адначасова яны з'яўляюцца і творамі першабытнага мастацтва, бо рабіліся з вялікай любоўю, а нярэдка і талентам.

Заўважана і такая цікавая асаблівасць — у старажытным каменным веку чалавечыя, ці антрапаморфныя, выявы мелі вельмі схематычна выражаныя галовы, пераважна без рысаў твару. У канцы ж каменнага веку і ў эпоху першых металічных вырабаў у

статуэтках найбольш дасканала і рэалістычна выразбленымі робяцца галовы з перадачай індывідуальных рысаў твару.

— А чым гэта тлумачыцца?

— У самай глыбокай старажытнасці, калі пераважала калектыўнае загоннае паляванне, чалавек адчуваў сябе неад'емнай часткай калектыву — першабытнага гурта, а потым — роду. Па-за гуртам нельга было ні пракарміцца, ні збудаваць моцны будан, каб перачакаць лютыя па тых часах зімы. Таму ў старажытным каменным веку індывідуальнасць асабліва не праяўлялася не выдзялялася. Акрамя таго, напачатку людзі не выдзялялі сябе і з жывёльнага свету. Успомнім, што розныя плямёны, як лічылі яны самі, вялі сваё паходжанне менавіта ад жывёл — мядзведзяў, ваўкоў і гэтак далей. Таму тагачаснага чалавека ў суродзіча ў першую чаргу і цікавіла жывёльнае, біялагічнае — здабыванне мяса, прадаўжэнне роду. А вось пазней, з распаўсюджаннем лука са стрэламі, вырасла роля індывідуальнага палявання. Спрытны паляўнічы і без дапамогі мог пакласці самага вялікага звера. Ен мог пратрымацца ў пушчы і адзін! Акрамя таго, у бронзавым веку ўскладнілася гаспадарчая і адпаведна мысліцельная дзейнасць чалавека. Паявіліся адносна заможныя лідэры, нават багатыя сем'і. Чалавек ужо ўсвядоміў сваю вышэйшасць над жывёльным светам, і сваю адметнасць сярод суродзічаў.

ДЗІЦЯЧЫЯ ЗАБАВЫ

«Зубр» кружляў па хмызняку, заблытваючы сляды. Зрабіць гэта было не лёгка, бо на пяску між лазовых кустоў заставаліся не толькі «зубрыныя» сляды, але нават і мышыныя. Таму ён стараўся: то ішоў, адступаючы задам, то бег, пераскокваючы праз ніжэйшыя кусты, то рабіў вялікі скачок убок, затым вяртаўся на ранейшы след. Прайшоўшы па ствале вываратні, нарэшце зашыўся ў куст ядлоўцу і заціх.

Праз нядоўгі час ад рэчкі грымнулі дружныя воклічы, і «паляванне» пачалося.

«Зубр» чуйна прыслухоўваўся, як то набліжаецца, то зноў аддаляецца «паляўнічы загон». І толькі глыбей уцягваў у плечы калматую галаву, калі галёканне чулася зусім побач.

Нарэшце «звер» прыкмеціў, як на прагаліну перад ядлоўцам выйшлі напаўголыя загарэлыя «паляўнічыя», размахваючы лукамі і дзідамі. Яны спыніліся перад паваленым дрэвам, бо след тут прападаў.

Адзін з загона адбегся ўбок і радасна загукаў:

— Знайшоў след! Во ягоны след зноў!

«Зубр» з палёгкаю перавёў дыханне — «паляўнічыя» папаліся на ягоную хітрыку і павярнулі ўбок.

Ішоў час і «зубру», нарэшце, надакучыла сядзець у кусце, дзе яго пачалі апаноўваць авадні. Тады ён набраў у лёгкія пабольш паветра і раўнуў. Галасы «паляўнічых» заціхлі. Загон, бачна, прыслухоўваўся. Тады «зубр» зароў яшчэ раз.

Загон разгарнуўся ў шырыню і пачаў прачэсваць лес у напрамку рыкання, бо знайсці «звера» па слядах страцілі надзею. «Паляўнічыя» зноў выйшлі на прагаліну. Зараз яны кіраваліся проста на ядловец, і «зубр» зразумеў, што яго знойдуць. Падпусціўшы праследвальнікаў як мага бліжэй, ён раз'юшана зароў і кінуўся ўперад. «Звер» збіў з ног бліжэйшага «паляўнічага» і прарваўся скрозь загон. Але калі амаль ужо перабег прагаліну, у бок яму пацэліла страла.

— Мы забілі цябе! — узрадавана закрычалі хлопчыкі, што былі за «паляўнічых».

— А гэта не лічыцца,— спыніўся хлопчык-«зубр», падымаючы з пяску цацачную стралу.— Каб я не падаў голас, вы б мяне не знайшлі!

— А вось і знайшлі б!

— І не знайшлі б!

Спрэчка разгаралася і магла б скончыцца бойкаю, каб не прыбег, засопшыся, яшчэ адзін хлопчык.

— На Чырвоным беразе дзяўчаткі!— замахаў ён рукамі.— Нешта лепяць.

— Нападзём на іх,— тут жа рашылі хлопчыкі.— Быццам мы воіны з чужога племені!

Там, дзе рака рабіла крутую луку, вада падмывала высокі ўзгорак. У ім пад пяском агаляўся пласт тлустай чырвонай гліны. Таму, мусіць, бераг і зваўся «Чырвоным».

Дзяўчаткам, якія зараз там былі, таксама хацелася пагуляць, як і іх аднагодкам хлопчыкам. І яны любілі пабегаць, пападскокваць, пашукаць на дрэвах птушыныя гнёзды, нацягаць з-пад берага ракаў. Але пераважна ў іх гульні былі свае, не хлапчукоўскія. Яны не забаўляліся ні ў паляўнічых, ні ў вайну, не майстравалі лукаў і не ганяліся адна за адной з самаробнымі дзідамі. Дзяўчаткі найчасцей гулялі ў гаспадынь, ляпілі што-небудзь з пяску, падкідалі і лавілі каменьчыкі, рабілі з ласкуткоў лялькі ці плялі з кветак вянкі. А зараз яны прыйшлі на Чырвоны бераг, каб наляпіць з гліны цацачнага посуду. Яны выдзіралі з берага камякі вільготнай гліны і штукавалі з іх розныя гаршчэчкі і кубачкі. А некаторыя рабілі цацачных каровак. Гатовыя вырабы клалі на санцапёк, каб высахлі.

Хлопчыкі кустоўем непрыкметна падкраліся да Чырвонага берага, а затым з ваяўнічымі крыкамі кінуліся ўперад:

— Вайна! Вайна! Мы захапілі вас у палон!

Дзяўчаткі спачатку былі перапалохаліся, але, калі ўбачылі, што напаснікі — малеча з іхняй жа вёскі, нарвалі крапівы і кінуліся абараняць свае цацкі.

— Крапівой — гэта не па праўдах,— апраўдваліся адзін перад адным хлопчыкі, у спешцы пакідаючы «поле бою».— Каб не крапіва, то была б наша перамога.

Смылелі абджыганыя плечы і ногі, і гэта быццам надало дураслівцам разважлівасці. І ўсе яны раптам дружна ўспомнілі, што ўжо захацелася есці, што маці прасілі нарваць травы парасятам, што тамусяму было загадана прыглядзець за малымі брацікамі і сястрычкамі, а некаму бацька казаў не адыходзіцца ў лес. Успомніўшы пра гэта, прыцішанай грамадою падаліся дадому.

Перад самай вёскай, абгінаючы рачную затоку, натрапілі на качыны выводак. Качаняты, якія яшчэ не ўмелі лётаць, порстка кінуліся ў траву, а хлопчыкі з вясёлым смехам пачалі іх лавіць.

— Хапай сталую кацку! — раптам картава залемантаваў найменшы з хлопчыкаў.— Яна ланеная!

І праўда, маці-качка трапяталася ў траве і ніяк не магла ўзляцець. Хлопчыкі пакінулі ў спакоі птушанят і кінуліся да яе, бо гэта была лепшая здабыча. І калі ўжо некалькі рук працягнулася, каб схапіць птушку, яна нязграбна ўзнялася на крыло і адляцела крокаў на дзесяць убок. Так паўтаралася некалькі разоў. Вось, здаецца, . ужо зловяць качку, але яна збіралася з сіламі і напаўлёту ратавалася ад праследавальнікаў. Нарэшце яна ўзнялася па-сапраўднаму, неяк своеасабліва закракала і паляцела над балотам.

— Дык гэта ж яна прытваралася. Ад малых адводзіла,— расчаравана даўмеліся хлопчыкі.

Вёска была побач, і хутка яны ўжо былі дома.

*

— Тут пытанняў няма,— адклаўшы апошнюю старонку, сказаў Іван Пятровіч,— у дзяцінстве і мы так забаўляліся.

— Толькі замест «паляўнічых» і «зуброў» былі найчасцей «партызаны» і «немцы».

— Ну, такі быў час... Але я ўсё чакаю, калі ты мне, нарэшце, выкладзеш асноўны змест бронзавага веку на Беларусі, мовячы анатамічна — шкілет, на які нарастаюць «мышцы і скура» тваіх запісаў. Ісці ў бібліятэку і капацца ў адпаведных кнігах па гэтаму пытанню мне

зараз бракуе часу. Так што, калі ты сёння яшчэ не вельмі стомлены, то я цябе паслухаў бы. Можаш і ў самым сцісдым выглядзе. Думаю, для мяне будзе дастаткова.

— Бронзавы век таму так і называецца, што паявіліся бронзавыя вырабы. Але іх, як ты ўжо ведаеш, на Беларусі было зусім мала. Таму крэмень па-ранейшаму заставаўся асноўнай сыравінай для прылад працы. Для гаспадаркі бронзавага веку характэрна паўсюднае распаўсюджанне жывёлагадоўлі і земляробства. Апошняе было звязана з высяканнем і выпальваннем лесу — на нашых зарос лых пушчамі землях інакш было нельга. Аднак важную ролю адыгрывалі і спрадвечныя заняткі — паляванне, рыбацтва і збіральніцтва. Людзі ў гэты час навучыліся рабіць каменныя шліфаваныя сякеры з прасвідраванымі для рукаятак адтулінамг, ляпілі пласкадонны гліняны посуд, аздабляючы яго разнастайнымі арнаментамі.

Адбыліся істотныя змены і ў светапоглядзе тагачаснага чалавека. Распаўсюдзіліся рэлігійныя культы, звязаныя з абагаўленнем нябесных свяцілаў, плоднасці зямлі, жыццёвай моцы раслін і жывёл. Такім чынам, светапогляд адлюстроўваў змены ў гаспадарчых занятках, звязаныя з узрослай роллю жывёлагадоўлі і земляробства. Гэтыя два заняткі, а таксама дарагія бронзавыя вырабы прывялі да назапашвання ў руках асобных родаў ці нават сем'яў лішкаў рэчаў і прадуктаў. Такім чынам, зараджалася маёмасная няроўнасць. Λ ы я ж земляробства і жывёлагадоўля пачынаюць выстаўляць на першае месца ў чалавечай супольнасці мужчын. Ім належыць зараз першае слова ў вырашэнні грамадскіх спраў, у пытаннях наследавання маёмасці.

Бронзавы век на Беларусь пачаўся ў самым пачатку другога тысячагоддзя да нашай эры, калі сюды пранікла насельніцтва культуры шнуравой керамікі, ва ўжытку якога ўжо былі некаторыя металічныя вырабы.

— А што ў дадзеным выпадку трэба разумець, пад паняццем «культура»? — перабіў мяне Іван Пятровіч.

— Пад археалагічнай культурай мы разумеем сукупнасць рэшткаў жыццядзейнасці людзей пэўнага перыяду на акрэсленай тэрыторыі — жытло, прылады працы, упрыгожанні, посуд, а таксама асаблівасцей іх светапогляду, выяўленага ў пахавальным абрадзе, арнаментах, культавых рэчах. Мяркуецца, што археалагічныя культуры ад люстр оўваюць колішняе існаванне розных этнічных груп насельніцтва, напрыклад, старажытнейшых славян, балтаў, германцаў.

Прышлыя «шнуравікі» сутыкнуліся з мясцовым позненеалітычным насельніцтвам і працяглы час з ім суіснавалі. Такое суседства прывяло да ўтварэння ў сярэдзіне другога тысячагоддзя сярэднябронзавых

культур. Сярод іх важнейшымі лічацца тшцінецкая і сосніцкая культуры, помнікі якіх займаюць паўднёвую Беларусь. Дарэчы, носьбітаў гэтай першай часам звязваюць з непасрэднымі продкамі славян. Поўнач Беларусі ў пачатку бронзавага веку засялялі плямёны паўночнабеларускай культуры. Яны тут былі спрадвечныя, яшчэ з неаліту. «Шнуравікі» толькі злёгку іх «падфарбавалі». У канцы бронзавага веку нашу тэрыторыю засяляла насельніцтва культур, асноўнае развіццё якіх прыпадае на наступную эпоху — ранні жалезны век, які пачаўся каля сёмага стагоддзя да нашай эры.

ЧОРНАЯ СМЕРЦЬ

Неяк у час далёкай паляўнічай вандроўкі натрапілі на лясное возера. Берагі яго былі пясчаныя і светлыя, а навакол распасціраліся багатыя непалоханай дзічынай лясы і балоты. У возеры ажно кішэла ад рыбы. І галоўнае, сюды яшчэ не траплялі людзі — нідзе не было ні чалавечых слядоў, ні межавых метаў-засечак на дрэвах. Мясціна, адным словам, была зручная для жылля, таму сюды і перасялілася некалькі сем'яў.

Спачатку на азёрным беразе зладзілі пару хацін. Праз гады, калі падраслі дзеці і завялі свае сем'і, вёсачка пабольшала. Так і жылі, не маючы вялікіх клопатаў, з палявання на дзічыну і рыбнай лоўлі. Расчысцілі, выпалілі чарназёмную прыбалаць і пачалі сеяць на ёй ячмень. У загародах трымалі такую-сякую свойскую жывёлу. У берагавых восыпах часам знаходзілі крэмені, з якіх рабілі прылады працы. Калі ж крэменю не хапала, майстравалі наканечнікі стрэлаў і кінжалы з костак. Абыходзіліся ўсім сваім, але сувязей з роднымі мясцінамі, дзе жылі іншыя роды іхняга племені, не перарывалі. Там засталіся родзічы, адтуль бралі жонак, туды выходзілі замуж.

Хоць рэдка, але ў паселішча на лясным возеры прыходзілі ў адведкі і госці, асабліва зімой, калі замярзалі рэчкі і балоты.

Але вось зараз і зіма канчаецца, а ніхто штосьці не наведваецца сюды. Занепакоіліся азёрцы, каб што там не здарылася з іхнімі родзічамі. Можа, якая вайна пачалася з суседнімі плямёнамі? Пачакалі яшчэ з тыдзень і выправілі ў шлях трох маладых мужчын, каб даведацца, што там робіцца на шырокім свеце.

Цэлы дзень ішлі азёрцы замерзлай ракой. Вечарам зрабілі на беразе прытулак з ялінавых лапак. абклалі яго снегам. Было цесна, але даволі цёпла. У ім і пераначавалі.

Назаўтра павярнулі ўбок, у заснежаную пушчу, і ўжо пад абед дабраліся да высокіх рэдкалесых узгоркаў і з аднаго з іх убачылі далёка ўперадзе белую звілістую палосу ў шырокай нізавіне — замерзлую і заснежаную раку, каля якой і жылі іх родзічы.

Сярод зімы надарылася некалькі адліг, таму снег быў аселы і цвёрды. Ішлося легка. А зараз, калі да мэты заставалася не так і шмат, азёрцы яшчэ прыспешылі крок.

Паніжэла. Сталі трапляцца замеценыя снегам рачулкі і балотцы-старыцы. Але чым бліжэй падыходзілі трое мужчын да ракі, тым больш пачыналі трывожыцца — навокал было поўна звярыных слядоў, цэлыя сцежкі. І ні аднаго чалавечага!

Няўжо тутэйшыя людзі так цэлую зіму невылазна і праседзелі на рацэ, харчуючыся рыбай, што лавілі пад лёдам? Хіба ў пушчы не ставілі на ласёў самастрэлы, сілкі на зайцоў, не ганяліся за лясной дзічынай з лукам і дзідай? Не, тут штосьці было не так...

І каля самай вёскі не было чалавечых слядоў. І ні дымку нідзе, ні голасу, ні сабачага брэху. Толькі за спіной азёрцаў трывожна гуў у вяршалінах дрэў вецер.

Праз хмызы выбраліся на прыбярэжны чысцяк і спыніліся. Перад імі была вёска. Вастраверхія хаціны, накрытыя трыснягом і карой, цясніліся ўздоўж берага побач з пахільымі вербамі.

Падышлі да крайняй хаціны. Пад плеценыя з лазы і ўцепленыя скурамі дзверы намяло гурбу снегу; і даўно, бо быў зляжалым. Давялося дрэўкам дзіды разбіваць яго на кавалкі і адкідваць убок. Нарэшце ўдалося прыадчыніць дзверы,і адзін з азёрцаў усунуўся ў шчыліну. Яго вочы з цяжкасцю разгледзелі ў паўзмроку заледзянелае агнішча, нізку лісіных скурак пад страхой, лежакі ўздоўж сцен, а на іх — людзей. І калі ўгледзеўся ў твары людзей, з жахам выскачыў з хаціны:

— Яны мёртвыя! Іх забіла Чорная смерць!

Пры гэтых словах азёрцы кінуліся бегчы з паселішча, быццам за імі гнаўся статак раз'юшаных зуброў. І толькі на ўскрайку пушчы супыніліся, выцягнулі з-пад вопраткі драўляныя фігуркі духаў-ахоўнікаў, сталі шаптаць закляцці.

Калі аддыхаліся і страх крыху прайшоў, бо ад вёскі былі ўжо далекавата, старэйшы азёрац запытаў у таго, што быў у хаціне:

— А ты не памыліўся?

— Каб я не пабачыў сваіх бацькоў! У іх былі пачарнелыя твары, усе ў язвах!

— Што ж будзем рабіць? — непакоіўся трэці азёрац.— Чорная смерць падкрадаецца нябачна. Ідзе ад вёскі да вёскі і няма ад яе ратунку. Дзед расказваў, як калісьці вось так вымерлі ўсе людзі з

суседняга роду. Да апошняга чалавека. І ў іншых родах яна шмат каго забрала. Выжыў толькі той, хто адразу ўцёк у пушчу. А далей на поўнач увогуле была апусцела зямля... І як мы зараз вернемся дадому? Яна будзе красціся па нашых слядах і прынясе пагібель і ў нашу вёску. Яна ж ужо на руках у Лася, бо ён заходзіў у хаціну!

Лось здрыгануўся і памярцвелымі вачамі паглядзеў на свае рукі, быццам на іх ужо былі знакі непапраўнай бяды. Астатнія ж азёрцы пацісінуліся ўбок ад яго,— ужо асуджанага, аддадзенага Чорнай смерці.

— Я ведаю паратунак,— рашуча прамовіў старэйшы.— Чорная смерць баіцца агню. Яна адступае перад ім. Так казаў наш вядзьмар.

Трэннем двух кавалкаў сухога дрэва азёрцы здабылі агонь і расклалі вогнішча. Затым на пашкоджаных хваёвых камлях назбіралі жывіцы і паклалі яе на полымя. Смала плавілася і з трэскам гарэла, а мужчыны пачалі ўторкваць у гаручую жывіцу канцы стрэл і выпускаць іх па хацінах. Стралялі, слаба нацягваючы цеціву, каб у хуткім палёце не збівалася полымя. Стрэлы паволі апісвалі высокую луку, пакідаючы за сабою дымны след, і ўпіваліся ў чаратовыя стрэхі. Успыхнула адна хаціна. Затым другая. Хутка занялася агнём і дымам уся веска. Аднекуль прыбег здзічэлы сабака і па-ваўчынаму завыў, гледзячы на пажар.

Калі агонь увабраўся ў самую моц, з трэскам і гулам пажыраючы чалавечае жытло, Лася пакінула здранцвенне. Не развітваючыся, толькі кінуўшы на былых таварышаў затуманены пагляд, ён, хістаючыся, павольна рушыў да агню. Астатнія ж азёрцы зніклі, не азіраючыся, у пушчы.

Вярталіся мужчыны дадому кружным шляхам, заблытваючы сляды. Некалькі разоў на сваім шляху раскладвалі вогнішчы і пераступалі праз агонь. І невядома, што дапамагло, але на гэты раз бяда мінула вёску на далёкім лясным возеры.

*

— Тут, як медык, я магу цябе і дапоўніць. Эпідэміі хвароб ажно да нядаўняга часу былі страшэнным бічом чалавецтва. Напрыклад, у чатырнаццатым стагоддзі ад чумы вымерла амаль палова насельніцтва Еўропы. Хвароба, пачаўшыся на Далёкім Усходзе, праз Кітай і Індыю вясной 1347 года трапіла ў Еўропу. У Італіі, напрыкладз тысячы жыхароў тады выжываў толькі дзесятак. Думаю, што ў бронзавым веку было не лепш.

— Адкуль жа яно магло быць лепш? Лячыліся ж толькі травам і ды замовамі. Можа толькі эпідэміі не так лютавалі, бо рэдкае было

насельніцтва, розныя групы яго мала паміж сабой кантактавалі. Ды і без эпідэмій бяды хапала. Каля пасёлка Краснасельскага на Росі ў адной крэменездабыўнай шахце было знойдзена пахаванне мужчыны. Ці не супляменнік гэта быў старога Крэма? Па костках вызначылі, што небарака пакутаваў запаленнем зубоў, меў адклады солей у хрыбетніку, а памёр, бачна, ад нейкага захворвання костак. Не кажу ўжо, колькі разоў пры жыцці хварэў з прастуды!

МАЛЫ ГАСПАДАР ТАРФЯНІКАВАЙ ВЁСКІ

Старэйшыя разышліся хто куды. Мужчыны пабралі мярэжы і паплылі за выспы — гэткай парой там збіраліся касякі сялявы. Жанчыны пайшлі на затоку збіраць паспелыя вадзяныя арэхі. Падлеткі таксама былі занятыя — хто пасвіў жывёлу на прыазёрнай лугавіне, хто дапамагаў старэйшым, а некаторыя падаліся ў грыбы. Веташок таксама з ахвотаю пайшоў бы ў лес — ён ужо нагледзеў добрую баравіковую мясціну, але бацькі не пусцілі, сказалі: «Будзь з малымі, пільнуй селішча». І яшчэ розных абавязкаў надавалі, а самі пайшлі.

Веташок пакрыўдзіўся і з самай раніцы сядзеў у хаціне, стругаў крамянёвым ножыкам палачку і наракаў на свой нешчаслівы лёс. Было ціха і нудна навокал, ажно пакуль не трапіла ў павуцінне муха і не пачала басавіта гудзець. Хлопец схапіў галінку і пачаў шастаць у цёмным куце; муха змоўкла. Але яна хутка зноў абрыдліва заныла, і тады Веташок выйшаў на вуліцу. І ў пару: з-за суседняй хаціны выбег крываногі і замурзаны малы і закрычаў:

— Парасяты ўцякаюць! Нудна-санлівы настрой як рукою зняло. Веташок кінуўся за малым і ўбачыў, што віславухі парсючок ужо весела рыў лычам дзірван за загарадай, а пад зламаную жэрдку ціснуўся на волю ягоны брат. Астатнія таксама, рохкаючы, мітусіліся побач, шукаючы выйсця са свайго зняволення.

Веташок спехам паправіў жэрдку, улупіў дубцом парасятам, каб супакоіліся, і кінуўся да віславухага, растапырыўшы рукі. Малыя, а іх у вёсачцы было з паўдзесятка, узяліся дапамагаць Веташку. Парсючок жа падумаў, што пачынаецца вясёлая забава, і з падскокам паімчаў паміж хацін. Шум і вэрхал распачаўся навакол — крычалі і смяяліся дзеці, вісказалі парасяты, брахаў і рваўся з прывязі сабака. І ніяк таго віславухага не ўдавалася злавіць, бо нават, калі яго хапалі за вушы, ён вырываўся з дзіцячых рук.

І тады хлопец даўмеўся, што рабіць. Ен прынёс з бацькоўскай хаціны старую, але яшчэ моцную сетку. Яе расцягнулі паміж будынкамі і загналі ў пастку свавольніка.

Усадзіўшы ўцекача ў загараду, Веташок загадаў дзецям назбіраць парасятам травы. Гэтыя ловы парсючка, які мог збегчы ў лес проста ў зубы ваўку ці рысі,— што б тады ён вечарам сказаў старэйшым — абудзілі ў хлопца пачуццё адказнасці. Зараз ён адчуваў сябе чалавекам, які павінен клапаціцца і пра малых, і пра парсючкоў у загарадзе, і пра сабаку.

Веташок прайшоўся берагам каля вёсачкі, выцягнуў з вады суседскага хлопчыка, што яшчэ слаба хадзіў, а ў возера вось ужо папоўз, шлёпнуў яго за гэта пару разоў ніжэй спіны. Затым наказаў дзецям, каб не адыходзіліся ў лес, бо там можна заблудзіцца. Навёўшы парадак на дварах і вулачцы, зазірнуў у адну хаціну, другую — што дзеецца там. У трэцяй, апошняй, якая стаяла пад лесам, учуў пах дыму.

Дымам пахла ў кожнай закуранай хаціне, да таго ж у агнішчах у тоўстых пластах попелу захоўваліся гарачыя вуглі, якія, каб распаліць агонь, выграбалі з глыбіні і раздзьмухвалі. Але тут пахла моцна і асабліва — гарэлым торфам.

Прыгледзеўся — з агнішча клубочкамі выкочваўся рудаваты сыры дымок. Старым дрэўкам ад дзіды хлопец паварушыў у попеле, і яно некачана легка пайшло ўглыб. Адтуль вылецелі іскры, і дыму адразу паболела.

Веташок жахнуўся — агнішча прагарэла і агнём узяўся торф, на якім і было збудавана іхняе паселішча! Тарфяны пажар страшней за лясны. Лясны праносіцца, як віхура, але хутка і абтухае. Торф жа будзе тлець і гарэць ажно да позніх восеньскіх дажджоў, да зімы. Выгарае ён у глыбіні, і тады ў вогненныя ямы правальваюцца людзі, жывёла, абсоўваюцца хаціны.

Ад страху ажно ворах прайшоў па спіне хлопца, і ён, ухапіўшы гліняны гаршчок, які трапіўся пад руку, пабег да возера, але хутка зразумеў, што адзін ён тут нічога не парадзіць. Тады сабраў дзяцей, даў кожнаму ў рукі, каму — глінянае, каму — берасцяное начынне, і загадаў насіць ваду. Сам жа стаў каля агнішча, не падпускаючы малых блізка да пажару, пераймаў напоўненыя пасудзіны і ліў ваду ў дымны правал. У прагарыне шыпела. Адтуль уздымаліся клубы дыму і пары. Спачатку не было і знаку ад тушэння. Але паступова дыму стала менець і, нарэшце, пад самае паўдня, калі дзеці ўжо выбился з сіл, выгарына напоўнілася вадою і агнішча стала выглядаць, як брудная лужына.

Пасля абеду вярнуліся жанчыны, прынеслі поўныя торбы вадзяных арэхаў. І засталі яны някормленых парасят, якія ажно разрываліся ад віскату, і страшэнна выбруджаных і мокрых дзяцей. Кінуліся былі жанчыны лаяць Веташка, але, даведаўшыся, што адбылося ў вёсачцы, толькі ўзмахнулі рукамі і сталі цалаваць хлопца: « Ну і малайчына, Веташок!»

Назаўтра мужчыны вычарпалі з выгарыны чорную, змешаную з попелам і торфам жыжку, прынеслі з недалёкага ўзгорка зямлі і засыпалі яму. Потым надралі са старых ялін кары, намасцілі яе, зверху насыпалі тоўсты пласт пяску, каб агонь зноў не дабраўся да торфу. Так было зроблена новае агнішча. А ўжо жанчыны паклалі на агнішча сухіх дроў, у арнаментаванай магічнымі знакамі адмысловай пасудзіне прынеслі ад суседзяў жару і пад рытуальныя спевы і заклінанні адрадзілі, вярнулі да жыцця агонь. І наварылі вялізны, які толькі меўся, гаршчок толькі што злоўленай сялявы, і першаму рыбы паклалі Веташку.

З таго часу, калі дарослыя надоўга пакідалі паселішча, амаль заўсёды даручалі сачыць за парадкам Веташку. І ён больш не аднекваўся. Калі чоўны адплывалі далека на возера, хлопец паважна абыходзіў вёсачку, аглядаў кожны закутак і абавязкова зазіраў ў хаціны, супыняўся каля агнішчаў і прынюхваўся — ці не пахне паленым торфам.

*

— Магу сказаць,— не ўцерпеў я пахваліцца, калі Іван Пятровіч скончыў чытанне,— што менавіта такое агнішча з пясчанай падсыпкай і вымасткай з пластоў кары мне давялося раскопваць са сваімі памочнікамі-школьнікамі на адной тарфянікавай стаянцы каля вёскі Асавец Бешанковіцкага раёна. Спачатку нават не мог зразумець, што гэта за такое мноства кары, ажно пакуль не натрапіў на попел і вугалі. Каля агнішча ляжалі раздушаныя вялізныя гаршкі. Іх удалося склеіць. Дык вось, у адным гаршку былі рэшткі жалу доў, у другім — падсмажаныя вадзяныя арэхі. Непадалёку ляжаў плоскі камень з гладкім канавападобным паглыбленнем. На ім паліравалі і вастрылі каменныя, а можа і бронзавыя прылады. Калі прадоўжылі раскопкі ў бакі, выявілі кавалкі нахільных жэрдак, што ўтваралі каркас двухсхілай страхі. З гэтага мы і заключылі, што трапілі якраз на рэшткі хаціны.

Не кажу ўжо, колькі ў ёй знайшлі рознага дабра — крамянёвыя і касцяныя наканечнікі стрэлаў і дзідаў, нажы і кінжалы, сякеры і долаты, гарпуны і рыбалоўныя кручкі. Трапіліся гліняныя грузілы да

сетак, берасцяныя паплаўкі, касцяныя лыжкі, драўляныя палонікі і мноства іншых рэчаў. На гэтай жа стаянцы мы знайшлі ўпрыгожанні з зубоў і прывазнога балтыйскага бурштыну, а таксама творы першабытнага мастацтва, пра што я ўжо крыху казаў — статуэткі людзей, птушак, жывёл і змей. І наогул, выявіць старажытную стаянку пад торфам — велізарная ўдача для археолага, бо ў бедным кіслародам асяроддзі захоўваюцца рэчы з арганічных матэрыялаў — дрэва, кары, костак, рога, нават з травы. А на звычайных стаянках, размешчаных на пясчанай паверхні, могуць уцалець толькі вырабы з каменю і гліны.

— А як усё гэта трапіла пад торф? Гэта была веска на с лупахпалях пасярод возера?

— Не, у нас пакуль што такіх паселішчаў не знойдзена. Тут уся справа ў кліматычных зменах. К сярэдзіне бронзавага веку наступілі дажджлівыя часы, узровень. вады ў азёрах пачаў паступова павышацца. Людзі перасяліліся на сушэйшыя мясціны, а затопленыя рэшткі іх ранейшых стаянак з часам затарфаваліся.

ПАСЕЛІШЧА НА ВЫСПЕ

Цямнела і паблісквала на паўднёвым небакраі з самай раніцы, але Буркун на гэта асабліва не зважаў. Дажджы лілі недзе далека, а ў вірку пад лазовым кустом надта ж добра сёння лавіліся акуні. На траве ляжаў ужо доўгі дубец з нанізанымі рыбінамі.

Захапіўшыся, хлопец і не прыкмячаў, як пачала падымацца ў рацэ вада, як яна ўядалася ў бераг, падмываючы старую хвою. Калі вада падступала да самых ног Буркуна, ён узбіраўся па касагору вышэй і зноў закідваў вудачку, сплеценую з воласу конскага хваста.

Але вось рыба перастала кляваць. З плёскатам абсунуўся ў ваду бераг. Тады хлопец агледзеўся і ўбачыў, жахнуўшыся, што мыс, на якім ён вудзіў, ужо ператварыўся ў выспу, адрэзаную ад берага хуткай плынню. Рака ўвачавідкі разлівалася, затапляючы нізіны-абалоны, поплаўныя грывы, падступала да далёкага лесу. Бачна там на поўдні ішлі нечуваныя дажджы, таму і пачалася паводка.

Вада ўжо панесла дубец з акунямі, запенілася ў каранях хвоі. Вось ужо і зусім не стала сухой мясціны. Тады Буркун палез на дрэва. Усеўся на таўсцейшых суках і з вышыні са страхам глядзеў на разбушаваную раку.

Зараз, калі ён сядзеў у бяспечнейшым месцы, адчуў, як смокча пад лыжачкай. І тады пашкадаваў, што паводка змыла ўлоў. Праўда,

вуду сваю ён не кінуў, захапіў на хвою. Але зараз рыба не лавілася. Відаць, яна адчула вялікую змену ў рацэ. Ей таксама стаў не даспадобы нязвыклы імпэт плыні, і яна зашылася ў свае сховы. Таму на злоўленага шэрага авадня Буркун ледзь, увудзіў невялікую верхаводку, якую адразу ж з'еў.

Крыху пазней Буркун адчуў, як закружылася галава і небакрай пачаў абсоўвацца некуды ўніз. Хлопец ашчаперыў камель, каб не ўпасці, але ўсё адно адчуваў, што апускаецца разам з дрэвам. Яно, падмытае, пачало хіліцца на глыбізну. Вада забурліла ў голлі, запенілася, неадольная плынь падхапіла хвою, закруціла і панесла па рацэ. Буркун то акунаўся ў ваду з галавою, калі рака перакручвала дрэва, то зноў разам з хваёвым камлём вынырваў на паверхню, адплёўваючыся ад вады. Нарэшце, калі дрэва вынесла на сярэдзіну ракі, яно набыло ўстойлівасць і роўна паплыло на ўсход, дзе ўжо пачало вечарэць неба.

Ноч была месячная, і ўся вадзяная прастора ў прывідным святле поўні выглядала бясконцай. І хлопцу часам думалася, што рака затапіла ўсю зямлю, як, па словах старасвецкіх паданняў, ужо калісьці здаралася. І толькі месячная сцежка на вадзе, быццам насыпаная блішчастай луской, няпэўна абнадзейвала выратаваннем.

Несла рака вывернутае дрэва і ўвесь наступны дзень. У пачатку трэцяга дня хвоя падплыла бліжэй да берага і засела на плыцізне. Вада ўпёрлася ў вывараць, злуючыся, што тая не слухаецца, але не адолела сарваць з месца. Паводка бачна пайшла на спад, і моц яе паслабела. Духі вадзяных стыхій, што вырваліся з бяздонняў на волю, трацілі сваю ўладу.

Буркун не спаў мінулыя ночы, быў стомлены і галодны і ўжо абыякавы да ўсяго. Але калі дрэва запынілася, ён узбадзёрыўся і перабраўся на вышэйшыя сукі, каб агледзецца, памеркаваць — можа ўжо можна як вырвацца з гэтай рачной пасткі.

Непадалёку з ракі выступала вялікая выспа з лесам на ніжэйшым краі і вёскай на прырэчным схіле. За вёскай святлела дасьпяваючай збажынoю поле. Каля берага, бліжэй к лесу, пасвіўся статак. Сушэйшым часам выспа, мусіць, злучалася з лесам нейкім перашыйкам, але зараз была ўся акружана вадой.

Нават стома прапала ў Буркуна, так ён расхваляваўся — зусім блізка людзі! Яны былі на беразе каля выцягнутых на сухое чоўнаў. Угледзеўшыся, хлопец нават пачаў адрозніваць загарэлыя твары. Хто яны, гэтыя незнаёмыя з паселішча на выспе? Буркун ведаў, што ў суседніх вёсках жывуць людзі адной з ім мовы, адных багоў і звычаяў. Але чуў таксама, што ніжэй па рацэ — чужое і загадкавае племя, з

якім не радніліся, а часам і варагавалі. Што рабіць яму? Клікаць на дапамогу, або датрымацца да цемры, украсці човен і паспрабаваць даплысці да родных ваколіц? Але сярод хацін хлопец прыкмеціў сабак і засумняваўся — яны ўчуюць чужака і ноччу. Тады яго зловяць і заб'юць, як злодзея.

Пакуль Буркун разважаў, што яму рабіць, у вёсцы прыкмецілі на вываратні чалавека, і ад берага адплылі чоўны. У іх былі мужчыны з вёсламі. На дно даўбёнак — хлопец гэта прыкмеціў добра — яны паклалі дзіды, а ў некаторых за спіною былі лукі. Падплыўшы да самага дрэва, мужчыны прыпыніліся і пачалі насцярожана ўглядацца ў гушчыню галін і лісця, вышукваючы іншых затоеных чужакоў. І тады хлопец кінуўся ў ваду. Ён рашыў лепш утапіцца, чым трапіць у рукі гэтых суровых незнаемых людзей, і цёмная вада з плёскатам стулілася над ягонай галавой.

Ачнуўшыся, Буркун зразумеў, што ляжыць на нечым мяккім, а моцныя рукі, прыпадняўшы галаву, уліваюць яму ў рот штосьці смачнае і цёплае. Па смаку пазнаў, што гэта грэтае малако. Прыадплюснуў вочы, і першымі ўбачыў жаночыя рукі, якія яго паілі. На запясці адной з іх паблісквaў вузкі бранзалет. Расплюшчыў вочы больш і сустрэўся з поглядам шэрых вачэй пажылой жанчыны. Вочы былі прыязныя, ад іх рабілася спакойна і добра.

Жанчына штосьці ціха сказала і пагладзіла хлопца па галаве. І ад гэтага дотыку ён зноў заплюшчыў вочы.

Спаў ён доўга. А калі прачнуўся, адчуваў сябе ўжо даволі акрыялым.

Выратаванец хутка папраўляўся. Яго кармілі пшанічнымі праснакамі з мёдам, адпойвалі малаком. Драпіны на целе прамывалі рамонкавым адварам. Убачыўшы, што яму не робяць благога, хлопец асмялеў, абвыкся. З большага пачаў разумець і гаворку тубыльцаў. У іхняй мове траплялася даволі шмат звыклых для яго слоў, пра іншыя ж здагадваўся па сэнсу.

Праз пару дзён Буркун выйшаў на вуліцу, каб агледзецца, куды ён трапіў.

Веска складалася з пары дзесяткаў паўзямлянак з нізкімі плеценымі з лазы сценамі, якія пакрываліся зверху двухсхільнымі чаратовымі стрэхамі. Стрэхі трымаліся на слупах, укапаных па кутах паўзямлянак. Шчыліны пад стрэхамі і ў сценах былі закладзены мохам, замазаны глінай, каб зімою не заходзіў у жытло холад. У паўзямлянкі можна было трапіць праз нізкія праёмы-дзверы, завешаныя скурамі або старымі радзюжкамі. Побач было і нешта накшталт плеценых з

саломы дзвярэй — для халоднага часу. У сценах жа знаходзіліся і невялікія шчыліны — вокны.

Каля хацін былі жардзяныя выгарады. Мяркуючы па слядах, у іх ноччу трымалі жывёлу. Тамсям на калах сохлі свежа памытыя пласкадонныя гліняныя гаршкі і збаны. Такі ж посуд захоўваўся і пад невялікімі павецямі, напоўнены рознымі каранямі, арэхамі, зернем.

На першы погляд жытлы былі бязладна раскіданыя па схіле. Але, калі прыгледзецца, можна было заўважыць, што большасць іх цісну-лася да берага. Тыя ж, што размяшчаліся вышэй, утваралі другую лінію. Ад кожнай будыніны адыходзілі ўтаптаныя сцежкі, якія зліва-ліся ў адну шырокую, што перасякала ўсё паселішча. З усходняга боку яна вяла да вузкай затокі пад вербамі, дзе знаходзіліся чоўны-даўбёнкі, прывязаныя да дрэў або выцягнутыя на пясок. Заходні канец сцяжыныв вуліцы выводзіў за вёску і раздвойваўся. Пакуль што менш пратаптаны шлях зварочваў да яшчэ нязжатага поля, раскапычаны — на пашу.

Можа найбольш Буркуну спадабалася, што ўся веска была абкружана плеценым з тоўстых сукоў плотам. Вастраколіны тырчэлі вышэй чалавечага росту і зводдаль усё гэта нагадвала зубастыя пашчэнкі вялізнага шчупака. Праз такі плот-агароджу не пералезе ні звер, ні чалавек.

Каля краю вёскі, побач з агароджай, стаялі вялікаватыя будыніны на слупах з рэдкаплеценымі сценамі без гліняной абмазкі. У адной з іх Буркун заўважыў развешаныя рыбацкія сеткі, мярэжы і іншыя снасці, кошыкі з лазы і саломы, розныя драўляныя вырабы, запасы лыка, цэлыя і бітыя гаршкі, леташнюю салому. Словам, гэта былі і кладоўкі і, мусіць, сховішчы для корму жывёле на зіму.

На краі паселішча, каля невялікай вытаптанай пляцоўкі, хлопец убачыў і зусім дзіўную будыніну — круглую з вастраверхім чаратовым дахам. Над уваходам у яе бялеў рагаты чэрап быка. Буркун зазірнуў у цёмны дзвярны праём будыніны і адхіснуўся — там стаяла мажная жанчына і ва ўпор глядзела на яго. Стаіўшыся пад сцяной, хлопец прыслухаўся, але ў круглай будыніне ніхто не крычаў, не лаяўся. Там было ўсё ціха. Тады ён рашыў зноў зірнуць на тое дзіўнае стварэнне. І зараз зразумеў, што жанчына была драўляная, выразаная з тоўстага камля. Яна трымала на круглым сваім жываце плоскія рукі і была аплеценая і абвешаная рознымі стужкамі, матузкамі, свежымі і за-сохлым! вянкамі з кветак і дзеразы. Вакол выявы паўкругам ляжалі каменныя зерняцёркі.

Раптам за спіною Буркуна пачуўся шум. Ен азірнуўся і ўбачыў, што да яго подбегам спяшаецца гаспадыня. У яе былі застылыя ад

сполаху вочы. Падбегшы, яна азірнулася па баках, схапіла хлопца за руку і пацягнула прэч.

— Сюды нельга. Гэта бажніца — хаціна нашай Вялікай Маці, якая апладняе зямлю і дае нам на полі пшанічнае зерне. У бажніцу нельга заходзіць тым, хто пакланяецца іншым багам. Убачаць светары — будзе бяда!

А яшчэ праз дзень сівабародыя мужчыны вёскі — паважаныя старэйшыны — папыталіся ў Буркуна, хоча ён застацца тут, стаць сынам іхняга роду, ці будзе вяртаццададому.

Вядома ж, хлопец толькі і думаў аб вяртанні. Дома і вёсачка малая, і хаціны цяснейшыя, зробленыя з жэрдак ды трыснягу, і пшаніца дае драбнейшае зерне, і бронзавых вырабаў амаль няма, але ж там бацькаўшчына. Там тата і мама, яшчэ жывая бабуля, браты і сестры, навокал блізкія і далёкія ро. дзічы. Ды і кожны куст і дрэва там свае, знаёмыя. Не, ён вернецца, калі толькі яго адпусцяць.

Хлопца выслухалі са зразуменнем. А адзін з дзядоў падняў уверх палец і глыбакадумна сказаў:

— Кожная птушка з выраю вяртаецца ў сваё гняздо.

Выбралі большы човен, селі ў яго дужэйшыя мужчыны з вёсламі, пасадзілі на карме Буркуна і павеславалі ўверх па рацэ. Буркун трымаўся левай рукою за борт і не мог уцярпець, каб часам не кінуць захоплены погляд на запясце. Там пабліскваў на сонцы медны бранзалецік. Гэта быў падарунак ад тутэйшых людзей.

*

— Усё гэта адбывалася на Прыпяці,— не чакаючы пытанняў Івана Пятровіча пачаў тлумачыць я.— І час можна прыблізна вызначыць — каля сярэдзіны другога тысячагоддзя да нашай эры. У басейне гэтай ракі ў той час знаходзіліся даволі шматлікія вёскі плямёнаў так званых сосніцкай і тшцінецкай культур. Ім належыць, напрыклад, большасць крамянёвых і бронзавых сярпоў, знойдзеных на Палессі. Ва ўжытку носьбітаў гэтых культур меліся характэрн ыя пласкадонныя гаршкі з цюльпанападобным расшыраным верхам і патоўшчанымі брыжамі. У арнаментах гаршкоў часта сустракаюцца адбіткі рабра пласцінкі з накручаным шнурам — ружанцавы ўзор. Бадай, найбольш істотнае адрозненне ў посудзе культур у тым, што на ўсходзе Палесся, дзе былі сосніцкія тіасеціішчы, ён арнаментаваўся поўнасцю, а на цэнтральным і заходнім Палессі, у тшцінецкім асяроддзі — толькі пад верхам. У чым справа? І тады звярнулі ўвагу, што такая традыцыя ўпрыгожвання керамікі — па ўсёй паверхні ці толькі пад верхам — існавала тут яшчэ сярод

позненеалітычных плямёнаў. Значыць, каля паўтысячы гадоў суіснавалі абарыгены і прышэльцы, ажно пакуль у сярэднебронзавы час іхнія культуры не сплавіліся ў адно. Ва ўмовах багністага Палесся, дзе жыццё канцэнтравалася на ізаляваных выспах пасярод балот, месцамі доўга захоўваліся традыцыі познекаменнага веку. Мусіць, з такога «адсталага» паселішча і паходзіў Буркун.

— Слухаю цябе і думаю,— сказаў Іван Пятровіч,— адкуль у вас, археолагаў, такія назвы культур?

— Самі выдумляем. Бо даведацца пра сапраўдныя найменні старажытных плямёнаў дапісьмовага часу немагчыма. Яны зніклі, забыліся, замяніліся новымі. Называем жа археалагічныя культуры пераважна па першаму выяўленаму найбольш важнаму помніку — паселішчу або могільніку, па тэрыторыі распаўсюджаннЯу па тыповых знаходках. Сосніцкая культура названа па стаянцы каля пасёлка Сосніца на Чарнігаўшчыне, а тшцінецкая — па паселішчу каля горада Тшцінец у Польшчы.

ХТО УКРАЎ СЕТКУ?

З самай раніцы, як толькі бледнаваты яшчэ круг сонца прыўзняўся над заазерным лесам, бацька з сынам селі ў човен і паплылі паглядзець настаўленую з вечара сетку-трыгубіцу. Малы Рэмза любіў такія хвіліны — калі падплываеш да таго месца, дзе пастаўлена снасць, і ўжо здалёк бачыш, як уздрыгваюць, разганяючы кругі дробных хваль, берасцяныя паплаўкі. Значыць, трапіла ў лубяныя ячэі здабыча. А калі паплаўкі ходзяць хадуном і плёскат стаіць над трыснягом, лічы, што трапілася буйная рыбіна — хітры шчупак ці вусаты чорны сом.

Спудзіўшы чараду качак, рыбакі выплылі з трыснягу і моцна здзівіліся — сеткі не было. Толькі плаваў воддаль кол.

— І куды яна падзелася? — разгублена паўтараў бацька.

І праўда, дзе знікла трыгубіца? З іхняй вёскі ўкрасці ніхто не мог, бо тут былі ўсе свае, суродзічы, а забраць у свайго лічылася смяротным грахом. Значыць, чужак? Але ж на гэтым возеры больш вёсак не было. А чужаку, калі ён сюды і трапіў, трэба мець човен, каб прыплысці да сеткі.

Бацька пачаў кружыць каля трыснягу і час ад часу грэбаў вяслом па дне. Спадзяваўся, што, можа, якая вялікая рыбіна сарвала з калоў снасць і тая дзе пад вадой зачапілася за корч. Пакуль так боўталіся ў вадзе, сонца добра павышэла і пачало прыграваць. І тут на беразе

ўсчаўся нейкі крык. Устрывожаныя рыбакі павярнулі да вёскі і налеглі на вёслы.

А неспакой узнік у Баравіне з-за мядзведзя. Там у дуплах старых хваін ужо здаўна пладзіліся пчолы, і людзі чакалі канца лета, каб выбраць соты. Рабілі яны гэта ўжо шмат гадоў і берaглі гэты прыродны пчольнік. І нават выдзяўбалі ў дрэвах новыя дуплы, каб пчолы множыліся і раіліся. Мядзведзі ж былі ласыя на мёд не меней, чым людзі. Вось і зараз яны там спрабуюць увабрацца ў салодкую спажыву.

Калі прыплылі да берага, бацька таксама схапіў дзіду і з іншымі мужчынамі пабег у пушчу. Сын жа рашыў яшчэ пашукаць прапажу. Але зараз аднаму на возеры было ніякавата. Нават і страшна, бо можа і праўда дзе ў прыбярэжных хмызах затаіліся чужакі. Не мядзведзі ж выцягнулі з возера сетку. Таму хлопец паклікаў на дапамогу свайго стрыечнага брата Сыраежку.

Браты ўладкаваліся ў чоўне і пачалі заграбаць каля бартоў вёсламі, стараючыся, каб даўбёнка ішла роўна, не збівалася ўлукаткі. Веславалі не спяшаючыся. Пільна аглядалі азёрную роўнядзь, зазіралі ўглыбіню, абшуквалі вокам каля кожнага прыбярэжнага куста, спадзеючыся прыкмеціць прапажу.

Адплыўшыся так, што хаціны іхняй вёскі сталі выглядаць маленькімі, як купіны на балоце, хлопцы прыпыніліся і сталі радзіцца, што рабіць далей. Бліжэйшы бераг быў агледжаны.

— Паплывём вунь туды,— паказаў уперад Сыраежка.

— Тата сказаў пад паўночны бераг не плаваць,— нерашуча запярэчыў Рэмза.

— Ну дык хоць агледзім той мысок,— прапанаваў Сыраежка. Ен не чуў гэтай забароны, таму быў смялейшы.

Павагаўшыся (мысок быў усё ж далекавата ад іхняй вёскі), Рэмза згадзіўся, і яны павеславалі далей. І аказалася, што правільна і зрабілі, бо не паспелі даплысці да таго мыска, як Рэмза ўхапіўся за братаву руку:

— Зірні, вунь пад берагам быццам паплаўкі!

Падгрэблі бліжэй. І сапраўды, хутка перад кустом, што рос на краі абрывістага берага, добра разгледзелі пару паплаўкоў. А пад імі ў мутнаватай прыбярэжнай вадзе праступілі абрысы вяроўкі і самой сеткі.

— Во дзе наша прапажа! — узрадаваўся Рэмза і ўхапіўся за вяроўку. Узяўся дапамагаць яму і Сыраежка. Спачатку трыгубіца выбіралася легка. Але потым пайшла цяжэй. Абмацаўшы і агледзеўшы сетку, хлопцы зразумелі, што яе нешта трымае пад самым берагам. Там пад вадой цямнела невялікая нара. У ёй і знікаў другі канец снасці.

Напяліся мацней, і сетка паддалася, але потым тузанулася і затрапятала ў руках.

— Сом! Сом! — закрычалі браты і яшчэ шчырэй налеглі на снасць. Ажно ўпацелі, пакуль вызвалі яе з нары, і тады нешта вялікае і чорнае матлянулася ўбок. Човен моцна хіснуўся, і хлопцы ледзьве не выкінуліся ў ваду.

— Бі вяслом па ім! — закрычаў Сыраежка.

Рэмза размахнуўся, але ў гэты момант даўбёнка зноў хіснулася і ён, страціўшы раўнавагу, улупіў вяслом па сябруку. Той узмахнуў рукамі і боўтнуў у ваду.

— Мазіла!— выплёўваючы ваду, вынырнуў Сыраежка.— А каб я табе так!

— А ці я хацеў? — апраўдваўся Рэмза, дапамагаючы яму ўлезці ў човен.

Пакуль хлопцы спрачаліся, тое чорнае яшчэ тузанулася ў сетцы, мільганула хвастом і знікла ў глыбіні. Браты толькі паспелі яшчэ прыкмеціць вусатую морду і кароткія вушы. Гэта быў не сом. У трыгубіцу, ганяючыся за рыбай, трапіла была, мусіць, выдра.

— Вось табе і сом,— моршчыўся Сыраежка, мацаючы на лбу свежы гуз.

Прыплылі з парванай сеткай у вёску хлопцы. Вярнуліся мужчыны з Баравіны. Мядзведзя яны не ўпалявалі, але пастрашылі добра. Хай ведае, касалапы, як лазіць у чужы мёд.

Рэмза і Сыраежка пражылі доўгі век. Колькі рыбы нацягалі за гэты час з возера! Лавілі сеткамі і мярэжамі, а часам і на вуду, начапіўшы на касцяны гачык чарвяка ці жыўца. Лавілі рукамі каля карчоў, сакамі ў прыбярэжнай асацэ, заганялі ў нераты, глушылі даўбешкамі па першым лёдзе. Білі гарпунамі з чоўна ноччу, асвятляючы сонную рыбу лучынай. Калолі яе восцямі вясновым нерастам. Але як лавілі таго «сома» ў трыгубіцы, не забываліся праз усё жыццё.

*

— Мінулы раз пытаўся, чаму так называюцца археалагічныя культуры, а вось зараз падумаў: а як з імёнамі? Ты іх у сне ўспамінаеш?

— У снах маіх пераважна толькі відовішчы. Асобныя воклічы, гукі чую, але каб запомнілася якое імя, бывае рэдка.

— А шкада. В яд омы выпад ак, калі ад на жанчына ў такім, як у цябе, стане начала размаўляць на незразумелай мове. Не паспелі запісаць — было гэта даўно і ў глухой мясціне,— але мяркуюць, што

ёй, магчыма, успомнілася нейкая старажытная мова. Уяўляеш, каб ты склаў слоўнік мовы жыхароў Беларусі бронзавага веку?!

— Уяўляю,— усміхнуўся я.

— Дык, выходзіць, імёны ты выдумляеш?

— Выдумляю, — прызнаўся я.— Але не абы-як, а ведаючы, што першабытныя людзі імёны заўсёды і ўсюды давалі па нейкіх індывідуальных асаблівасцях, па часе нараджэння, па назвах жывёл і птушак. Зыходзіў і з таго, што ў тыя часы на тэрыторыі Беларусі жылі продкі пазнейшых славян і балтаў і размаўлялі на індаеўрапейскіх дыялектах. Таму для імёнаў стараўся падбіраць карані агульна індаеўрапейскіх ці хоць бы старажытнаславянскіх слоў. Вось таму ў мяне і з'явіліся ўсе гэтыя Крэмы, Жданы, Вячоркі, Веташкі, Туры.

КОННІК З ПАЎДНЕВЫХ ГОР

Гэтага вершніка пастухі прыкмецілі яшчэ зводдаль ад вёскі. Але ніхто не затрывожыўся і не кінуўся хапацца за зброю. У іхніх краях даўно ўжо было заспакаенне, і людзі жылі ў згодзе паміж сабою. Дробныя ж непаразуменні на межах родавых ці племянных уладанняў стараліся ўлагодзіць мірна. Таму і зараз не баяліся нападу. Да таго ж коннік быў адзін.

Пад'язджаючы да вёскі, незнаёмец заспяваў. Лясное шматгалосае рэха драбніла і рассыпала словы, і іх было не разабраць. А можа, песня была і на незразумелай мове. Але не гэта было важна. Усім стала ясна, што чалавек прыбывае з прыязнымі намерамі і, каб не было неспадзяванкі, падае пра сябе знак. І тое менавіта, што песняй, а не воклічамі, асабліва спадабалася тубыльцам.

Мякка затупалі на пясчанай сцежцы конскія капыты, і незнаёмец уехаў у вёску. Насустрач яму высыпалі амаль усе жыхары — выбеглі няўрымслівыя дзеці, нетаропка наблізіліся паважныя мужчыны, зводдаль цікавалі дзяўчаты і жанчыны.

Вершнік сядзеў на прысадзістым даўгагрывым коніку, на калматай скуры, прывязанай пад бруха жывёліны вяроўкай. Такая ж вяроўка з петлямі звісала і пабаках каня. У петлі-страмёны былі прасунуты ногі падарожніка ў скураных чобатах. Незнаёмец быў апрануты ў рудыя фарбаваныя штаны з авечай воўны і ў белую рубашку з завязкамі-матузкамі на шыі. На плячах меўся шэры суконны плашч, зараз па цёплым часе расшпілены і закінуты на спіну, іншай жа парою ім можна было шчыльна ахінуцца, хаваючыся ад дажджу і холаду. Меў коннік і такую-сякую зброю. Збоку вісеў лук і скураны

калчан з дзесяткам стрэлаў, з-за спіны востранька выглядала кароткая дзіда. На поясе быў кінжал з касцяной рукаяткай.

Конь і чалавек былі густа присыпаны пылам і выглядалі нeяк аднолькава шаравата. Адзінае, што нязвыкла кідалася ў вочы мясцовым жыхарам,— блішчасты бранзалет на запясці вершніка. Металёвыя вырабы ў тутэйшых мясцінах былі рэдкасцю. Мала хто меў меднае шыла ці спрацаваны да рэшты нож. Слаўны воін, паляўнічы ді чыя жонка маглі зрэдку пакрасавацца начышчанымі меднымі трубачкамі або пласцінкамі, што сонейкамі ззялі ў каралях сярод звыклых ласіных ці мядзведжых зубоў. А тут шырокі, мо ў два пальцы, бранзалет з закручанымі ў спіралі канцамі!

Незнаёмец зняў з цёмнавалосай галавы лямцавую шапку з загнутымі краямі і пакланіўся грамадзе:

— Вітаю вас, мудрыя старэйшыны гэтага роду, і ўсіх паважаных прысутных таксама.

— Будзь прывітаны і ты, чалавеча,— адказалі яму старэйшыны.— Рады бачыць цябе ў нас госцем. Хто будзеш, адкуль прыехаў і куды трымаеш шлях?

— Я з гор, адкуль цякуць паўднёвыя прытокі ў вашу Прыпяць. Мяняю вырабы з медзі і бронзы на бурштын. А магу, каму трэба, пераплаўляць старыя і ламаныя металёвыя рэчы на новыя.

Старэйшыны ўхвальна заківалі галовамі. Медзь і бронза ім патрэбныя, а бурштыну ў таго-сяго знойдзецца.

Незнаёмца правялі на пляц пасярод вёскі, на краі якога ў засені старога дуба хавалася драўлянае лупавокае божышча. Чалавек злез з каня, адвязаў ад скуранога сядзення мяшок і расклаў на шмаце палатна свой тавар. Тут было некалькі кінжалаў з узорыстымі рукаяткамі, нажы, шылы, драцяныя бранзалеты, пацеркі для караляў, падвескі, каб уплесці ў косы ці ўпрыгожыць дзявочы каптурок... У захапленні загарэліся ў жанчын вочы не толькі ад гэтых упрыгожанняў, але і калі ўгледзелі выгінастыя бронзавыя сярпы з кручком на рукаятцы, якія не даваў руцэ саслізгваць у час жніва.

І разгарэлася мена. Неслі тубыльцы свае бурштынавыя пацеркі, падвескі, трубачкі, гузікі, якія ажно свяціліся цудоўнымі мядовымі колерамі. Так, бурштынавыя ўпрыгожанні — адмысловыя. Яны можа не горшыя за медныя. Да таго ж аберагаюць ад хвароб і благога вока. Таму жыхары вёскі за так не аддаюць бурштын гэтаму смугляваму меншчыку. Прышэлец у сваю чаргу набівае цану сваім , рэчам, падстаўляе кінжалы начышчанымі лёзамі пад сонечнае святло, і тыя ўспыхваюць жоўтымі праменьчыкамі.

— Ты толькі зірні і сябе ўбачыш,— падсоўваў ён пад нос аднаму са старэйшын бронзавы выраб.— У чым ты яшчэ паглядзішся?

— У чым? Нават і ў лужыне, калі захачу палюбавацца сваёй барадою,— хітра жмурыцца старэйшына, а сам і сапраўды зачараваны кінжалам. Яму б такі!

Нарэшце мена скончылася. Меншчык зноў склаў у мяшок сваё багацце. Акуратна прыхаваў набыты бурштын.

Вячэраць госця запрасілі ў прасторную хату першага старэйшыны роду. Туды ж прыйшло і некалькі паважнейшых жыхароў вёскі. Кожнаму хацелася, пацягваючы з гліняных кубкаў шыпучы мядовы квас, паслухаць аповяды пра далёкія землі, іншыя плямёны. Гэты меншчык шмат чаго бачыў і чуў, вандруючы па берагах вялікіх і малых рэк паміж гарамі і іхняй балоцістай нізінай.

Цёмнавалосы таксама быў з цікаўных. Ен усё распытваў, дзе тубыльцы бяруць бурштын. А вяскоўцы і не таіліся. Расказвалі, што, калі плысці суседняй прытокай уверх, або ісці яе берагам, то за лясістым водападзелам можна трапіць на раку, што цячэ ў паўночным кірунку. І вось з той паўночнай ракі і прывозяць мядова-колерную смалу. А скуль яе там бяруць, ніхто добра не ведае. Некаторыя расказваюць, што недзе там на поўначы маецца салёнае возера, такое вялікае, што не бачна другога берага. І каля таго возера бурштыну столькі, што не ўкладзеш і ў дзесяць такіх вось, як у меншчыка, мяшкоў. Ім там можна пэўна напоўніць па барты некалькі вялікіх чоўнаў, і ўсё адно шмат застанецца...

Слухае меншчык гэтую ні то праўду, ні то казку, і загараюцца ягоныя вочы — так хочацца ў тыя паўночныя землі! Поўны човен бурштыну яму не трэба — не давязе да сваіх гор, а вось каб наміняць пад завязку свой мех...

— А ці прывозяць з паўночных рэк медзь і бронзу?

— Не, не прывозяць. Не чутно там пра такія рэчы,— закруцілі галовамі прысутныя.

Яшчэ больш радуецца ад такіх слоў цёмнавалосы. Значыць, там за свой тавар ён узяў бы бурштыну, колькі захацеў...

Раніцою, яшчэ туман не сплыў з нізін і не высушыла сонца расу, нецярплівы меншчык зноў уладкаваўся на хрыбціне адпачылага за ноч каня і выбраўся на сцежку ўздоўж прытокі. Сонца грэла якраз у правае плячо. І гэта было добра. Значыць, рэчка яго вядзе правільна, на поўнач, у бурштынаносныя землі.

Пад вечар, адолеўшы ладны кавалак шляху, коннік заўважыў, што зноў набліжаецца да заселеных мясцін. Пачалі трапляцца старыя і

свяжэйшыя кострышчы, пянькі ссечаных дрэў, вытаптаныя чалавечымі нагамі рыбнейшыя берагі каля рачных завоін.

Цёмнавалосы зняў з шапкі наліплае павуцінне, строе з плячэи ігліду — рыхтаваўся сустрэць тубыльцаў у найлепшым выглядзе. А потым па сваёй завядзёнцы заспяваў, даючы пра сябе знак. І амаль адразу ж пачуў характэрны посвіст аперанай стралы. Стралялі з-за ракі.

Меншчык імпэтна скаціўся з каня і прыхінуўся за хваёвыя камлі. Потым знайшоў лісіную нару і засунуў туды мяшок са сваім скарбам. Вернецца за ім, калі пазнаёміцца з недаверлівымі мясцовымі жыхарамі, растлумачыць, хто ён такі.

Потым цёмнавалосы зноў наблізіўся да берага і загукаў, асабліва пакуль што не высоўваючыся з-за дрэў:

— Не страляйце, я адзін! Я меншчык з гор!..

У вёсцы на беразе Прыпяці, дзе начаваў цёмнавалосы, яшчэ доўга ўспаміналі вясёлага меншчыка і ўсё чакалі — калі ж ён вернецца з тых паўночных краёў і ці запыніцца ў іхнім паселішчы на адпачынак. Цікава было і паглядзець — ці шмат прывязе бурштыну, ці паўнюткі будзе мяшок, як хваліўся.

Але мінулася лета, потым і восень, а цёмнавалосага меншчыка ўсё не было. А зімою, калі завейныя снягі засыпалі, замялі сцежкі і прагаліны, перасталі чакаць.

*

— Тут у цябе недакладнасць,— торкнуў Іван Пятровіч пальцам у апошнюю старонку.— Страляць, г эта ж са стрэльбы.

— Ніякай недакладнасці,— не пагадзіўся я.— Услухайся і ўдумайся: вяслуюць вяслом, сякуць сякерай, страляюць стралой... У сярэднявеччы вынайшлі агнястрэльную зброю, але з яе працягвалі «страляць», новага слова не прыдумалі. Дарэчы, у маёй роднай вёсцы скажуць: не пацэліў, а ўлучыў, як у даўнейшы час — «улучыў з лука».

— А і праўда,— здзівіўся сябра.— Размаўляеш і ўсё здаецца звыклым і простым. А ўдумаешся, які глыбокі сэнс часам у словеI

— І глыбокі і старажытны. Вось яшчэ табе прыклад. На Палессі, каб дрэва вырасла тоўстае, яму яшчэ малому адсякалі вяршаліну. І такое тоўстае, камляватае дрэва звалі «крамлёным». Яго «крамлілі» жалезнай сякерай, але ж нейкія тры тысячагоддзі назад «крамлілі» крэменем. Можа, адсюль і «крэмль» — умацаванне з крамлёнага дрэва? Такія ж карані можна знайсці не толькі ў мове, але і ў звычаях, фальклоры, народным прыкладным мастацтве. На раннебронзавых гаршках з таго ж Палесся маюцца арнаменты, дакладна як на блузках сённяшніх паляшучак.

КРАМЯНЁВЫ СЕРП ДЛЯ КАЛІНКІ

Закаласіўся, а потым і запалавеў ячмень на невысокім грудку, што падступаў да вёскі, і жанчыны пачалі рыхтавацца да жніва. Чакала праца і мужчын — знесці снапкі ў паселішча, перацерці каласы, каб дастаць з іх зерне. Потым зерне трэба будзе перавеяць на свежым ветры, каб ачысціць ад мякіны, ссыпаць у вялікія, як цабэркі, гаршкі. І нарэшце, упарадкаваць салому.

Але зараз нейкі тыдзень, а калі задажджыцца, то і дзесятак дзён будуць вольныя. Таму мужчыны намерыліся ісці на вялікае паляванне, каб назапасіць мяса на мазольную працу — на жніво і малацьбу.

Вечарам, калі елі забеленае малаком варанае шчаўе, бацька папярэдзіў Жыўка:

— Заўтра з раніцы нікуды не адлучайся — будзем рабіць стрэлы.

Папраўдзе, Жывок збіраўся з сябрамі лавіць на затоцы рыбу, але і майстраваць стрэлы не менш цікава. Да таго ж, калі сказаў бацька, адмаўляцца не выпадала, таму хлопец згодна кіўнуў галавой.

Раніца была як на пачатак жніўня — цёплая і пагодлівая. Сонца прыўзнялося над лесам, і доўгія цені дрэў леглі на возера.

Бацька з сынам пайшлі пад сцяну хаціны, дзе ў зацішку ляжалі патрэсканы ліпавы кругляк, некалькі плоскіх камянёў. Бацька дастаў са схованкі назапашаныя крамянёвыя жаўлакі і ўзяўся рабіць пласцінкі і адшчэпы — нарыхтоўкі для наканечнікаў.

— Паспрабуй і ты,— прапанаваў ён сыну.

Але ў Жыўка спачатку не пайшло. З-пад аджымніка адляталі то зусім дробныя, не да патрэбы, адшчэпікі, то расколіна закручвалася, і на пясок падалі нязграбныя дзюбастыя пласціны. З ночы яшчэ была няўпэўненая рука, а можа, і быў няўважлівы, бо ўсё зіркаў на затоку, дзе плёхала, разганяючы кругі па вадзе, рыба, у якой было самае ранішняе жыраванне.

— Не, ты мне так увесь крэмень папсуеш,— адабраў бацька аджымнік.

Бацька левай рукой прыціснуў жаўлак да кругляка, правай прыставіў да яго вастрак казулінага рога, упёр плячо ў рог і націснуў. Ад сіняватага крэменю адскочыў трохкутны адшчэп. Затым ён прымерыўся з другога боку — атрымалася доўгая пласцінка. Бацька працаваў не спяшаючыся, акуратна. І пад яго рукамі акруглы жаўлак са збітай вяршыняй паступова ператвараўся ў тонкі стажкаваты кавалак з гладкімі, быццам паліраванымі, гранямі.

Жывок збіраў пласцінкі і адшчэпы і складаў іх на кавалак бяросты.

— Адшчапі, тата, доўгую пласціну, і каб яна была выгнутая,— папрасіў ён.

— Навошта табе? Згубіў, можа, нож?

— Не. Але каб была, як серп.

Бацька выбраў большы жаўлак, скалоў з яго боку бялявую крэйдавую скарынку і пасля некалькіх спроб адшчапаў патрэбную пласціну. Жывок паклаў яе асобна.

— Хопіць паку ль што,— сказаў, разгінаючыся над кругляком, бацька і адклаў рог-аджымнік убок.

Крыху адпачыўшы, бацька з сынам узяліся за выраб саміх наканечнікаў. Яны шчыльна мацавалі ў трэшчынах кругляка пласцінкі і каменьчыкамі-рэтушорамі адколвалі ад краёў нарыхтовак маленькія лусачкі — рэтушавалі іх. Апрацаваўшы так адну бакавіну, браліся за супрацьлеглую. Потым абрабілі верхнія канцы, стараючыся, каб яны атрымаліся спічаста завостранымі. Знізу рабілі чаранкі-насады.

Паступова меншала гурбачка нарыхтовак, і наадварот — даўжэў на бяросце радок гатовых ліставатых наканечнікаў. Жывок таксама прынаравіўся да рэтушавання, і ў яго пачало атрымоўвацца мала горш, чым у бацькі. Да таго ж такой справай ён ужо займаўся не раз.

— Колькі іх там? — нарэшце запытаўся бацька.

Жывок узяўся пералічваць.

— Два дзесяткі і шэсць.

— Дык і хопіць,— падсумаваў бацька.— Дзесяткі тры ёсць яшчэ старых. А з гэтымі разам будзе на некалькі паляванняў. Каб кожная страла трапіла ў цэль, то, ого, колькі б займелі дзічыны! А зараз зробім колькі і баявых наканечнікаў. Могуць спатрэбіцца, бо прыбалотнікі пачынаюць заходзіць і ў нашу пушчу. Каб не пасунуліся яны і далей.

Жывок ведаў, што для баявых наканечнікаў падыходзяць трохкутныя адшчэпы. Доўгай і тонкай рэтушшу, якая робіцца адмысловым націскам рэтушора, трэба апрацаваць бакавіны, каб атрымаліся вострыя пільчастыя краі. Затым неабходна было ў падставе зрабіць глыбокую выемку, тады наканечнік набудзе трохкутна-шыпастую форму, як ліст павою.

Ліставатыя наканечнікі ўжываліся на паляванні. З забітай жывёліны такая страла лёгка выцягвалася, і яе можна было ўжыць зноў. Форма ж баявога наканечніка — калючая, куслівая. Вострыя шыпы ледзь не самі ўпіваюцца. Ранены выцягне з цела дрэўка, а наканечнік зачэпіцца шыпамі за мышцы і астанецца, вярэдзячы рану ўсё жыццё. І будзе мучыцца нябога — не павярнуцца рэзка, не пабегчы. Так мучаецца цяпер Жыўкоў дзядзька. Ды і ў бацькі на сцягне глыбокая рана, аброслая дзікім мясам — даставалі такі шыпасты наканечнік...

— Можаш ісці пагуляць,— праз нейкі час дазволіў бацька,— я тут і сам закончу.

— Я яшчэ паспрабую зрабіць серп,— і Жывок узяўся за вялікую пласціну.

Ён накрыў сваё калена кавалкам калянай скуры і рубам прыціснуў да яе пласціну. Затым лёгкімі ўдарамі каменнага яйкападобнага адбойніка пачаў сколваць з доўгіх бакавін невялікія адшчэпы. Стараўся, каб падчэска атрымоўвалася з абодвух плашчынь. Затым пачаў прытупляць краі рукаяткі.

Бацька краем вока часам пазіраў на сынавыя практыкаванні і, нарэшце, не вытрымаў, папытаўся:

— І каму ты так стараешся — маці, ці каторай сястры?

Жывок змоўчаў і толькі ніжэй нагнуў галаву. Бацька пра нешта быццам здагадаўся і цішком заўсміхаўся ў густую бараду.

— Дай зірнуць, што ў цябе атрымоўваецца... Нішто выходзіць, нішто. Толькі вось тут круглей трэба,— і сваім адбойнікам тамсям падправіў выгін ляза.

І так пайшло — сын шчыраваў над сярпом, а бацька час ад часу падпраўляў няўдалыя або недаведзеныя мясціны. Затым краі вырабу паверх сколаў апрацавалі буйной зубчастай рэтушшу, і серп атрымаўся на захапленне. Ляжаў на жыўковай далоні доўгі і выгнуты, як месячны маладзічок.

Пакуль сын любаваўся вырабкай, бацька схадзіў у хаціну і прынёс мяккі скураны пасак. Абкруціў ім акуратна рукаятку, каб крэмень не рэзаў руку, завязаў сухажылінай.

— Ну вось, ты ўжо і сярпы ўмееш рабіць,— пахваліў бацька, як скончылі працу.

— Я адзін і не змог бы так.

— Ну, не кажы. Я, лічы, толькі пару разоў дакрануўся,— жмурыў вочы бацька.— А наступны ты і зусім сам змайструеш.

Пад вечар, калі сонца ўжо перайшло на заходні небакрай, Жывок быў у чоўне. Адплыўшы за трыснёг, ён закінуў вуду і агледзеўся. На азёрнай затоцы-луцэ ён быў не адзін. Там-сям цямнелі іншыя чоўны — наступаў час вечаровай лоўлі рыбы. Але Жыўку не рупіла зараз рыба. Ен не пільнаваў паплаўка, а ўсё ўзіраўся ў супрацьлеглы бераг, дзе пад бухматымі вербамі тулілася вёска суседняга роду. Выцягнуўшы пару акунькоў, хлопец паволі павеславаў уздоўж берага, робячы выгляд, што выбірае рыбнейшую мясціну, а сам прыбліжаўся да тых вербаў. Непадалёку ад іх, пераплыўшы густы чарот, падагнаў човен да берага і прыхаваў яго ў трыснягу. Сам жа, падкасаўшы штаны, выбраўся на сухое і затаіўся ў лазняку.

Недалёка ад яго схову на прыбярэжных камянях жанчыны і дзяўчаты мылі вопратку, намочваючы яе ў вадзе і шчыра выбіваючы плоскімі палкамі,— толькі ляцелі ў бакі пырскі ды часты стук плескачоў рассыпаўся рэхам па вадзе.

Нарэшце жанчыны скончылі выбіванне, выкруцілі вопратку, сабралі яе і панеслі ў вёску. Крыху адстаўшы ад іх, ішла дзяўчынападлетак са светлымі косамі, закінутымі за спіну. Калі дзяўчына параўнялася з лазняком, Жывок выйшаў на чысцяк і паклікаў:

— Калінка, пачакай!

Дзяўчына спуджана ўскінула бровы і спынілася. Але адразу ж * пазнала, што гэта быў Жывок, які часта прыплываў праз луку ў іхнюю вёску, дзе была замужам ягоная старэйшая сястра.

Жывок, хвалюючыся, наблізіўся да дзяўчыны і нясмела працягнуў крамянёвы серп.

— Вазьмі. Сам рабіў...

— Ой, які харошы,— сказала дзяўчына і прыціснула серп да грудзей. А потым засаромлена пачырванела і пабегла ў вёску.

А жанчыны, што падгледзелі ўсё гэта, казалі між сабою: «Вось і вырасла з Калінкі нявестка ў Залукоўе. Глядзіш — налета і сваты адтуль прыплывуць».

*

— Карацей кажучы,— зрабіў выснову Іван Пятровіч,— Жыўку ў любым выпадку трэба было шукаць будучую жонку ў нейкім суседнім паселішчы, бо ў сваім былі ўсе паміж сабою родзічы.

— І нават не проста ў суседнім, а ў тым, дзе жылі людзі іншага роду. Бо калі род быў вялікі, ён дзяліўся на некалькі патрыярхальных сямей, кожная з якіх пасялялася ў сваей вёсцы. Іншыя роды таксама мелі вёскі. Група радоў утварала племя. Пры нейкіх канфліктных сітуацыях з суседзямі плямёны аб'ядноўваліся ў саюзы.

Асноўная ўлада ў родзе і племені належала ўсяму даросламу насельніцтву. Яно і вырашала важнейшыя справы. Кіраваннем займаліся выбарныя роды старэйшын або асобныя старэйшыны. У час вайны выбіраліся і правадыры.

— Так. А што гэтым сярпом мелася жаць Калінка?

— Ды шмат што — пшаніцу, ячмень, проса, гарох. У бронзавым веку таксама ўжо вырошчвалі лён, каноплі, мак, рэпу, цыбулю, часнок. Мусіць, зараджалася і садоўніцтва — пры раскопках на стаянках сустракаюцца костачкі сліў, вішань. Ды і статак свойскай жывёлы быў, амаль як сёння.

ЗЕМЛЯНЫ КАНЕЦ ТУРА

Тур загінуў так, як і годна загінуць лепшаму паляўнічаму і сапраўднаму мужчину,— з дзідай у руках.

У самым канцы лета, нарэшце, настаў вольны ад палявой работы — жніва і малацьбы — час, і мужчыны вырушылі на паляванне. Так зачакаліся гэтай жаданай падзеі, што сабраліся ў лес нават некаторыя старыя і падлеткі. Але лепшыя паляўнічыя, якіх узначальваў Тур, рашылі — каму так не церпіцца паспытаць паляўнічага шчасця, хай палазіць па прыазёрным балоце, дзе маладыя качкі і гусі ўжо набраліся тлушчу. Яны ж самі пойдуць у грабавыя і дубовыя лясы, дзе пры ўдачы можна ўпаляваць такую здабычу, пра якую будзе помніцца ўсю зіму.

І сапраўды, у гэтых лясах на выгрэтых сонцам прагалінах адразу пачала трапляцца змятая і аб'едзеная трава, раскапычаная, з памётам. Тут пасвілася, нагульвала мяса даўно непалоханая дзічына. Загон паляўнічых праз дубняк выйшаў на старую выгарыну ў нізавіне, пасярэдзіне якой цёк ручай з вышмарганым мядзведзямі малліннікам на берагах. І каля самага таго ручая, на мурожным лужку, нечакана наткнуліся на зубрыны статак. Жывёліны, збіўшыся ў гурт, адпачывалі і жавалі жвачку — маладняк усярэдзіне, мацнейшыя з краёў. Здрыганулася зямля, калі статак усхапіўся на ногі, і адразу ж зубрважак з сажнёвымі рагамі зароў і, прыгнуўшы да зямлі галаву, рынуўся на няпрошаных гасцей.

На паляўнічых імчала такая раз'юшаная аграмадзіна са скуры, мяса і вастраколін рагоў, што нават загартаваныя ў такіх сутычках мужчыны не вытрымалі і з усіх ног кінуліся да выратавальнага лесу. За ўцекачамі рвануўся і Тур, бо і сапраўды было безнадзейным схапіцца з такім зверам, які адзін мог раскідаць цэлы гурт. Але чалавек хутка зразумеў, што ад зубра не ўцячы — да лесу было крокаў пад сотню, а бык ужо роў за спіной і праз імгненне ўсадзіць рогі ў спіну, перакіне праз сябе. Потым другога, трэцяга.

І тут Тур у апошнім ці то адчаі, ці то приступе незвычайнай адвагі павярнуўся насустрач зверу. Калі крывуліны рагоў ужо былі перад самым яго жыватом, адступіў крок убок і, уклаўшы ўсю моц рук у дрэўка дзіды, ударыў ёю наўскасяк, цэлячы пад лапатку зубру. Жывёліна захрапла і крутанулася да паляўнічага. Той не паспеў адчуць ні ўдару, ні болю. Апошняе, што ўбачыў, як некуды пад ногі перакулілася раптам пачарнелае неба, і ён паляцеў у гэту цемру.

Азірнуўшысячна зубрыны храп, паляўнічыя ўбачылі, як высока над маліннікам узляцеў Тур, як закруцілася і пачала цяжка асядаць

на траву жывёліна, як потым яна завалілася на бок, пускаючы крывавую пену.

Паляўнічыя гэтак жа імпэтна кінуліся назад і, калі падбеглі, зубр ужо даходзіў. З яго боку тырчэў кароткі абломак дзіды. Непадалёку, шырока абдымаючы цёплую зямлю, ляжаў Тур.

Высеклі жэрдкі. Злучылі іх скуранымі рамянямі — атрымаліся насілкі, на якія і паклалі мёртвага. На жэрдках-валакушах цягнулі адсечаную зубрыную галаву. Па астатнюю здабычу трэба будзе прыехаць коньмі.

Хавалі Тура назаўтрае, на родавых могілках, якія былі на высокім рачным беразе. Тут, на былым лядным полі, было бязлесна, бо пастаянна высякаўся і вытоптваўся пад час штогодных памінак кожны парастак. Толькі траве дазвалялася пакрываць сваёй зялёнай зрэбніцай высокія земляныя насыпы-капцы над магіламі.

Прыйшлі маўклівыя светары і пачалі рыхтаваць каля драўлянай бажніцы пахавальнае вогнішча, каб цела нябожчыка свяшчэнны агонь — сын Нябеснага Светача ператварыў у дым-дух, які падымецца ў неба. А потым трэба было спаленыя рэшткі ссыпаць у магільную яму, пакласці туды рэчы нябожчыка, каб пад капцом быў прытулак, дамоўка для духа, калі ён часам будзе вяртацца з нябесных вандровак.

Але светары дарма стараліся. Мужчыны, што былі на апошнім Туравым паляванні, запярэчылі:

— Не трэба яго спальваць. Пахаваем па-даўнейшаму. Тур сам заўсёды ганіў новы звычай. Не любіў, што агонь нішчыць цела, хоць і мёртвае.

Але сапраўдная прычына нелюбові Тура да спальвання нябожчыкаў хутчэй была ў тым, што яшчэ ў маладосці ён трапіў у палон да воінаў задняпроўскага племені. І тыя дапытвалі яго агнём, каб сказаў, дзе загон і куды яны пахавалі чоўны, на якіх пераправіліся праз раку. Тур вытрымаў катаванні і нічога задняпроўцам не сказаў, а ноччу ўцёк. Але з таго часу ў ім пастаянна жыла памяць пра нясцерпна пякучы агонь і нарадзілася непрыняцце новага пахавальнага звычаю, які не так даўно — нейкае пакаленне назад — распаўсюдзіўся на іхніх землях.

Пра ўсё гэта таварышы нябожчыка пэўна ведалі, але яны не сталі тлумачыць светарам, толькі катэгарычна заключылі:

— Так трэба Туру.

Светарам толькі засталося са шкадаваннем паківаць галовамі і адысці, мармычучы пад нос пра гнеў багоў. А што такому дужаму і храбраму мужчыну, як Тур, гнеў багоў? Ен і з багамі здолее дамовіцца

і паладзіць. Ен жа быў добрым гаспадаром і паляўнічым, не краў, не забіваў супляменнікаў і мірных суседзяў з іншых плямёнаў, прыносіў кожным святам ахвяры тым жа багам.

Кіраваць пахаваннем узялася адна старая жанчына. Яна ўжо ледзь соўгалася па зямлі і родзічы-тымсветнікі даўно клікалі жанчыну да сябе, але нешта яе ўсё яшчэ трымала і на гэтым свеце. І вось яна яшчэ памятала штокольвечы пра даўнія звычаі.

Драўлянымі рыдлёўкамі мужчыны выкапалі дол, не асабліва вялікі, але каб і не цесна было нябожчыку. Дно і сценкі вычысцілі, выраўнялі ласінымі лапаткамі. Затым магілу выклалі сухім дубовым голлем і падпалілі, каб агонь ачысціў яе ад усяго благога. А калі . агонь патух і астыў попел, выслалі дол бяростай, як рабілі ў хацінах,— магіла павінна была паходзіць на былы родны дом Тура, у якім яму добра жылося-былося не адзін дзесятак гадоў.

Нарэшце на засланых скурамі дзідах прынеслі і нябожчыка. Ен меў на сабе ўсё самае лепшае і дарагое. Усё сваё багацце і славу ён браў з сабою, каб і ў замагільным жыцці багі, духі і тымсветнікі бачылі і разумелі, што Тур быў першы сярод лепшых людзей іхняга роду. На ім была белая льняная адзежа і шэры суконны плашч. Світку перацягваў шырокі скураны пояс з нашытымі меднымі бляшкаМі. Гэтым поясам Тур пры жыцці карыстаўся рэдка — на большыя святы, ці калі выбіраўся на Вялікую раду племені, ды на вайну. Таму бляшкі пазелянелі ад вокісаў і зараз, спехам пачышчаныя жонкай, блішчэлі толькі выпуклінамі. Затое грыўня на шыі — шырокая медная пласціна з насечкамі па краях — ажно зіхацела, і на ёй іскрылася нізка шклянога бісеру, выменянага ў прыезджых з нізоўяў Дняпра людзей за пяць тузінаў лісіных шкурак.

А вось абутак нябожчык меў сціплы. Гэта былі даволі паношаныя, але яшчэ моцныя чобаты з бычынага лабяка, перацягнутыя на шчыкалатках раменьчыкамі. Менавіта ў гэтым абутку гаспадар апошні год выходжваў навакольныя пушчы і балоты з лукам і дзідаю.

Тура асцярожна паклалі на дно магільнай ямы, на правы бок, злёгку падагнуўшы ногі, быццам чалавек і не мёртвы, а прылёг, натаміўшыся, адпачыць. Смерць для ягоных суродзічаў уяўлялася нейкім доўгім дзівосным сном. Пройдзе нейкі час, і чалавек прачнецца, ачуняе і будзе жыць надалей, але ўжо ў іншай невядомай краіне...

Затым пачалі складаць розныя патрэбныя нябожчыку рэчы. Ля самага краю паклалі дзіду з ясеневым запаліраваным рукамі дрэўкам, з бронзавым наканечнікам. Наканечнік быў стары, і яго вастрыё нават прытупілася. Відаць, гаспадару дзіда служыла доўга, і ён сам яе бярог і песціў, вастрыў наканечнік каменным бруском, пра які таксама не

забыліся. Каля рук Тура апынуўся цяжкі паляўнічы лук і берасцяны ўзорысты калчан з дзвюма дзесяткамі баявых і паляўнічых стрэлаў. Паклалі ў дол і меднае шыла з драўлянымі тронкамі, пару доўгіх крамянёвых нажоў з абкручанымі скурай дзяржаннямі. Нажы спатрэбяцца, калі трэба будзе злупіць з упаляванай жывёліны шкуру, а шыла — калі ён захоча з той шкуры што пашыць. Не шкадуючы, сыпнулі спорную жменю крамянёвых пласцінак і адшчэпаў, каб нябожчыку пад рукою быў патрэбны матэрыял для разца, праколкі, скрабка і для нажа, калі стары зломіцца. Абярэжліва паклалі і навостраную крамянёвую сякеру, якой можна будзе пасекчы на часткі ўпаляваную дзічыну, нарыхтаваць жэрдак, калі прыйдзе час збудаваць жытло. Другую сякеру, з прыгожага ружовага каменю, з запаліраванай паверхняй, шырокім выступаючым лязом і плоскім абушком, насаджаную прасвідраванай адтулінай на моцную ядлоўцавую рукаятку, памясцілі каля пояса. Гэта ўжо была зброя. Таму, можа, рукаятку так ахайна аплятаў раменьчык з пятлёй, якая надзявалася на запясце, каб у гарачай бітве зброя не зрывалася з рукі.

— А гаршчок з пшанічнай кашай...— спахапілася распарадчыца пахавання.

— Навошта Туру каша? — здзівіліся паляўнічыя.— Хіба ён жанчына? Ці ён не заслужыў лепшага чаго, чым каша, хоць сабе і пшанічная?

І паляўнічыя паклалі ў кут магілы галаву і сэрца ўпаляванага нябожчыкам зубра. Гэта быў модны і адважны бык. Няхай Тур хоць там з'есць ягонае сэрца, хай яму яшчэ дабавіцца храбрасці і дужасці гэтага звера...

Потым накрылі дол стрэшкай з жэрдак і кары і пачалі засыпаць пад галашэнне жанчын. Кожны падыходзіў і сыпаў на магілу прыгаршчы зямлі. Паступовa магіла расла і, нарэшце, пад вечар, з'явіўся жоўты капец вышэй чалавечага росту. Праз год капец абсядзе, і тады яго трэба будзе ў дзень памінак падсыпаць. А потым будуць яго яшчэ павышаць кожны год, пакуль будзе доўжыцца і жыць іхні род.

Зараз засталося толькі прынесці мяса і рыбу і іншыя прысмакі, чарнічны забрадзілы сок, ад якога кружыцца галава і весялее засмучанае стратай сэрца. Родзічы сядуць навокал капца і добрым словам ушануюць нябожчыка, чалавека з мудрай галавой, храбрым сэрцам і моцнымі рукамі. І ніхто не скажа і не ўспомніць благога, што, можа, калі Тур каго пакрыўдзіў ці ўзяў сабе смачнейшы кавалак, ці часам мог занадта хваліцца сваімі паляўнічымі або ваеннымі подзвігамі. Але калі і было такое, зараз прабачалася.

І так здарылася, што праз два дні ў гэтай жа вёсцы памерла ўдава Трохпаліца — бяздзетная старая з пашкоджанай рукой, за што і атрымала такое імя. На такіх хворых і нямоглых нярэдка ў родзе глядзяць, як на лішні рот, цяжар для суродзічаў. Якая з яе карысць? Да таго ж яна не паспела да смерці мужа нарадзіць дачок і сыноў, з якіх бы выраслі паляўнічыя, работнікі на полі, жнеі, праллі і гаспадыні. Таму Трохпаліца і жыла на ўскрайку вёскі, ля самага тынучастаколу. Жытлом яе быў бедны буданчык, так-сяк абторканы ў шчылінах травой ды мохам. І заставалася яна, бывала, галодная, бо суродзічы забываліся часам прынесці ёй жменю зярнят ці кавалак мяса. А калі і ўспаміналі пра яе, то хутчэй, каб папрасіць прыгледзець якога малога, калі самі адхіналіся з дому.

І вось Трохпаліца памерла. І пахавалі яе ў невялікай магілцы пад невысокім насыпам, і на той свет нябожчыцы далі толькі трэснуты гаршчок з кашай і крамянёвы тупаваты нож. І на памінках былі толькі бліжэйшыя родзічы, якія ўспамянулі яе похапкам, спяшаючыся да сваіх пільных клопатаў.

Суседская дзяўчынка, якая сваім добрым сэрцам любіла старую, аднойчы потым спыталася ў бацькі:

— А чаму так, тата? Бабуля Трохпаліца была галодная і бедная і пахавалі яе абы-як. З сем'яў старэйшын нават ніхто не прыйшоў развітацца. А Тур і пры жыцці ўсё лепшае меў і на той свет колькі ўсяго забраў!

— А як жа, дачушка, інакш? — падумаўшы, адказаў бацька.— Тур жа нідзе сябе не шкадаваў — ні ў пушчы, ні на полі. Таму і належалі яму па справядлівасці і наша пашана і лепшы кавалак.

— А ці ж вінавата Трохпаліца, што яна была старая, нямоглая ўдава? Не, несправядліва гэта.

«Бач ты яе,— здзіўлена падумаў бацька,— яшчэ такая малая, а ўжо думае, як дарослы».

*

— Вёска Тура хутчэй за ўсё была паселішчам вялікай патрыярхальнай сям'і, або, як мы кажам,— патраніміі, у якую ўваходзілі родзічы розных пакаленняў. Патраніміі, разрастаючысЯу дзяліліся на меншыя сем'і блізкіх родзічаў, якія будавалі сабе асобныя хаціны і пачыналі весці ўласную гаспадарку. Уся навакольная зямля была ўласнасцю патраніміі, палі апрацоўваліся калектыўна, а вось ураджай дзяліўся паміж асобнымі сем'ямі, па едаках. Спачатку агульнай была і жывёла, але, відаць, у бронзав ым веку нярэдка сем'і пачыналі валодаць уласнымі статкамі. Выдзяленне невялікай сям'і,

як гаспадарчага калектыву, вяло да ўзнікнення і ўмацавання прыватнай уласнасці.

— Адсюль і маёмасная няроўнасць?

— Так. У нейкай сям'і ўрадлівейшы ўчастак поля, жывёла дала больш прыплоду — вось яна і пабагацела. А недзе вымакла ці высахла, каровы захварэлі, пажар надарыўся — збяднела сям'я.

ВОГНЕННЫ ЦМОК

Малых дзяцей ужо паклалі спаць, а мужчыны, пасля добрай вячэры, яшчэ сядзелі каля агнішчаў і заспакоена гутарылі пра зробленае за летні дзень, радзіліся аб заўтрашніх клопатах. Жанчыны дараблялі свае хатнія справы. Непаседлівыя падлеткі палезлі ў возера, каб у апошні сёння раз выкупацца ў яшчэ цёплай вадзе.

Сонца зайшло даўнавата. Неба на ўсходзе было ўжо цёмным, хоць на захадзе яшчэ добра палымнела і стужка высокіх перыстых воблакаў падсвятлялася з-за далягляду. Але падсветка гэта была ўжо прыглушаная, быццам прысыпаная попелам. Мусіць, сонца таксама паклалася спаць і недзе ўжо драмала, набіраючыся сілы для заўтрашняй працы.

І сярод гэтага ўціхаміранага напаўсоннага настрою людзей і ўсёй навакольнай прыроды высока ў паўднёвай частцы неба ўзнікла рыска святла, якая стала наўскос выцягвацца да зямлі, большаць, яскравець. І нарэшце ператварылася ў вогненны слуп, які, цягнучы за сабой распалены хвост і страляючы іскрамі, урэзаўся ў лес за ўзгоркамі. Зямлю страсянуў грымотны выбух, а затым хваля ўраганнага ветру пранеслася над лесам і абрынулася на возера, успеніўшы ваду. Узвіліся з агнішчаў у паветра вугалі, пасыпаліся на людзей абламаныя з дрэў галіны і трыснёг са стрэхаў хадзін. І адразу затым закрычалі спалоханыя жанчыны, заплакалі дзеці, замітусілася ў загарадзе жывёла і па-ваўчынаму завылі сабакі. Але так жа раптоўна вецер сціх, і толькі за ўзгоркамі пачало яснець неба. Маладзейшыя паўзлазілі на хвоі і закрычалі: «Гарыць лес!»

Як заўсёды бывае пры лясных пажарах, аднекуль пацягнула лёгкім ветрам, які паступова мацнеў і раздзьмухваў полымя. Напалоханыя людзі прыкмецілі, што яно расцягваецца ўшыркі і набліжаецца да іхняга возера.

Трэба было думаць пра паратунак.

Запасы ежы, вопратку паклалі ў чоўны, туды ж пасадзілі дзяцей, старых і жанчын і адплылі на мелізну, што была на адлегласці палёту

стралы ад берага. Прылады працы, рыбацкі рыштунак і ўсё, што траплялася пад руку, у поспеху закопвалі ў мокры прыбярэжны пясок, тапілі ў вадзе каля камянёў, каб потым, як праміне навала, можна было знайсці. Далека за трыснёг загналі жывёлу, і мужчыны трымалі яе там лыкавымі вяроўкамі.

Малая Палавейка гэтую ноч потым памятала праз усё жыццё. Да самых драбніц. Спачатку набліжаўся гул і трэск, быццам ішла вялікая жнівеньская навальніца. Над возерам ужо густа клубіўся дым у водблесках пажару. І ад гэтых водблескаў барвовыя сполахі трапяталі на вадзе і тварах людзей. Потым з-за ўзгоркаў узвіліся першыя языкі полымя. Яны, як жывыя, вырываліся з гушчару, зыркімі змеямі перабягалі з сука на сук, ад дрэва да дрэва. Звіваліся, з сыкам скручваліся ў клубкі, пырскалі іскрамі і, як стрэлы, выстрэльвалі ўверх. Распаленыя галавешкі з шыпеннем падалі ў возера. Некаторыя даляталі да самых чоўнаў. Нарэшце вогненныя змеі спляліся ў вялізны слуп агню. Стала нясцерпна горача.

— Трымай гавяду! — крычалі мужчыны, але ашалелую ад лютай спёкі жывёлу было не ўтаймаваць. Яна вырывалася з рук, кідалася на бераг і там згарала; спрабавала ратавацца ў глыбіні — і тапілася.

І вось успыхнулі хаціны і вокамгненна згарэлі — зніклі ў вогненнай навале.

Потым агонь падступіў да самага берага і, на шчасце, захлынуўся на пяску. Яму не было тут што пажыраць. Полымя каля вёскі пасалабела, прыбілася ніжэй да зямлі. Затое пажар рос ушыркі, агінаў возера шырокай лукою. Пад раніцу ён дасягнуў паўднёвых прыбярэжных балот і там спрабаваў прабрацца па кустоўі, але пачаў абціхаць. З паўночнага ж боку, у сухадолых барах, яму было дзе разгарнуцца і там ён шалеў з новаю сілай.

Раніцай пасвятлела, але сонца так і не змагло прабіцца праз суцэльны пласт дыму, які нізка слаўся над возерам. Рэзка пахла папялішчам, далятаў смурод паленага мяса. Калі зусім развіднела, людзі ўбачылі, што ў вадзе побач з імі ратаваліся алені і ласі, мядзведзі і ваўкі. Па самыя пысы забраліся ў ваду туры. І ніхто не чапаў адзін другога. Усе забыліся пра іклы, кіпцюры, лукі са стрэламі. Бяда агаломшыла ўсё жывое, прымірыла на нейкі час драпежніка і палахлівую казулю, паляўнічага і яго штодзённую здабычу.

Людзі, паволі прыходзячы ў сябе, ачуньвалі, выбіраліся на бераг. Тушылі бліжэйшыя вывараці, корпаліся на папялішчах. Драпежнікі ўжо апасліва адышліся далей ад людзей і ўзяліся снедаць каля абпаленых трупаў жывёл. Тыя, хто не мог харчавацца мясам, разграбалі выгарыны, вышукваючы ацалелыя касмыкі травы.

А пушча ўсё гарэла. Пажар заняў наваколле ажно да далягляду. Гарэла ўся зямля ад краю да краю. І ніхто, мусіць, не спадзяваўся, што некалі гэта скончыцца, што зноў заяснее неба і зазелянее счарнелая зямля.

Перад абедам яшчэ больш пацямнела і паніжэла неба, навісла калматым кажухом над абпаленай зямлёй. Сцішыліся людзі, і сціснуліся ў трывозе іхнія сэрцы. Што гэта яшчэ за навала рыхтуецца? А потым цяжкі грукат пракаціўся над галовамі, быццам кацілі камяні нейкія веліканы, і першая маланка, як вогненная галіна, успыхнула на небе. Потым бліснула і аглушальна загрукатала ўжо за возерам і грымнула навальніца з перунамі, і лінула так, быццам уверсе штосьці развязалася, парвалася. Шыпелі і тухлі абгарэлыя пні, чорныя ручаі пабеглі ў возера.

Цяпер ужо людзі смяяліся і крычалі ад радасці, ловячы ў шырока адкрытыя раты дажджавыя струмені — навальніца патушыць гэты сусветны пажар!

А праз колькі дзён, калі мужчыны хадзілі да балота, каб насекчы жэрдак для новых хацін, як раз там, дзе быў ударыў у зямлю пярун, яны знайшлі каменную сякеру. Дзіўную яна мела форму — як імклівы човен з узнятым вострым носам. І адтуліна для рукаяткі была вельмі ж адмысловая.

Як сюды трапіла сякера, хто яе згубіў? Можа тыя конныя ваяўнікі, што калісьці даўным-даўно прамкнуліся гэтымі мясцінамі? Можа быць. Але зараз людзі былі перакананыя, што нездарма сякера знайшлася менавіта там, куды трапіла вогненная перунова страла.

— Сякера Перуна! — сказалі старыя.

— Сякера Перуна! — паказвалі тубыльцы знаходку блізкім і далёкім суседзям.

Праз шмат гадоў расказвала Палавейка ўнукам і праўнукам:

«Аднойчы цёмнай ноччу прыляцеў Цмок і ўпаў у лес за ўзгоркамі. А было ў яго сем галоў і ў кожнай з пашчы выскоквалі вогненныя языкі-змеі. Да чаго ён языком не дакранецца — адразу згарыць. З рэвам і грукатам нёсся па нашай зямлі Цмок, хочучы спаліць усё жывое, знішчыць нашу пушчу, звяроў і людзей.

Пачуў пра такую навалу Пярун і прыімчаў па небе на даўгагрывым кані, і капыты ягонага каня высякалі з воблакаў іскры, і грукат стаяў навокал.

Схапіліся Пярун з Цмокам у смяротным двубоі. Кінуў Пярун вострую сякеру і адсек пачвары першую галаву. Але астатнія жывуць, кусаюцца. Кінуў Пярун яшчэ сякеру, адсек другую галаву. І так сем разоў. Застаўся Цмок зусім без галоў і здох. Ды жывымі яшчэ былі

вогненныя языкі-змеі, што павыскоквалі з адсечаных галоў. Пладзіліся яны мноствам і разбягаліся ўсё шырэй па лесе. І не было ад іх паратунку, бо засячэ адну Пярун, а на яе месца некалькі новых звіваецца. Тады паклікаў Пярун навальніцу. Лінуў дождж і затапіў цмокавых дзяцей. І абцiх на зямлі пажар».

*

— Гэта і ёсць тыя старажытныя карані фальклору, як разумею, вытокі сюжэту двубою Перуна і Цмока.

— Які бытуе, дарэчы, у самых розных народаў. Для першабытнага чалавека лясныя пажары паўсюдна былі найвялікшым стыхійным бедствам. У беларускім фальклоры можна знайсці і іншыя сюжэты, якія дайшлі да нашага часу ажно з бронзавага, а то і каменнага веку. Есць, напрыклад, паданне аб асілках, якія жылі толькі з дзічыны ды рыбы, апраналіся ў звярыныя шкуры, а на паляванне хадзілі з каменнем. У іншых паданнях старажытныя асілкі перакідваліся каменнымі сякерамі. Некаторыя вучоныя мяркуюць, што ў казках пра звера Цуду-юду захавалася памяць пра маманта. А ён жа знік з тэрыторыі Беларусі больш як дзесяць тысячагоддзяў назад!

ВОГНЕПАКЛОННІКІ

Ніхто дакладна не ведаў, адкуль быў родам гэты высокі стары з загарэлым тварам і барадою, сівою і пакручастаю, як пена на віры. Хадзіў ён ад паселішча да паселішча, абапіраючыся на ядлоўцавы кій, пабліскваючы меднай бляхаю на грудзях з выяваю крукаватага крыжа.

Казалі, што яшчэ ў маладосці гэты чалавек трапіў быў у палон да паўднёвых людзей, якія прадалі яго ў рабства. Шмат гадоў лёс кідаў яго па свеце. Нацярпеўся рознага, але, будучы ад роду цікаўным і кемлівым, шмат чаго пабачыў і многаму навучыўся.

Вярнуўся ён у гэтыя мясціны ўжо ў сталым веку. Прыплыў ажно з-пад паўднёвага мора разам з цёмнавалосымі кучаравымі людзьмі на вялізным чоўне пад ветразем. Верная прыморнікі абмянялі медзь, бронзу і шкляныя пацеркі на звярыныя шкуры, мёд і воск і вярнуліся да сваіх цёплых берагоў. Стары ж застаўся. Ен пачаў хадзіць па тутэйшым краі і навучаць людзей пакланенню сонечнаму свяцілу. Вечарамі распальваў вогнішча, збіраў вакол сябе гурт і гаварыў, размахваючы рукамі. Яго ўтрапёныя вочы быццам пранізвалі людзей, і дзівосныя словы глыбока западалі ў сэрцы. А калі сонца адбівалася

ад увагнутай меднай бляхі і асляпляла прысутных, усім здавалася, што гэта пасланнік самога Сонца з'явіўся перад імі. І за ўсё гэта клікалі старога Вешчуном.

— Вы сееце збажыну і гадуеце быдла, але як дзікуны-паляўнічыя, што блукаюць па глухіх пушчах, па-ранейшаму пакланяецеся Месяцу — уладару цёмных начных сіл, якога лічыце вярхоўным боствам,— гаварыў Вяшчун.—Але ж хіба не Сонца прыносіць цяпло на зямлю і растапляе снягі і лёд? Хіба не з ім прыходзіць вясна і наступав час сяўбы? І хіба не сонечныя промні спеляць зерне ў каласах? Хіба не Нябеснае Свяціла дае жыццё ўсяму існаму на зямлі?

— Сонца — вярхоўнае боства,— навучаў далей стары.— Месяц жа — цемра і ноч, і свеціць ён толькі, адбіваючы сонечнае святло. Падстаўце далоні Сонцу і адчуеце цяпло. А хіба ж дае цяпло Месяц? Хіба не холадам і золкім туманам ахутвае ён зямлю? І хіба не Сонца разганяе туман уранку і прасвятляе над намі неба?

— Агонь у вогнішчы і на паходні — гэта часцінкі Сонца, што апусцілася да людзей. Калі мы спальваем лес і на выгарыны кідаем зерне, то ячмень хутка расце, высокі і каласісты. Гэта агонь зрабіў такой урадлівай зямлю. І гэты агонь нараджаецца ад трэння скрыжаваных палачак. Таму скрыжаваныя палачкі, крыж — сімвал вечнага Сонца!

Слухалі людзі Вешчуна, дзівіліся, ківалі галовамі. Некаторыя ж пляваліся, адварочваліся і ішлі прэч. Ды ўсё больш было такіх, што пачыналі пакланяцца Сонцу, паліць летняй самай кароткаю ноччу рытуальныя вогнішчы, спальваць нябожчыкаў і насыпаць над імі земляныя капцы. Таму вылюдняліся бажніцы, прысвечаныя Месяцу, усё менш да іх прыносілі ахвяраў. І адпаведна ўсё менш перападала светарам — прыслужнікам каля бажніц мяса і хлеба, вопраткі і ўпрыгожанняў.

Аднойчы ў канцы лета Вяшчун з некалькімі вучнямі падаўся на землі, што былі на далёкіх паўночных прытоках. Прыйшлі яны туды і прыпыніліся на высокім прыбярэжным мысе. Зладзілі цёплы будан, каб перабыць у ім зіму, расклалі вогнішча і пачалі залучаць мясцовых жыхароў да вогнепаклонніцтва. Але на гэтых глухіх ваколіцах, сярод векавечных пушчаў, дзе былі неўрадлівыя пясчаныя глебы, людзі жылі амаль выключна з палявання і рыбацтва. Зерня тут сея л і мала, і жывёл амаль не разводзілі. Таму новае вучэнне з цяжкасцю пускала караНі. Тубыльцы па-ранейшаму пакланяліся Месяцу, выявам Вялікага Лася і Маці-качкі, нябожчыкаў загортвалі ў бяросту і хавалі ў дуплах старых дрэў. Ды ўсё ж паціхупамалу большаў гурт слухачоў каля вогнішча на мысе. Але ўсё гэта дужа не даспадобы было

тутэйшым светарам ды і старэйшыны скоса пазіралі на находніка, што муціў у галовах іхніх супляменнікаў.

І аднойчы на рачны мыс уварваўся натоўп узброеных мужчын.

— Смерць чужаку, які вучыць нішчыць агнём целы нашых памерлых бацькоў і дзядоў! — крычалі светары-падбухторшчыкі.

— Смерць яму! — роў натоўп.— І гэтым, што каля яго!

— Паслухайце, людзі...— узняў рукі Вяшчун.

— Няма чаго нам цябе слухаць! — перапыніў старога каржакаваты здаравяк з ваўчынай шкураю за плячыма.—Калі твае багі такія вялікія, то пакажы іхнюю моц. Інакш — рыхтуйся сустрэцца з імі! І ён патрос сякерай.

— Вучні мае,— загадаў Вяшчун,— нясіце сюды больш сухой травы і галля.

У насцярожаным маўчанні натоўпу Вяшчун падышоў да нарыхтаванага вогнішча і павярнуўся так, каб сонечнае святло ад нагруднай бляхі, сабранае ў вузкі пякучы прамень, трапіла на сушняк. Доўга стаяў так, не кранаючыся, і ягоныя ворагі ўжо пачалі былі траціць цярпенне. Але вось ад сонечнай плямкі на траве выплыў абвуглены абадок, задыміўся, і нарэшце ўспыхнуў агонь. Гул здзіўлення пралящеў над мужчынамі.

— Гэта толькі чараўніцтва! Не верце яму, людзі! — не здаваліся светары.

— Нясіце голле на вогнішча. Ды пабольш! — зноў загадаў Вяшчун.

Нарэшце полымя зашугала гарачынёй і выбухнула вышэй чалавечага росту. Тады Вяшчун узняў рукі да Сонца, нешта пашаптаў і ступіў на вогнішча.

Крык жаху і ўтрапення скалануў прысутных. Людзі адхлынулі, многія ўпалі ніцма на зямлю. Рэшта ж са светарамі кінуліся наўцёкі.

Калі дагарэла вогнішча, вучні Вешчуна насыпалі над ім высокі капец.

Вестка пра такое нечуванае здарэнне разышлася па блізкіх і далёкіх наваколлях. Уражаныя тубыльцы паступова таксама пачалі пакланяцца агню.

*

— Нешта ў цябе тут цьмяна і скорагаворкай. Так і у сне бачылася?

— Ну, не зусім так. Тое-сёе дабавіў. Пачатак бронзавага веку быў звязаны з радыкальнымі зменамі ў светатіоглядзе першабытнага чалавека. У тым ліку і ў рэлігійных вераваннях, якімі былі прасякнуты самыя розныя бакі тагачаснага жыцця. Справа ў тым, што земляроб

бронзавага веку інакш успрымаў і тлумачыў свет, чым неалітычны паляўнічы. Для земляробства важныя змены пораў году, рух нябесных свяціл, па якіх ён вызначаў набліжэнне гэтых змен, важнае сонечнае цяпло, плодная моц зямлі. Старажытнага сейбіта займала таямніца нараджэння расліны з зярняці, чаму спрыялі і дождж і сонца. Канешне, змены ў духоўным жыцці адбываліся не раптоўна, а паступова. Старое не здавала легка свае пазіцыі, працягвала існаваць нейкімі элементамі і ў новую эпоху. Гэта таму, што ранейшыя заняткі, звязаныя з лесам, возерам, працяглы час усё яшчэ мелі важнае значэнне ў забеспячэнні чалавека прадуктамі харчавиння.

У сне ж мне бачылася, быццам я — малы хлапчук, сядзім з дзедам на азёрным бе разе і пячом мы на невялікім цяпельцы ракаў. Іх поўна было ў норах пад нізкім берагам. Толькі што налавілі — гупалі па беразе нагамі, а ўстрывожаныя небаракі выпаўзалі на пясчанае плыткаводдзе на відавок. Там мы іх і хапалі за спінкі. І вось мы сядзелі каля агню і чакаліу пакуль ракі пачырванеюць — тады іх можна лупіць і есці — і дзядуля апавядаў пра Вешчуна. Запомніліся толькі ўрыўкі з гэтага падання, рэшту ж дапоўніў сам, што ведаў з археалагічных раскопак, прачытаў у кніжках па этнаграфіі першабытных народаў.

Земляробства гэтага часу ў аснове сваёй было падсечна-агнявым. Глебу на выгарынах рыхлілі рознымі завоетранымі каламі, каменнымі і рагавымі матыкамі. Дарэчы, такіх каменных матык на Беларусі знойдзена даволі шмат. Падобныя спосабы апрацоўкі поля былі вядомыя яшчэ з новага каменнага веку. Але маюцца сведчанні, што ў бронзавым веку зараджалася і распаўсюджвалася і ворыўнае земляробства з дапамогай драўлянага ралау запрэжанагаваламі. Хачу яшчэ раз падкрэсліць важнейшую ролю агню ў гэтай справе. Толькі ІМ можно, было для сяўбы вызваліць дастатковыя плошчы сярод суцэльных лясоў ды хм ыз някоў. Да таго ж зямля, угноеная попеламу станавілася надзвычай урадлівай. Першага чалавека агонь сагравау ахоўваў ад звера, даваў магчымасць згатаваць ежу. Зараз жа ён стаў першым памочнікам і земляробу. Успомнім, што толькі агонь даў чалавеку ўладу над рудамі, з якіх ён пачаў выплаўляць металы.

Заняўшы такое важнае значэнне ў штодзённым жыцці людзей бронзавага веку, агонь і сонца, як яго найвышэйшае ўвасабленне, сталі важнейшай часткай іхніх вераванняў, светапогляду.

ДОБРА ТОЕ, ШТО Ў ПАРУ КАНЧАЕЦЦА

У палату ўвайшла медсястра, дзелавіта зрабіла нам апоиінія на сёння ўколы, выключыла святло, пакінуўшы над дзвярыма толькі маленькую зеленаватую лямпачку. Хворыя пачалі рыхтавацца да сну. Я выцягнуўся пад коўдрай, выбіраючы зручнейшае месца для ладна ўжо адлежаных за мінулыя паўмесяца бакоў і сцішыўся ў чаканніу калі надыдзе прыемнае паўзабыццё, а затым і сон...

Навокал было толькі, чорнае, без канца і краю, верху і дна, неба. І на ім нерухома свяціўся россып зор. Вялікіх і дробных, ледзь прыкметных. Сярод іх фасфарыцыруючымі мядузамі завіслі спіралі далёкіх галактык.

Я агледзеўся, але не ўбачыў ні зямлі, ні месяца. Навокал быў чорны космас і тыя ж рэдкія зоры. Я паспрабаваў абмацаць сябе і не змог, бо ў сапраўднасці не было і мяне, як матэрыяльнай істоты. Сярод гэтай бясконцай пустэльні знаходзіўся толькі згустак маёй свядомасці, якая не мела цялеснага ўвасаблення. І тады я пачаў разумець, што, пакуль спаў, гэты д'ябальскі гадзіннік часу перанёс мяне на мільярды гадоў, можа нават на светлавыя гады... Толькі невядома куды — у буду чае, ці ў мінуўшчыну? Навокал былі чужыя абрысы сузор'яў і самае галоўнае — ужо ці яшчэ не было не толькі Зямлі, але і усей Сонечнай сістэмы. Не было маіх родных, блізкіх, знаёмых. Я з імі размінуўся ў часе! І ад усведамлення гэтага мяне агарнула жахлівая, безнадзейная туга. Я ўяўляў, які тут ледзяны холад, якая сусветная пустэча і невыказная адзінота. І мая свядомасць сцялася ў балючую кропачку.

На шчасце, сон мой працягваўся нядоўга. Я прачнуўся і з палёгкай убачыў цьмяную лямпачку над дзвярыма, пачуў ціхія стогны су седа, але пачуццё раздзіраючай душу адзіноты не міналася. Тады я скруціўся клубочкам і не заснуў да самай раніцы.

Днём я выклыпаўся ў бальнічны сад. Хадзіў між дрэвамі, разглядаў кожны ўжо пажаўцелы лісток, дакранаўся да шурпатых бярозавых камлёў, нюхаў познія кветкі. Я з цяжкасцю верыў сабе, што знаходжуся зноў на зямлі,і шукаў усё новыя пацвярджэнні, што я тут, а не ў космасе. І ў твары людзей, якія прагульваліся па вільготных дарожках, углядаўся, быццам бачыў іх першы ці апошні раз.

А позна веча рам, калі зноў ляжаў у ложку, раптам здрыгануўся ад думкі, што вось засну і знікне зямляу і я зноў апынуся ў той жа міжзорнай пустэльні. І кожны раз, калі сон ужо амаль авалодваў мною, прахопваўся. І так было ўсю ноч.

Тое ж паўтарылася і ў наступныя ночы.

Я зусім знясілеў ад бяссоння і стаў нецярпліва чакаць Івана Пятровічау які ўсё недзе затрымоўваўся. Нарэшце пазваніў яму сам: «Прыедзь, калі ласка, мне блага».

Устрывожаны сябра праз паўгадзіны быў у палаце.

— Ну, што ў цябе? — запытаўся ён, прысеўшы каля ложка і пільна ўзіраючыся ў мой твар.

Я даволі блытана распавёў яму пра свой «гкасмічны» сон, пра тое, што баюся заснуць, каб не паўтарыўся кашмар. Гаварыў я дрыжачым голасаМу нервова тузаўся. А ў канцы пачаў скардзіцца, што мне абрыдлі ўсе гэтыя мроі з мінулымі тысячагоддзяміу што мне хочацца спаць, як кожнаму нармальнаму чалавеку, бачыць звыклыя сныҁ а сама лепш — не сніць нічога, бо гэтымі начнымі трызненнямі я здаволіўся да краю.

Іван Пятровіч паклаў мне руку на плячо:

— Не хвалюйся. Звыклая справа — у цябе наступіла нервовае перанапружанне. Але ўсё будзе добра. Кладучыся спаць, глынеш вось гэту зялёную таблетку.

І сапраўды у пасля ягоных лекаў сон быў глыбокі, моцны і спакойны. Можа, што я і сніў, але, прачнуўшыся, нічога не памятаў. І калі расплюшчыў вочыу убачыў каля свайго ложка палатнага доктара і Івана Пятровіча.

— Ну як? — хітра заўсміхаўся мой сябра.

— Спаў, як пшаніцу прадаўшы! — шчасліва засмяяўся я.

— Яшчэ б, двое сутак. Як сябе адчуваеш?

— Страшэнна хачу есці.

Праз нейкі месяц пасля выпіскіз бальніцы я зазірнуў на працу да Івана Пятровіча, каб па старой звычцы перакінуцца парай слоў.

І ў канцы нязмушанай сяброўскай гаворкі, не падаючы выгляду, што хвалююся, быццам між іншым, папытаўся:

— А такі стан... Ну, гэтыя сны з мінулага... не паўторацца?

Іван Пятровіч зняў акуляры, задумліва пакруціў іх у руках і зноў уссунуў на нос.

— А хто яго ведае? Пры нейкіх новых стрэсавых сітуацыях... Але, калі што якое,— ад разу звяртайся да мяне.

Навукова-папулярнае выданне

ЧАРНЯЎСКІ Міхаіл Міхайлавіч

ВОГНЕПАКЛОННІКІ
Кніга для вучняў

Загадчык рэдакдыі Ю. М. Сувораў. Рэдактар Я. С. Гучок. Мастак П. М. Драчоу. Мастацкі рэдактар Я. І. Яўменава. Тэхнічны рэдактар Л. П. Сопат. Карэктар З. М. Грышэлі.

ИБ № 2480 Здадзена ў набор 13.05.88. Падпісана ў друк 20.06.89. АТ 13390. Фармат 70Х90'/іь. Пап. афсетная № 2. Гарнітура школьная. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 5,85. Умоўн. фарба-адбіт. 24,28. Ул.-выд. арк. 6,61. Тыраж 28 000 экз. Заказ 1668. Цана 45 к.

Выдавецтва «Народная асвета» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11. Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23